Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

10 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 106
(26219)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага! «Прамая лінія»

Медыцынскі сэрвіс на сучасны лад

Як удасканаліць якасць абслугоўвання, наколькі даступныя для ўсіх пацыентаў сучасныя медыцынскія тэхналогіі, ці ўдасца пазбавіцца ад чэргаў у медустановах, калі плануецца завяршыць перааснашчэнне галіны? На гэтыя і іншыя пытанні падчас «прамой лініі» чытачам «Звязды» адкажа **начальнік управлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Ігар Уладзіміравіч БРОЎКА.**

«Прамая лінія» адбудзецца 12 чэрвеня з 11 да 12 гадзін па тэлефонах: (8017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні прымаюцца па тэл. (8017) 287 17 57.

Плануецца павялічыць закупачныя цэны

Закупачныя цэны на мяса буйной рагатай жывёлы плануецца павялічыць на 10 працэнтаў такую пастанову прыняў урад краіны. Яны ўступяць у сілу з часу іх афіцыйнага апублікавання, якое, як мяркуюць у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, адбудзецца на працягу тыдня.

Разлічаны яны найперш для сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія вырабляюць адпаведную прадукцыю. З насельніцтвам, як вядома, дзейнічаюць дагаворныя цэны, якія рэкамендавана ўстанаўліваць на ўзроўні, не ніжэйшым, чым для сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Напрыклад, вышэйшай укормленасці мяса кароў, маладняку вагой да 350 кілаграмаў і вышэй за 550 кілаграмаў пасля павелічэння закупачных цэнаў плануецца набываць па 3002 рублі за кілаграм, маладняку вагой 350—399 кілаграмаў — 3430 рублёў, маладняку вагой 400—550 кілаграмаў — 3714 рублёў, мяса сярэдняй укормленасці — 2341 рубель, агучылі некаторыя лічбы ў міністэрстве.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Зноў Дзітэр Кнаутц з дапамогай

Гэты чалавек, які многае зрабіў для нашай краіны, атрымаў некалькі гадоў таму падзяку ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Дададзім яшчэ, што ён з'яўляецца ганаровым доктарам Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Дзітэр Кнаутц — былы ваенны лётчык з нямецкага горада Мюнхена. Закончыўшы ваенную кар'еру, ён узначаліў у сваім горадзе гуманітарны фонд «Дапамога Гомелю. Медыцынская дапамога для Беларусі» і ўжо 18 гадоў прывозіць медыцынскае абсталяванне, прэпараты і іншыя рэчы для жыхароў тых рэгіёнаў, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы. Вось і на гэты раз канвой даставіў (вядома ж, на бязвыплатнай, як і раней, аснове) адзінаццаць тон лекаў на адзін мільён еўра, якія перададзены дзіцячай паліклініцы Гомеля. Дзітэр аказвае і адрасную дапамогу дзецям, якім патрэбны дарагія хірургічныя аперацыі. Ён паабяцаў дапамагчы і Антону Дабрасельскаму, якому патрэбна зрабіць аперацыю на сэрцы, аб чым паведамлялася ў нашай газеце.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАДАРАЖАЛІ БЕНЗІН І ДЫЗПАЛІВА

Яшчэ на мінулым тыдні сярод аўтааматараў пайшла пагалоска пра тое, што з дня на дзень павінны павысіцца кошт бензіну і дызельнага паліва. Прычым цана апошняга вырасце істотна.

Падобныя меркаванні з'явіліся не на пустым месцы: кошт нафты на сусветных рынках не стаіць на месцы, а таму і ўнутраныя цэны на нафтапрадукты, маўляў, могуць быць «падкарэктаваныя». Да таго ж, паводле чутак, цану плануецца падняць ужо ў бліжэйшыя дні. Колькі гэтыя размовы адпавядаюць рэчаіснасці, мы паспрабавалі высветліць у канцэрне «Белнафтахім». Спецыялісты апошняга, з якімі ўдалося звязацца карэспандэнту «Звязды», на жаль, ні пацвердзіць, ні абвергнуць даную інфармацыю не браліся. А вось у Міністэрстве эканомікі нам пашанцавала больш. У прыватнасці, тут нам паведамілі, што, сапраўды, узгодненне наконт меркаваных цэнаў на бензін і дызпаліва праходзіла. Паводле папярэдняй інфармацыі, у прыватнасці, «Белнафтахімам» прапануецца павысіць цэны на нафтапрадукты ў рэспубліцы. Так, прапануецца кошт бензіну павысіць дзесьці на 5 працэнтаў, а дызельнага паліва — на 15 працэнтаў.

P.S. Учора вечарам стала вядома, што з 10 чэрвеня рознічныя цэны на нафтапрадукты, якія рэалізоўваюцца праз АЗС арганізацыямі «Белнафтахіма», складаюць: бензін А-76 (Нармаль-80) — Br1760 за 1 літр (рост на Br90), бензін АІ-92 — Br2230 (на Br110), бензін АІ-95 — Br2540 (на Br120).

Рознічная цана на дызельнае паліва павялічылася на 14,8 працэнта і склала Br1940 за 1 л (рост на Br250).

Ігар ГРЫШЫН.

УВАХОД ЗАЧЫНЕНЫ. РЭКАНСТРУКЦЫЯ РАСПАЧАЛАСЯ

З панядзелка, як і планавалася, на час рэканструкцыі перасадачнага вузла паміж першай і другой лініямі Мінскага метрапалітэна была зачынена станцыя «Кастрычніцкая». На працу і па іншых справах гараджане мусілі дабірацца ўжо з перасадкамі.

Як паказала міні-апытанне, праведзенае ў рэдакцыі ўчарашняй раніцай, нехта пры гэтым уклаўся ў звыклы час, камусьці спатрэбілася на 10 хвілін больш. Хоць, безумоўна, нейкія высновы рабіць яшчэ ранавата, ды і час самой паездкі (у гадзіну пік ці ў перыяд зацішша) таксама можа ўплываць на працягласць падарожжа.

Аднак ужо зараз можна выказаць пэўныя заўвагі. Так, у метро падчас руху электрацягнікоў па гучнай сувязі абвяшчаецца, што станцыя «Кастрычніцкая» для пераходу зачынена. А кусі пасажырам рухацца? Спрактыкаваныя мінчане гэту праблему ўжо, можна сказаць, вырашылі. А калі гаварыць пра іншагароднягa? Нейкіх схем перасадкі на станцыях метро ці побач мы пакуль таксама не заўважылі.

Прыпынкі для бясплатнага аўтобуснага маршрута № 33, які забяспечвае кампенсацыйны падвоз пасажыраў да станцыі метро «Плошча Перамогі», здаецца, можна было б зрабіць і бліжэй да выхадаў з «Купалаўскай». Дарэчы, была ж прапанова пакінуць для пераходу пасажыраў тунэль паміж «Кастрычніцкай» і «Купалаўскай», а каб людзі рухаліся толькі ў адзін бок, выставіць, скажам, пост з работнікаў міліцыі і самога метрапалітэна. А каб трапіць на «Кастрычніцкую», задзейнічаць выхады ў бок ДК прафсаюзаў і Дома афіцэраў, якія зараз зачынены.

Да графіку руху аўтобуснага маршрута № 33 пакуль ніякіх прэтэнзій няма. А вось аўтобус-«сотка», які і дагэтуль не цярпеў ад адсутнасці пасажыраў, цяпер часам бывае «забіты» цалкам. Што зразумела: калі чалавеку трэба праехаць уздоўж праспекта, прасцей адразу сесці ў аўтобус № 100, прабіўшы толькі адзін талончык. Увогуле, у матэрыяльным сэнсе пацярпелі людзі, якія не набываюць праязныя дакументы. Заклік гарадскіх уладаў рабіць гэта пры нерэгулярнасці паездак для пасажыраў немэтазгодны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Выпускны баль у Мінскім суворaўскім вучылішчы.

Фота БЕЛТА.

ГРАНІЧНЫЯ АДПУСКНЫЯ ЦЭНЫ НА МАЛАКО І ЯЛАВІЧЫНУ Ў БЕЛАРУСІ ПАВЯЛІЧАНЫ НА 2 ПРАЦЭНТЫ, ХЛЕБ — НА 1,5 ПРАЦЭНТА

Гранічныя адпускныя цэны на малако, кефір, смятану, тварог і ялавічыну ў Беларусі з 3 чэрвеня павышаны на 2 працэнты, хлеб і хлебабулачныя вырабы — на 1,5 працэнта, паведамілі ў Міністэрстве эканомікі. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Мінэканомікі № 114.

БЕЛТА.

Студэнт-бюджэтнік бярэ на сябе абавязацельства перад дзяржавай

Паступіўшы на бюджэтнае аддзяленне, студэнт бярэ на сябе абавязацельства перад дзяржавай, адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр Жук.

«Бюджэтныя сродкі, якія дзяржава расходуе на падрыхтоўку маладых спецыялістаў — выпускнікоў ВНУ, ССНУ і ПТВ, — трэба адпрацаваць па размеркаванні», — нагадаў першы намеснік міністра. Калі ж юнак або дзяўчына хочуць знайсці работу самастойна, то яны павінны вучыцца платна. Пры паступленні на бюджэтную форму навучання абітурыент, а таксама яго бацькі павінны добра разумець, што пасля заканчэння ВНУ малады спецыяліст будзе накіраваны на работу менавіта туды, дзе ён неабходны ў першую чаргу.

Як адзначыў Аляксандр Жук, традыцыйна больш як 90 працэнтаў выпускнікоў бюджэтных аддзяленняў навучальных устаноў Беларусі забяспечаны першымі рабочымі месцамі. Пры гэтым каля 10 працэнтаў выпускнікоў штогод на розных прычынах атрымліваюць свабодны дыплом. У іх лік уваходзяць жонкі ваеннаслужачых, цяжарныя жанчыны, маладыя людзі, прызваныя служыць ва Узброеных Сілы Беларусі. Калі па якіх-небудзь прычынах (няма свабоднага месца, няма магчымасці прадаставіць жыллё і г.д.) выпускнік ВНУ застаецца без рабочага месца, названага ў мэтавым накіраванні, то ён можа пераразмеркавацца туды, дзе ёсць вакансія і яго хочуць узяць на работу. Дарэчы, рыхтаваць кадры для сваіх прадпрыемстваў могуць і прыватныя структуры. Для гэтага яны павінны падпісаць адпаведны дагавор з навучальнай установай.

Апошнія некалькі гадоў значна павялічылася колькасць студэнтаў-платнікаў, якія падалі заяўкі на прадастаўленне першага рабочага месца. Па меры магчымасці кіраўнікі навучальных устаноў дапамагаюць працаўладкавацца і ім. Больш за ўсё запатрабаваны цяпер спецыялісты ў галіне інфармацыйных тэхналогій, сельскай гаспадаркі, інжынеры, будаўнікі, праекціроўшчыкі.

Дакладная схема кампенсацыі за непрыбыццё маладога спецыяліста да першага рабочага месца ўведзена ў дзеянне з прыняццем закона «Аб вышэйшай адукацыі».

У Беларусі на 10 тыс. жыхароў прыпадае 425 студэнтаў — гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у Еўропе.

Разрыў паміж даходамі самых багатых і самых бедных скарачаецца

У Беларусі рост рэальных грашовых даходаў суправаджаецца адносна раўнамерным іх размеркаваннем у розных сацыяльна-дэмаграфічных групах насельніцтва і невысокай ступенню дыферэнцыяцыі на карысць высокадаходных груп.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, у апошнія гады суадносіны даходаў 10 працэнтаў найбольш і 10 працэнтаў найменш забяспечаных груп насельніцтва рэспублікі вагаюцца ў межах 5,6—5,9 раза, што сведчыць аб эканамічнай і сацыяльнай стабільнасці ў краіне. Гэта адзін з самых нізкіх паказчыкаў сярод краін СНД.

У Расійскай Федэрацыі суадносіны грашовых даходаў 10 працэнтаў найбольш і 10 працэнтаў найменш забяспечаных груп насельніцтва ў 2007 годзе склалі 16,8 раза (у 2006 годзе — 16 разоў). Гэты паказчык у Малдове перасягнуў 20 разоў, у Латвіі — 12 разоў, у Эстоніі і Літве — 10 разоў, ва Украіне ён склаў амаль 9 разоў. Паводле слоў спецыялістаў, у сусветнай практыцы грашовая крытычным значэннем гэтага паказчыка лічыцца 10—12 разоў.

Паводле статыстычных даных, у Беларусі ў мінулым годзе даходы, ніжэйшыя за бюджэт пражыткавага мінімуму, мелі 732,8 тыс. чалавек, або 7,7 працэнта насельніцтва. Для параўнання: у 2006 годзе ў краіне налічвалася 1055,3 тыс. малазабяспечаных грамадзян (11,1 працэнта). У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу за мінулы год доля насельніцтва з даходамі, ніжэйшымі за БПМ, зменшылася на 3,5 працэнтнага пункта, у сельскіх населеных пунктах — на 3,1 працэнтнага пункта.

ІНТЭРНЭТ-ТРАФІК — НА НОВЫХ ХУТКАСЦЯХ!

«Белтэлекам» і «Растэлекам» завяршылі работы па арганізацыі прамога канала доступу да рэсурсаў расійскага Інтэрнэт-сегмента. Гэта дазволіць павялічыць хуткасць Інтэрнэт-трафіка і палепшыць якасць перадачы даных. Як вядома, беларускіх карыстальнікаў Інтэрнэта, колькасць якіх пастаянна расце, цікавіць, у першую чаргу, менавіта расійскі яго сегмент: па-першае, па прычыне адсутнасці моўнага бар'ера, а, па-другое, па прычыне вялікага аб'ёму карыснай інфармацыі. Раней сувязь з расійскім сегментам Інтэрнэта ажыццяўлялася з дапамогай аператара «Петэрстар» (Санкт-Пецярбург). Шырыня новага канала, арганізаванага з «Растэлекам», складае 2 Гбіт/с, а з аператарам «Петэрстар» — крыху больш як 1,2 Гбіт/с. Такім чынам, у расійскім напрамку канал павялічыўся да 3,2 Гбіт/с. У напрамку астатніх замежных рэсурсаў канал застаўся ранейшы — 1,2 Гбіт/с. Увогуле ж пасля арганізацыі новага канала ў расійскім напрамку знешні Інтэрнэт-шлюз Беларусі пашырыўся да 4,5 Гбіт/с.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У ДТЗ ВА ЎКРАІНЕ ЗАГІНУЛІ БЕЛАРУСЫ

У дарожна-транспартным здарэнні на тэрыторыі Украіны пад Чарнігавам у нядзелю загінулі трое гамяльчан.

Паводле звестак упраўлення ДАІ МУС Беларусі, на 214-м кіламетры дарогі Кіеў—Чарнігаў аўтобус «Сетра», якім кіраваў грамадзянін Літвы, выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з «Фольксвагенам», за рулём якога знаходзіўся гамяльчанін. Акрамя таго, у салоне апошняй машыны было двое пасажыраў — жанчына з сынам — землякі вадзіцеля. Пасля сутыкнення «Фольксваген» апынуўся ў кювеце: на жаль, і вадзіцель, і пасажыры загінулі. Што датычыцца вадзіцеля аўтобуса, то яго таксама выратаваць не ўдалося, а вось пасажыры «Сетры» не пацярпелі.

Ігар ГРЫШЫН.

СПАЧАТКУ — СОНЕЧНА, ПОТЫМ — ДАЖДЖЛІВА

У першай палове тыдня надвор'е ў нашай краіне будзе вызначаць зона павышанага ціску на фоне цёплых паветраных мас, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагназаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

Таму ў першыя тры дні тыдня ападкаў не прадбачыцца ўвогуле. Тэмпература ўначы 10—16, удзень 20—26 цяпла, а ў паўднёвых раёнах — да плюс 30. Пачынаючы з 12 чэрвеня, з боку Паўднёва-Заходняй Еўропы да нас завітае актыўны і кантрасны атмасферны фронт. Павялічыцца воблачнасць, кароткачасовыя дажджы і навальніцы ў чацвер будуць назірацца яшчэ толькі месцамі па краіне. Тэмпература ўначы 10—17, удзень 21—28, у Гомельскай і Магілёўскай абласцях — да плюс 30 градусаў, аднак па паўночным захадзе — ужо толькі 18—20. У пятніцу і суботу сур'ёзныя дажджы чакаюцца паўсюдна па краіне, месцамі пройдуць моцныя ліўні і навальніцы. Пры навальніцах узмацненне ветру да 15—20 м/с. Тэмпература ўначы 10—17, удзень 17—24, толькі ўдзень па ўсходзе краіны да 25—32 градусаў. У нядзелю атмасферны фронт адыдзе, надвор'е палепшыцца. Кароткачасовыя дажджы і навальніцы будуць назірацца толькі месцамі па краіне. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ў межах 8—15 градусаў цяпла, удзень — 19—25.

Сяргей КУРКАЧ.

ДАПАМОГА ЦАНОЙ У $7000?..

53-гадовы непрацуючы мінчанін узяў у абарот прараба аднаго са сталічных таварыстваў з абмежаванай адказнасцю: жанчыну ён падбухторваў да дачы хабару. Апошняя перадала падазронаму сем тысяч долараў ЗША: за гэтыя грошы, маўляў, магчыма было вырашыць пытанне аб непрымяненні ў дачыненні да таварыства санкцый па выніках праверкі гаспадарчай дзейнасці.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

ПАДАЗРАЮЦЦА Ў КРАДЗЯЖЫ 240 МЛН

Чатыры адказныя асобы ААТ «Гродзенскі шклозавод» падазраюцца ў злоўжыванні службовым становішчам, якое прынесла ім неблагія «дывідэнды». Згаданыя асобы ўчынілі крадзеж 240,9 мільёна рублёў.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

ОАО «Управление механизации № 91»

приглашает организации к участию в процедуре переговоров по заключению договора на ремонт кровли.

Для получения технического задания обращаться по телефону (017) 291 85 45.

Переговоры состоятся 16.06.2008 г. УНП 100055130

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 16 ИЮНЯ 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 14 июня), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 16 июня) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней — до 14 июня 2008 года.
Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 87 72.

УНП 100325912.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания склада (об. пл. 463,4 кв.м), расположенного по адресу: Пуховичский район, г.п. Руденск, ул. Железнодорожная, 3. Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 123 900 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка – 0,0723 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.01.2008 г. Аукцион состоится **24 июня 2008 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23 июня 2008 г**. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Телефон (8017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Слуцком райисполкоме,

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства: Лот № 1 — здание склада ГСМ с заправочной (об. пл. 85,1 кв.м), начальная цена – 17 600 000 рублей; Лот № 2 — здание склада запчастей (об. пл. 81,2 кв.м), начальная цена – 12 500 000 рублей; Лот № 3 — эстакада для ремонта автомобилей, начальная цена – 5 200 000 рублей, расположенные по адресу: г. Слуцк, ул. Гагарина, 32. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 24.06.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 23.06.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже обращенных в доход государства:

№ лота	Объект	Общая площадь (кв.м)	Адрес	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток (от нач. цены)
1	**Уречский цех** (отдельно стоящее здание,1992 г.п., стены – кирпич, панели, перекрытия ж/б, кровля совмещенная, рубероидная)	1746,3	Минская область, Любанский район, г.п. Уречье, ул. Коммунальная, 9	693 600 000	5 %
	Цех огнетушителей, склад сои (отдельно стоящее здание, 1975 г.п., стены – кирпич, блочные, перекрытия – деревянное, ж/б, кровля – 1/2 железная, 1/2 совмещенная)	1962,4			
	Котельная (1973 г.п, стены – кирпич, панели, перекрытия ж/б, кровля совмещенная, рулонная)	200,5			
	Проходная (1977 г.п., стены – кирпич, перекрытия ж/б, кровля – односкатная шиферная)	15,2			
2	**Здание гаража-мастерской** (1976 г.п., стены – кирпич, перекрытия ж/б, h – 4.70 м)	1117,8	г. Слуцк, ул. Ленина, 292	264 000 000	10 %

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **15 июля 2008 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **14 июля 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.06.2008 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 130,00
1 еўра	3 365,51
1 латвійскі лат	4 792,44
1 літоўскі літ	973,34
1 чэшская крона	136,70
1 польскі злоты	992,98
1 расійскі рубель	90,56
1 украінская грыўня	449,60

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
USD	23,5210
10 UAH	48,9898
1000 BYR	11,0207
EUR	37,1420

Курс у гандлёвых кампаніях (на 9.06.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Беларусь заклікае ЗША да раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага дыялога

Беларускі бок па-ранейшаму лічыць, што прадаўжэнне або ўзмацненне санкцый — гэта не лепшы спосаб урэгулявання двухбаковых адносінаў, і чарговы раз заклікае ЗША да раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага дыялога. Аб гэтым заявіў прэс-сакратар беларускага Міністэрства замежных спраў Андрэй Папоў, каментуючы па просьбе журналістаў рашэнне прэзідэнта ЗША прадоўжыць на чарговы год візавыя абмежаванні ў адносінах да некаторых службовых асобаў Беларусі.

«Гэта рашэнне не стала нечым новым. Яно з'яўляецца прадаўжэннем дзеючых абмежавальных мераў», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства.

БЕЛТА.

Прызначаны новы прадстаўнік ААН

У мінулую нядзелю ў Мінск прыбыў новы прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі Антоніус Бернардус Брук. Яго кандыдатура была загадзя ўзгоднена з Урадам краіны. Дык хто да нас прыехаў?

Як паведамілі ў прэс-службе беларускага офіса ААН у Мінску, галандзец па паходжанні А. Брук працуе ў сістэме Арганізацыі Аб'яднаных Нацый з 1984 года. Пачынаў памочнікам эксперта ФАО (Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН) у Пакістане. У 1986—1992 гадах займаў розныя пасады ў ЮНОПС — Упраўленні ААН па абслугоўванні праектаў.

Як вынікае з біяграфіі А. Брука, яго дыпламатычныя і арганізацыйныя здольнасці асабліва раскрыліся ў перыяд работы ў Праграме развіцця ААН (ПРААН). Там ён пачынаў з пасады намесніка прадстаўніка ААН/ПРААН у Кітаі. У 2001—2004 гадах А. Брук выдатна праявіў сабе ў Афрыцы. Як першы намеснік прадстаўніка ААН/ПРААН у Эфіопіі, ён адыграў ключавую ролю ва ўсталяванні ўзаемадзеяння паміж урадам, донарамі і прыватным сектарам.

Плённай была таксама работа А. Брука ў Бурундзі. Там з 2004 па 2008 год ён на пасадзе кіраўніка прадстаўніцтва ПРААН актыўна садзейнічаў аднаўленню дзяржавы пасля спынення жорсткага ваеннага канфлікту.

Леанід ТУГАРЫН.

Крымінал

НА РЫНКУ ГАНДЛЯВАЛІ ЗАБАРОНЕНЫМ

Падчас праверкі на тэрыторыі ГД «Ждановічы» быў затрыманы непрацуючы грамадзянін, які рэалізоўваў тут рыбалоўныя сеткі без ліцэнзіі на ажыццяўленне такога роду дзейнасці. Нагадаем, што яна рэгламентуецца пастановай Савета Міністраў Беларусі № 928 «Аб некаторых пытаннях рэалізацыі і выкарыстання рыбалоўных сетак і сеткаматэрыялаў».

Пры аглядзе аўтамабіля, які належаў затрыманаму, было знойдзена больш за 90 адзінак сеткаматэрыялаў. Канфіскаваны 83 сеткі і 11 сеткавых палотнаў агульнай даўжынёй 4,4 км. Па дадзеным факце Цэнтральным РАУС г. Мінска распачаты адміністрацыйны працэс.

Таксама падчас праверкі было выяўлена, што на рынку на радах па продажы рыбалоўных снасцяў вядзецца незаконны гандаль рознымі відамі прыладаў здабычы рыбы з сеткаматэрыялаў (пад'ёмнікі, ракалоўкі, сеткавае палатно). З гэтай нагоды рыхтуецца прадпісанне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Аляксандр СУРЫКАЎ:

«РАСІЯ МОЖА ПРАПАНАВАЦЬ РАЗМЯШЧЭННЕ ПРОЦІРАКЕТНЫХ СІСТЭМ У БЕЛАРУСІ»

Расія не размесціць у Беларусі ядзерную зброю, але можа прапанаваць размяшчэнне сістэмы проціракетнай абароны. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі ў Мінску заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў.

«Ядзерную зброю мы на тэрыторыі Беларусі не размесцім, і гаварыць на гэту тэму няма патрэбы», — сказаў Аляксандр Сурыкаў, адказваючы на пытанне аб магчымых дзеяннях у адказ у выпадку размяшчэння ў Чэхіі і Польшчы элементаў проціракетнай абароны ЗША.

«А аб проціракетных сістэмах гаварыць, напэўна, можна, — дадаў Аляксандр Сурыкаў. — Усё залежыць ад узроўню супрацоўніцтва: калі гэта Саюзная дзяржава — гэта адзін узровень, калі розныя дзяржавы — гэта іншы ўзровень».

ААТ «Газпрам» і ААТ»Белтрансгаз» могуць рэалізоўваць новыя праекты супрацоўніцтва.

У прыватнасці, перспектыўным можа стаць удзел «Газпрама» ў будаўніцтве новага комплексу ў ААТ «Гродна-Азот», супрацоўніцтва ў галіне развіцця падземных газасховішчаў, удзел у праектах у электраэнергетычнай галіне Беларусі.

«Размовы на гэту тэму ідуць, але афіцыйных дакументаў пакуль што няма», — сказаў Аляксандр Сурыкаў. Ён адзначыў, што больш эфектыўнаму правядзенню перагавораў пакуль што перашкаджаюць «некаторыя цяжкасці». Аднак «разуменне ў абодвух бакоў ёсць, і да рэальных вынікаў яны павінны прыйсці», лічыць дыпламат.

«Супрацоўніцтва Беларусі і Расіі набыло новае адценне. Актыўна развіваюцца кааперацыйныя сувязі рэгіёнаў», — сказаў ён, прывёўшы як прыклад з расійскага боку Свярдлоўскую і Ніжагародскую вобласці, Санкт-Пецярбург.

Ну думку пасла, кааперацыйныя сувязі ў многім садзейнічаюць росту двухбаковага тавараабароту. За 4 месяцы гэтага года ён павялічыўся на 64 працэнты да ўзроўню аналагічнага перыяду 2007 года. У мінулым годзе тавараабарот Беларусі і РФ перасягнуў $26 млрд. У той жа час Расіі не хапае беларускіх тавараў і існуе пагроза ўвахо-джання на расійскі рынак магутных замежных транснацыянальных карпарацый, адзначыў Аляксандр Сурыкаў.

Ён таксама звярнуў увагу на тое, што расійскія кампаніі сталі больш актыўна развіваць дзейнасць у Беларусі, асабліва пасля прынятых беларускім бокам мераў па лібералізацыі рынку, у тым ліку адносна прыватызацыі прадпрыемстваў.

Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў могуць правесці сустрэчу гэтым летам.

«Прэзідэнты могуць сустрэцца да канца лета, — сказаў пасол. — Тады якраз больш прадметна сфарміруюцца пытанні ў галіне газу».

Пры гэтым Аляксандр Сурыкаў адзначыў, што ў адносінах Расіі і Беларусі няма вострых пытанняў, «ёсць толькі руцінныя эканамічныя і інтэграцыйныя».

Мінфіны Беларусі і Расіі вывучаюць магчымасць прадастаўлення рэспубліцы расійскага крэдыту ў памеры $2 млрд.

Ён нагадаў, што ў снежні мінулага года Расійй быў прадастаўлены Беларусі крэдыт у аб'ёме $1,5 млрд., і ішла размова аб магчымасці прадастаўлення яшчэ $2 млрд.

«Ёсць адпаведны зварот беларускага ўрада, і два мінфіны цяпер вывучаюць гэта пытанне», — сказаў дыпламат. Ён адзначыў, што ўлічваецца эканамічная сітуацыя ў Беларусі, дэфіцыт бюджэту і іншыя фактары.

Расійскі бок не выказвае нежаданне прадаставіць такі крэдыт, але павінен ацаніць мэтазгоднасць яго выдзялення, падкрэсліў Аляксандр Сурыкаў.

Расійскі «Атамбудэкспарт» разглядае магчымасць удзелу ў тэндары на будаўніцтва АЭС у Беларусі.

Дыпламат адзначыў, што адпаведную прапанову расійская кампанія атрымала ад беларускага боку, як і французская і амерыканаяпонская кампаніі.

«Атамбудэкспарт» плануе вызначыцца з магчымасцю свайго ўдзелу ў тэндары на будаўніцтва беларускай АЭС у бліжэйшы час, дадаў пасол.

«Белтрансгаз» з другога паўгоддзя зніжае адлічэнні ў інавацыйны фонд Мінэнерга.

Пасол адзначыў, што пры стварэнні сумеснага прадпрыемства на базе «Белтрансгазу» былі агавораны ўмовы размеркавання прыбытку, і расійскі бок палічыў неправамерным памер адлічэнняў «Белтрансгазу» ў інавацыйны фонд. У выніку памер адлічэнняў зніжаны з 19 працэнтаў да 8,1 працэнта.

Перагаворы паміж «Газпрамам» і «Белтрансгазам» па гэтым пытанні будуць прадоўжаны, дадаў ён.

МАЗу мэтазгодна аб'яднаць намаганні з групай «РусАл» і КамАЗам.

Пасол адзначыў, што расійскі і беларускі бакі абмяркоўвалі, як аб'яднаць бізнэс Мінскага аўтазавода з групай «РусАл». «Пэўнае ўзаемаразуменне дасягнута, аднак перагаворы яшчэ далёка не завершаны, — сказаў дыпламат.— Неабходна, каб МАЗ, «РусАл» і КамАЗ не былі канкурэнтамі адзін аднаму, а аб'яднаўшы намаганні, паспяхова канкурыравалі з такімі транснацыянальнымі кампаніямі, як «Мерседэс», «Сканія» і іншыя».

Расійскія цукровыя заводы зацікаўлены ў аб'яднанні актываў з беларускімі прадпрыемствамі.

А. Сурыкаў адзначыў, што канкрэтныя перагаворы наконт гэтага пакуль не вядуцца, але пытанне патрабуе абмеркавання.

Аляксандр Сурыкаў нагадаў, што Беларусь узяла на сябе вымушаныя самаабмежаванні па экспарту цукру ў Расію, і ў гэтым годзе яго аб'ём складзе 100 тыс. тон. Вядуцца перагаворы па пастаўках беларускага цукру ў Расію ў 2009 годзе.

«Цукар, які вырабляецца з сыру, на $50 таннейшы за бураковы. Пытанне аб тым, як падзяліць гэтыя $50 паміж расійскімі і беларускімі цукравытворцамі», — сказаў дыпламат.

«Мы выказвалі свой пункт гледжання па гэтым пытанні: трэба разумна аб'яднаць актывы беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў, і тады не будзе абмежаванняў і будзе адзіная цана», — адзначыў ён. Усё роўна рынак цукру ў Расіі дэфіцытны, і новы ўзровень супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх цукравытворцаў мог бы паставіць усё на свае месцы, лічыць Аляксандр Сурыкаў.

Адказваючы на пытанне аб ходзе рэалізацыі пагаднення аб мерах па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве паміж Расіяй і Беларуссю, пасол адзначыў, што «пакуль што ёсць прыкладна 40 рознагалоссяў па пастаўках рэсурсаў з Расіі ў Беларусь і з Беларусі ў РФ». Перагаворы ідуць складана, але гэты працэс можа быць паскораны, калі бакі прызнаюць уплыў росту цэнаў на энергарэсурсы на канкурэнтаздольнасць беларускіх вытворчасцяў у параўнанні з аналагічнымі расійскімі і будуць прыняты адпаведныя меры па падтрымцы іх беларускай дзяржавай або з саюзнага бюджэту.

БЕЛТА.

Ведай нашых!

ЛІТАРАТУРНЫ ТРЫУМФ НІКІ РАКІЦІНАЙ

або Аповед аб тым, як пачыналася і развівалася літаратурная дзейнасць гомельскай настаўніцы і чаму яе дэбютны раман «Ганітва» атрымаў фантастычнае прызнанне

Перш чым сустрэцца з Людмілай Багданавай (Ніка Ракіціна — гэта яе літаратурнае імя), я наведаўся ў гомельскі абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі, дзе яна працуе, і яго дырэктар Андрэй Цімафеенка і намеснік кіраўніка Таццяна Беладзедава расказалі шмат цікавага пра яе. Напрыклад, пра тое, што яна з сям'і педагогаў, што ў 1980 годзе закончыла з медалём сярэднюю школу № 10 з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы, а пасля, калі вучылася ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны, атрымала «чырвоны» дыплом і спецыяльнасць настаўніцы беларускай і рускай мовы і літаратуры, што добра валодае англійскай мовай, а пры звароце да польскай і чэшскай карыстаецца слоўнікам. Што добра малюе і пры жаданні магла б арганізаваць персанальную выставу сваіх твораў, што яе вершы кранаюць за душу, але яна ўсё ж аддае перавагу фантастыцы. Што з'яўляецца кіраўніком літаратурнага аб'яднання, і яе выхаванцы стараюцца быць падобнымі на яе: пішуць казкі, дэтэктыўныя гісторыі і ўжо неаднаразова «засвяціліся» на розных літаратурных конкурсах. Адным словам, Людміла Багданава (Ніка Ракіціна) — гэта сціплы чалавек, цікавы суразмоўца, інтарэсы і схільнасці яе самыя разнастайныя.

Мы гутарым з ёй у яе кватэры аб жыцці-быцці, і я ўдакладняю асобныя моманты, аб якіх даведаўся ад кіраўнікоў палаца.

— Ніка, дзе працавалі вашы бацькі?

— Маці Клара Алегаўна большую частку жыцця — у абласной бібліятэцы імя Леніна, кандыдат гістарычных навук. Бацька Дзмітрый Мікалаевіч і ў школах выкладаў, і ў педагагічным інстытуце імя Чкалава. Мая бабуля таксама настаўніцай у вясковых школах працавала. Таму і я пайшла па іхніх слядах. У дзяцінстве і пасля многа чытала, і асабліва мяне прываблівалі казкі, легенды, паданні, аб якіх расказвалі бацькі, а таксама іншыя фантастычныя творы. Я прачытала ўсю класіку фантастыкі, класічную літаратуру — пачынаючы ад Старажытнай Грэцыі да нашых дзён. Нават на ўроках употайкі ад настаўнікаў чытала і перад выпускнымі іспытамі. І ў бібліятэках кнігі брала, і сама купляла. Шмат грошай на іх затраціла. І не шкадую аб гэтым, наадварот. Кнігі, творчасць — маё жыццё.

У дзяцінстве адправілі мяне ў музычнай школе займацца. Не сцярпела, кінула вучобу — не маё. Не ляжала душа сядзець за піяніна і па нотах іграць. А праз дзесяць гадоў да гітары пацягнула, асвоіла яе.

— Напэўна, у тым жа дзяцінстве былі патаемныя мары пісьменніцай стаць?

— Ды нічога падобнага! Ніколі тады не думала аб гэтым. Пасля заканчэння ўніверсітэта працавала ў сярэдніх школах № 29 і № 11 абласнога цэнтра, затым была вучоба ў аспірантуры Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі, адкуль я фактычна збегла (зразумела, што гэта — не маё, ды і сямейныя абставіны ў справу ўмяшаліся). Уладкавалася працаваць у метадычны кабінет пры гарадскім аддзеле адукацыі, а праз год мяне запрасілі ў абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі, дзе я працую ўжо 15 гадоў.

— На адной і той жа пасадзе?

— Не. Спачатку гэта быў клуб «Што? Дзе? Калі?», затым — ролевы і рыцарскі, апошнія ж пяць гадоў — клуб НЛА.

— НЛА? Я правільна зразумеў?

— Так, НЛА *(смяецца)*. Незвычайнае літаратурнае аб'яднанне. Правільна. Ходзім па школах, шукаем, даём рэкламу. Праз Інтэрнэт хто-ніхто даведваецца аб нашым аб'яднанні, а хтосьці з бацькоў і сам прыводзіць сына ці дачку. Часцей за ўсё гэта самабытныя дзеці, са сваім бачаннем жыцця, сваімі падыходамі да творчасці. Вось Каця Цырульнікава сёлета выйшла пераможцай у абласным конкурсе «Квітней, родны лес», прадставіўшы на ім выдатны верш. Аня Гулак, якая вучылася на перакладчыка ў Клайпедзе ў хрысціянскім каледжы, стварыла такі верш аб Гомелі, які пакладзе на музыку. Яна ж выйграла міжнародны Інтэрнэт-конкурс сучаснай нерэалістычнай прозы. Яе апавяданне «Дражына», напісанае паводле фальклорных матываў аб сіраце з яе цяжкай доляй, забраў для публікацыі ўкраінскамоўны часопіс «Уфо». Сястра Ані Наташа стварае вершы, працуе ў прозе, піша казкі. Мая дачка Жэня захапляецца паэзіяй, піша вершы, пад якія тут жа падбірае мелодыю на гітары і спявае. Між іншым, летась яе верш атрымаў другое месца на літаратурным конкурсе «Рускае таварыства».

— Можа здарыцца так, што яна пойдзе па вашым шляху, у літаратуру?

— Гэтага я не ведаю. Жэня вучыцца ў кулінарным каледжы і выбрала сабе прафесію, якая ёй вельмі падабаецца. Хоча быць кухарам. Да літаратуры ж цягнецца ўсёй душой, і нярэдка ў яе нават бяру кансультацыі па асобных пытаннях. Напрыклад, зараз я пішу фантастычнае апавяданне і ў ім маецца эпізод, калі гераіня трапляе на прыём у палацы і выбірае таксі відэлец, з дапамогай якога трэба спажываць рыбу «інтэлігентна», каб не падумалі, што яна з небагатага асяродку. Дык Жэня падказала, што былі такія відэльцы са спецыяльнымі кружочкамі, якімі зручна было выцягваць костачкі з рыбы і класці іх на край талеркі.

Наогул, усё, што кладзецца ў мяне на паперу, я вывяраю на сваіх дзецях — Жэні і сыну Славіку, які вучыцца ў школе № 19 з мастацкім ухілам, але любіць матэматыку і англійскую мову. Няма сярод іх ні адной, каму б не падабалася тое, што я пішу. Ды і ў мяне самой ніякіх сумненняў няма, што гэта — мая справа.

Фота Мікалая ДЗЕГЦЯРОВА.

Ну а потым... Потым быў конкурс, які абвясціла ў сваёй газеце «Гомельскія ведамасці». Конкурс на лепшую фантастычную аповесць. Я ўзяла ўдзел, і ў выніку мая аповесць «Ганітва» стала адной з пераможных. Яе надрукавалі ў газеце ў 2006 годзе. Потым — «Ганітва» ў часопісе «Дзеці Ра». Потым — «Ганітва» ў часопісе «Маладосць».

Спрэчныя зацемкі

ЗЯМЛЯ НЕ ПАВІННА ПУСТАВАЦЬ?

Здаецца, для беларусаў гэтыя словы даўно сталі сакраментальнымі. Іншым разам чалавек нават не можа растлумачыць, чаму так павінна быць. З зямлі ніякага прыбытку, няўдобіца, а заарана. І на такой пазіцыі стаяць не толькі ў сельгаскааператывах, райвыканкамах, яе прытрымліваюцца і простыя людзі, тыя, хто мае агарод, прысядзібны ўчастак.

З прыходам вясны ў вёску едуць гараджане: адны, каб у выхадныя шчыраваць на сваёй дачы, а іншыя — дапамагаць бацькам.

Зрабіў выснову, што дачнікі вяртаюцца дамоў супакоенымі, а вось тыя, хто наведаў бацькоў, не заўсёды ў настроі.

— Я цэлы дзень стаю за прылаўкам, ног не чую, а маці папракае: «А што вы там у горадзе робіце? Вунь якую с... нагуляла, то не ўвярэдзішся на агародзе. Езджу з вясны да зімы, а вялікае дабро зробяць, калі дадуць пару мяхоў бульбы ды лапатку, — скардзілася ўжо немаладая жанчына па дарозе да электрычкі. А калі нехта прапанаваў кінуць тыя соткі, то тут жа ў адказ: «Дык сорамна, каб зямля пуставала!»

Так думае маладзейшае пакаленне, а пра старых і казаць не трэба. У каго пад вокнамі расце зелле, то там жыве апошні абібок. Хоць па-разумнаму, бачачы, колькі сілаў аддаецца тым соткам пры мінімальнай аддачы, за лепшае было б не чапаць тую зямлю.

А ўсё трымаецца на тым, што свая праца і затрачаны час не ўлічваюцца. Тупаюць пры той бульбе бацькі, дзеці і ўнукі, а калі на ўсіх раскласці здабытак з агарода, то аўчынка вырабу не вартая.

Безумоўна, бульба з капустай ды цыбуляй з голаду памерці не дадуць, але ж стаўка на гэтыя прадукты спрадвеку рабілася ў нас не ад заможнага жыцця, а з галечы. І бульба, сапраўды, у цяжкія перыяды, калі неабходна было выжыць, выручала, і тады ніхто не думаў пра нейкі прыбытак.

Уся надзея звязвалася з зямлёй, а колькі ў яе там балаў, ніхто не ведаў. Нават самую няўдобіцу, камяніцу патрэбна было засеяць. Але гэта ўсё ў мінулым, і сёння за месячную зарплату, нават самую мінімальную, можна купіць сабе на зіму запас агародніны.

Яшчэ ніводзін дачнік не сказаў, што яго ўчастак дае прыбытак. Таму першымі і спахапіліся дачнікі, бо ім за ўсё даводзіцца плаціць. Трэба зямлю заараць — плаці за каня, пабаранаваць, абагнаць, выкапаць бульбу — кожны раз выкладвай грошы. Нават гной мае цану і немалую. Некалі мужык за бутэльку, на калгасным кані, мог заараць агарод, а цяпер сотка — 1 еўра.

Не дзіўна, што самыя прагматычныя махнулі на бульбу рукой. Жыццё марудна, але няўхільна ідзе ў накірунку дзелавых, прагматычных адносінаў. Кожная праца мае цану і за ўсё трэба плаціць, а таму і даводзіцца лічыць грошы.

Вядома, калі сельгаскааператыў пасадзіць чалавеку тую бульбу ў полі і выкапае яе, то тут рэнтабельнасць пад 80 працэнтаў, але ў гэтым выпадку трэба дзякаваць старшыню кааператыва.

У сельскай гаспадарцы ўжо даўно ўсё падлічана. Нехта мае дзве каровы, здае малако і быцам бы, мае грошы. Але каб сям'я магла жыць за кошт кароў, трэба мець іх мінімум дзесяць, пры надоях у пяць тысяч ад каровы. Здаўшы 50 тон малака па 700 рублёў за літр, атрымае сям'я 35 мільёнаў. Нібыта грошы і вялікія, але ж трэба іх падзяліць на ўсіх, хто кароў даглядае. Статак неабходна пасвіць, даіць тры разы на дзень, а галоўнае — нарыхтоўваць кармы. Ды каб былі высокія надоі, пэўную суму давядзецца патраціць на камбікармы, не кажучы, што трэба набыць хоць нейкую прымітыўную тэхніку. Сям'я з чатырох дарослых можа мець зарплату на кожнага па 800 тысяч рублёў. А сёння гэта ўжо заробак не такі і вялікі.

Тое ж самае і з зямлёю. Калі з гектара сабрана збожжа менш за 23 цэнтнеры, то прыбытку чакаць не варта. Тут таксама ўсё проста. Прыбытак ад сабранага ўраджаю павінен перавышаць затраты на паліва, насенне, мінеральныя ўгнаенні, хімікаты, зарплату работнікам...

І мы тут перайшлі да сельгаскааператываў, бо менавіта яны тыя цэнтнеры і збіраюць. Найбольшыя праблемы з зямлёй нізкай бальнасці. На пяску ды балоце важкіх цэнтнераў збожжа чакаць не даводзіцца. На Брэстчыне практычна ў кожным раёне няўдобіцы хапае, найперш у палескай зоне.

Каля знакамітых Мілавід мяжуюцца тры раёны — Баранавіцкі, Івацэвіцкі і Ляхавіцкі. Раёны розныя, а ўраджаі ў гэтым рэгіёне аднолькавыя — невысокія.

І калі ад зямлі адны страты, то, можа, за лепшае было б каб яна пуставала?

— У мінулым годзе ў Мілавідах мелі па 18 цэнтнераў збожжавых з гектара. Але гэта не значыць, што на зямлі такой нізкай бальнасці нічога не будзе расці. Патрэбны дадатковыя фінансавыя затраты, і калі зямлі даць дастаткова ўгнаенняў, то можна сеяць шматгадовыя травы на насенне. Напрыклад, насенне белай канюшыны каштуе 18 млн рублёў за тону, а чырвонай — 10 млн. Можна мець аддачу, але найперш неабходна ў зямлю ўкласці грошы, — растлумачыў сітуацыю галоўны аграном Баранавіцкага раёна А. Борыс.

У такім разе, магчыма, на беднай глебе не трэба рабіць стаўку на збожжа, а за лепшае было б адмовіцца ад яго. Па вобласці набярэцца не адзін дзесятак СВК, у якіх ураджай збожжа ніжэй за 20 цэнтнераў.

І ў той жа час пад тымі ж Мілавідамі знаходзіцца фермерская гаспадарка, якая спецыялізуецца па буяках. Ягады спрадвеку раслі на гэтай зямлі і глеба ідэальна для буякоў падыходзіць. Ад ягад і саджанцаў гаспадарка мае 27 працэнтаў рэнтабельнасці, а мясцовы сельгаскааператыў не можа звесці канцы з канцамі.

Зямлі, прыдатнай для ягаднікаў, у краіне вельмі многа — гэта якраз тая ж няўдобіца. На сёння ў нас пад буякамі ўсяго сорак гектараў, а ў суседняй Польшчы — за паўтары тысячы.

Чарамша ў садзе.

І гэта пры тым, што попыт на гэтую ягаду ва ўсім свеце павышаны. Толькі расійскі рынак здольны «пераварыць» тысячы тон буякоў, а нашы «шчопці», што ідуць на экспарт, можна не браць да ўвагі.

Ёсць тысячы гектараў з кіслай глебай, на якіх, акрамя ягаднікаў, нічога не хоча расці, але штогод тут сеюць пшаніцу, жыта...

Калі я сказаў знаёмаму старшыні сельгаскааператыва наконт буякоў, то ён здзіўлена паглядзеў на мяне.

— За буякі мне даваць справаздачу не трэба, а вось за збожжа і калі зямля пуставаць будзе, то спытаюць. Мая справа пасеяць, убраць і далажыць. А шышкі на сваю галаву шукаць навошта?

Сітуацыя зразумелая. Будзе каманда, то ў кожным СВК з'явіцца плантацыя буякоў ці нейкай там экзатычнай культуры. А зацікавленасць у прыбытку хоць і ёсць, але яна ўсё ж на другім плане. Галоўнае, не паслізнуцца на ініцыятыве?

* * *

Сёлета на маёй дачы зацвілі буякі, і хоць глеба для іх і не зусім падыходзіць, але падкісліў, падсыпаў ігліцы, і кусты растуць. А побач з буякамі — восем каліў журавін. Чакаю, што з іх будзе.

Чарамша хоць і занесеная ў Чырвоную кнігу, але аказалася, што і пад яблынямі добра расце. Некалькі гадоў таму пасеяў сабранае на Палессі насенне і ўжо невялікая купка квітнее.

Іншым разам гляджу на гэтую надзвычай каштоўную і смачную расліну і думаю: «А чаму ніхто не закладзе плантацыю чарамшы — хоць бы адну на Беларусь?»

А справа тут у тым, што для нас бульба ўсё ж бліжэй, чым чарамша. Апошнюю трэба яшчэ знайсці каму збыць, ды і вепрука на чарамшы не выкарміш.

Няхай усё застаецца, як было спрадвеку?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Буякі зацвілі.

АПОШНІ ШКОЛЬНЫ БАЛЬ

У Нясвіжы для самых лепшых выпускнікоў Мінскай вобласці прайшоў другі абласны баль «Выпускнік-2008», у якім узялі ўдзел 324 медаліста, стыпендыяты, пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд. Сёлета школы Міншчыны закончылі больш за 28 тысяч хлопцаў і дзяўчат, сярод якіх 281 адзначаны залатым медалём за плённыя поспехі ў вучобе і 42 — сярэбраным. Павіншавалі лепшых выпускнікоў старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Леанід Крупец, начальнік упраўлення Мінскага аблвыканкама Таіса Данілевіч, а таксама выпускніца Бараўлянскай гімназіі Кацярына Маркевіч, якая ў гэтым годзе стала пераможцай рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗВІНЕЛІ ЦЫМБАЛЫ, СМЯЯЎСЯ ГАРМОНІК

Напісаў гэты загаловак і зразумеў, што не сапраўды так. На XI Міжнародным фестывалі «Звіняць цымбалы і гармонік», які адбыўся ў Паставах, гучалі і радавалі слых удзельнікаў, месцічаў вельмі розныя музычныя інструменты, нават лацінаамерыканская гітара.

Чаму лацінаамерыканская? Ды сапраўды так. На святочныя гасцямі былі шэсць мужчын з Венесуэлы. Самы старэйшы, кіраўнік ансамбля Тэафіла Pernalete. Спецыяльна папрасіў перакладчыцу, каб запісала правільна лацінкай яго прозвішча. А яшчэ ў гэтым ансамблі былі Цэзар, Пабла, Марцін, Рафаэл. І самы маладзенькі дванаццацігадовы Есус. Чатыры перасадкі былі ў музыкаў у іх падарожжы на Беларусь. Апошняя — у нямецкім Франкфурце. Як сказаў мне Тэафіл — Беларусь зялёная, як і іх Венесуэла. Праўда, там сельва, а ў нас найбольш хвоя ды бяроза. Сябраваць будзем і надалей. І тысячы кіламетраў гэтаму сяброўству не перашкода.

А вось з харватам Стэпанам Вячкавічам я размаўляў без перакладчыка. Паразумеліся, падзякаваў роднаму Беларускаму ўніверсітэту, дзе ў час майго навучання выкладалася і сербска-харвацкая мова. Стэпан быў падобраму ўражаны той гасціннасцю, з якой сустракалі іх калектыў — дружбістасцю, сустракалі на Пастаўшчыне калектывы з усіх абласцей Беларусі, з Літвы, Эстоніі, Латвіі, Расіі, Украіны.

Ансамбль бандурыстаў «Мальві». У час заключнага гала-канцэрта іх доўга не адпускалі са сцэны. Калі размаўляў з кіраўніком калектыву Нінай Галючык, пачуў тыя ж словы падзякі за гасціннасць беларускай зямлі. Кіяўлянка падзівілася нават: такі невялікі гарадок, а колькі прыгажосці, якая добраўпарадкаванасць.

Сапраўды, у адзінаццаты раз Паставы прымаюць міжнародны фестываль народнай музыкі. А да гэтага было дзевятнаццаць гадоў спачатку святаў працы і вясны. І з кожным годам горад прыгажэў. Сёння Паставы, невялікі і па плошчы, і па колькасці насельніцтва гарадок, можа прыняць тысячы гасцей. Ёсць дзе іх размясціць, чым накарміць. Нават прапанаваць такія экзатычныя паслугі, як воднае падарожжа альбо палёт на верталёце над горадам. А да таго ж і лазернае шоў, піратэхнічны спектакль. Парадавалі гасцей выстава-кірмаш народных майстроў Віцебшчыны, сваімі наедкамі — аб'яднанне нацыянальнай кухні. Увогуле трэба адзначыць, што свята прыемнае было і яго беларускай прасякнутасцю. Мы прымалі гасцей з блізкага і нават далёкага замежжа. Але мы ганарыліся сваім мастацтвам, сваімі песнямі, музыкай. І старшыня Пастаўскага райвыканкама Э.П. Казура звярнуўся ў час урачыстага адкрыцця свята да гасцей, да ўсіх прысутных на добрай беларускай мове.

Размаўляю з удзельнікамі ансамбля народнай музыкі і песні

Міхаіл КАЗІНЕЦ.

«Палешукі» з Іванава. Калектыў заслужаны, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне». Стаў ён лаўрэатам і Пастаўскага фестывалю. Але мне цікавая найперш іх гаворка. Яна не крывічанская. Але ж гэта наша — ад тых дрыгавічоў, якія засялялі Палессе ў даўнія часы.

Паставы — шматканфесійнае паселішча. Да свята былі прымеркаваны ў суботу ўрачыстая служба ў царкве, у нядзелю — у касцёле. Зразумела, што многія з гасцей свята і пастаўчан прыйшлі на гэтыя службы проста з цікавасці. Але слова Божае прамаўлялася і да іх. Вобразна кажучы, тры дні Паставы былі сталіцай народнай музыкі. Яна гучала на гарадскіх пляцоўках, у шаснаццаці клубах і Дамах культуры раёна.

Да свята быў і юбілей. Міхасю Казінцу — народнаму артысту Беларусі, прафесару, нязменнаму старшыні журы фестывалю споўнілася 70 гадоў. Гэтаму быў прысвечаны канцэрт на плошчы ў райцэнтры. У ім узялі ўдзел аркестр імя Жыновіча, спевакі з Мінска.

Яшчэ адна канцэртна-тэатралізаваная дзея была прысвечана 275-годдзю з дня нараджэння А.Тызенгаўза, дзеяча, якому горад абавязаны сваім росквітам яшчэ ў XVIII стагоддзі.

Герб Пастаў немудрагелісты. На блакітным фоне рыбацкая сетка і тры залатыя рыбкі. Гэтыя рыбкі ў разнастайным адлюстраванні прысутнічалі на свяце. Запросяць яны гасцей і на наступны год, калі пастаўчане будуць адзначаць 600-годдзе свайго горада.

А як ставяцца да свята самі пастаўчане?

Аляксандр ЮРЧАНКА: Я вайсковец, служу ў расійскай арміі. Далёка ад Беларусі. Але стараюся прымеркаваць свой адпачынак на пачатак лета, прыязджаю на радзіму. І абавязкова — на свята. Тут сустрэнеш сяброў, паслухаеш народную музыку. Асабліва мне падабаецца ансамбль «Паазер'е». Ведаю асабіста некаторых выканаўцаў. Цудоўны ансамбль. Нездарма ён носіць імя заслужанага калектыву Беларусі.

Іван РАГІНЯ: Колькі, вы гаворыце, фестывалю? Адзінаццаць. Дык вось маёй дачцэ дванаццаць. І ўсе гады спачатку насіў на руках, а потым вадзіў за ручку — але абавязкова на фестываль. Паглядзіце — які прыгожы наш парк. А дачушка? Вунь, на каруселі.

І дазвольце расказаць пра самае сваё вялікае і нават шчымлівае ўражанне ад свята. Нядзеля. Ідзе заключны гала-канцэрт у гарадскім парку. І дзве дзяўчынкі гадоў па пяць не вытрывалі, саскочылі з каленяў бацькоў, сталі танцаваць на траўцы між лавачак. Танцуйце! У вас усё наперадзе.

Алесь КАСЦЕНЬ.

г. Паставы.

Фота БЕЛТА.

Фальклорны калектыў — з Венесуэлы.

«Берагіня»

Свята фальклорнага мастацтва ў Акцябрскім

У рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» пройдзе ў г.п. Акцябрскі з 19 па 22 чэрвеня. Заснавальнікі фестывалю — міністэрствы культуры, адукацыі, Гомельскі аблвыканкам, Акцябрскі райвыканкам і грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», пад эгідай ЮНЕСКА.

Сюды з'едуцца каля сямісот аматараў фальклору з усіх абласцей Беларусі, а таксама госці з Польшчы, Прыбалтыкі, Малдовы, Украіны і Расіі...

Асноўныя ўдзельнікі свята — дзіцячыя і маладзёжныя фальклорныя калектывы. Да ўвагі гледачоў — конкурсы выканаўцаў побытавых танцаў, калектыўнай танцавальнай творчасці, музычнага мастацтва, народнай прозы, дэкаратыўна-побытавае мастацтва з прэзентацыяй рэгіянальных выстаў. Сваю творчасць прадэманструюць пераможцы мінулых фестывальных імпрэзаў, госці фестывалю, адбудуцца святы «Купалле на Рудабельцы» і народнага мастацтва Падняпроўска-Паўночнапалескага памежжа...

Іта ГРЫНКЕВІЧ.

Ну і ну!

У КРАМЕ НЯМА... СОЛІ!

Нават не верыцца, але факт — соль у краме ў беларускай правінцыі, аказваецца, дэфіцыт, як і сала, малако... І не толькі гэтыя прадукты. А многія з тых, што ў продажы — есці і піць нельга, бо тэрмін ужывання іх прайшоў. Жах, але апошняе пасрэдна датычыцца і дзіцячага харчавання. Самае незразумелае наступнае: гандляры проста зацікаўлены прадаваць нявыкасныя прадукты. Чаму? Калі гэтага не зробіш, іх кошт давядзецца кампенсаваць з уласнай кішэні. А каму хочацца?

Пра ўсё гэта я пачуў на пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці, дзе разглядаліся вынікі праверкі гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў сістэме Віцебскага абласнога спажывецкага саюза. Адзін з кіраўнікоў гэтай арганізацыі спрабаваў апраўдацца. Маўляў, вялікія грошы ўклалі ў развіццё рэгіянальнай сістэмы, выходзім у лідары па чыстым прыбытку, купляем новыя сучасныя аўтакрамы і г.д.

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Віктар НІКАЛАЙКІН пракаментаваў вельмі мажорную справаздачу: «Якая розніца маці, што купіла пратэрмінаваны дзіцячы прадукт, што ваша арганізацыя мае нейкія дасягненні, калі яе дзіця атруціцца?»

— Няма сумлення. Гэта злачынства гандляваць такімі прадуктамі! — падчас пасяджэння канстатаваў ***старшыня Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці Ігар ПРАКАПЕНКА***.

А як яшчэ выказацца, калі ў кожным чацвёртым праверaным магазіне ў продажы знаходзіліся прадукты дзіцячага харчавання, што ўжываць ужо нельга.

У Гарадоцкім раёне ў краме ў вёсцы Даўгаполле (20 кіламетраў ад райцэнтра, насельніцтва — каля 300 чалавек) 17 тавараў абавязковых да продажу наогул адсутнічалі (у тым ліку і сшыткі для вучняў, сала), а 24 найменні тавараў прыйшлі ў непрыдатнасць. Цукар і яблыкі захоўваліся побач з будаўнічымі матэрыяламі.

Самае дзіўнае, што такое «непрыемнае» суседства — «норма» для падсобных памяшканняў крамаў і ў іншых раёнах.

Супрацоўнікі кантрольна-рэвізійнай службы сістэмы спажывецкай кааперацыі, безумоўна, правяралі крамы, але і пасля іх візітаў старыя прадукты рэалізоўваліся. Няўжо ў пагоні за выкананнем планаў усе метады добрыя? А як жа пагроза здароўю пакупнікоў?

У Лепельскім раёне ў крамах прадавалася малочная прадукцыя толькі адной гандлёвай маркі «Савушкін прадукт», бо тэрмін яе магчымай рэалізацыі параўнальна вялікі. А ёсць жа ў раёне ўласны вытворца, ды і віцебскае прадпрыемства, пастаўскае. Калі параўноўваць цэны, апошнія — таннейшыя.

Вось у «Звяздзе» пачалася дыскусія па тэме аграгарадкоў. Пра што дыскутаваць, калі кантралёры знайшлі нямала фактаў парушэнняў у гандлі ў гэтых населеных пунктах? У прыватнасці, крама ў аграгарадку Вяркуды Ўшацкага раёна. Тут тавары захоўваліся з парушэннямі правілаў. Але самае жудаснае — дах як у падсобным памяшканні, так і гандлёвай зале, працякае. І для збору вады выстаўлены розныя ёмістасці. І гэта ў краме, што ў цэнтры аграгарадка, дзе ўсё павінна быць узорным.

Не можа не здзіўляць тое, што, калі ў якасці пакупнікоў супрацоўнікі райпо і райвыканкама наведвалі «Універсам» Талачынскай арганізацыі, яны не звярнулі ўвагі на тое, што тут прадаюцца дрэнныя прадукты: каўбаса, кандытарскія вырабы і іншыя. Няўжо купілі самі?

Як вядома, на пасяджэннях у дзяржкантролі не любяць цырыманіцца з вінаватымі. Два месяцы дадзена на тое, каб навесці парадак у крамах. Як гэта будзе зроблена — безумоўна, праверяць кантралёры. Праверым і мы — звычайныя пакупнікі, якія шмат чуюць пра тое, што ўмовы жыцця ў вёсцы трэба наблізіць да гарадскога ўзроўню...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Падпіска-2008

«Шмат пачуць давялося моў...»

«Звязду» я чытаю з 1980 года і пастаянна. Таму, па-першае, што яна ніколі не здраджвала роднаму слову. А яшчэ — тут заўсёды была аператыўная інфармацыя і адметныя журналісцкія пёры. У свежым нумары заўсёды шукаю матэрыялы за подпісамі віцебскага ўласнага карэспандэнта Аляксандра Пукшанскага, Святланы Яскевіч, Валянціны Доўнар (асабліва з «...Народам на провадзе»), Уладзіміра Перніка-ва, Інгі Міндалёвай. Люблю нашу «Хатнюю энцыклапедыю», «Краіну здароўя», «Простыя рэчы». Хацелася б часцей бачыць у газеце апавяданні на конкурс, якія таленавіта адбірае пісьменнік Віктар Казько...

Вельмі любіла «Звязду» і паэтка Яўгенія Мальчэўская, якой, на вялікі жаль, нядаўна не стала. Але ж засталося вельмі шмат прыгожых вершаў, засталіся прачулыя радкі:

Шмат пачуць давялося моў,
Шмат шукала для сэрца слоў.
Толькі лепшых не чула нідзе,
Чым матуліны «Добры дзень».

Дык добрых дзён табе, дарагая «Звязда»! Свяці ўсім! Свяці ў гэтым стагоддзі, як свяціла ў тым!

К.С. КАРНЯЛЮК,
г. Віцебск.

Камандзіроўка па пісьму

ПРАФЕСІЯ — ДОКТАР

З вёскі Дзяніскавічы Ганцавіцкага раёна ў «Звязду» прыйшоў ліст, які падпісала больш за дзесяць чалавек. Людзі дзякавалі свайму доктару — загадчыцы бальніцы сястрынскага догляду Але Шайтар і прасілі напісаць пра яе. Але я памятаю, як давялося ехаць у тыя ж Дзяніскавічы па дасланым у газету лісце. Тады жыхары вёскі скардзіліся, што ў іх закрываюць участковую бальніцу. Бальніцу закрылі і, відаць, сітуацыя там някепская, калі дзякуюць доктару.

Ала Мікалаеўна сустракала перад бальніцай і думала, што нехта напісаў у газету скаргу, а тут дзякуюць — прыемны сюрпрыз. Што змянілася ў бальніцы за гэтыя некалькі гадоў пасля змены яе статусу? А практычна нічога істотнага не адбылося. Амбулаторыя засталася, лабараторыя, фізіякабінет, ёсць дзённы стацыянар на 10 ложкаў, а ў бальніцы знаходзяцца кругласутачна 25 хворых з усяго раёна. Яны могуць лячыцца тут да шасці месяцаў, але бывае, што ляжаць і болей. А новаўвядзенне ў тым, што тыя, хто знаходзіцца на стацыянары, аддаюць 75 працэнтаў сваёй пенсіі ў бюджэт райбальніцы.

Сказаць, што ў бальніцы ўсё ідэальна, нельга, хоць бы з той прычыны, што тут цеснавата, ды і сам будынак стары, але гэта другараднае, бо старым людзям найперш патрэбна ўвага і догляд. Сярэдні ўзрост хворых за 70 гадоў, а Анастасіі Казак ужо за дзевяноста. Пенсіянеры і інваліды — асноўны кантынгент бальніцы. І ім найперш патрэбна не лячэнне, а догляд. Ёсць і тыя, хто не падымаецца з ложкаў.

— Сумна, што ў нас ляжаць не толькі адзінокія, а ў асноўным тыя, хто мае дзяцей, радню. Некаторых наведваюць, бывае, дзеці заглядаюць і да мяне ў кабінет. На першы погляд, не скажаш, што яны бедныя. Нешта гаворыць, старацца апраўдацца. Кватэра малая, альбо нявестка не хоча глядзець... Апраўданне заўсёды ёсць. Але гэтыя хоць прыязджаюць, а іншыя ўвогуле не зазіраюць, хоць жывуць побач, напрыклад, у Ганцавічах, ды і Мінск недалёка, — раскрыла сітуацыю загадчыца.

Праўда, ёсць і тыя, хто не хоча дадому. Напачатку імкнуцца да радні, а затым адвыкаюць ці мірацца са сваім лёсам. Другія ж рынцыпова не хочуць вяртацца, бо ў бальніцы спакойна, а ў сям'і папрокі ды скандалы. У адной жанчыны чацвёра дзяцей, яна не кінутая, але састарэлая, каб не перашкаджаць дзецям, свядома застаецца ў бальніцы.

У гэтым плане сітуацыя ў Дзяніскавіцкай бальніцы сястрынскага догляду нічым не адрозніваецца ад іншых бальніц. А вось медперсанал, напэўна ж, не аднолькавы. І тут ужо адыгрываюць сваю ролю прафесійная падрыхтоўка, характар, маральныя якасці чалавека. Людзі адразу ж прыкмячаюць усе адценні характару свайго доктара (участковага, сельскага, лечачага). І калі жыхары вёскі пішуць: «Яна любіць нас і мы любім яе. У любое надвор'е і любы час яна спяшаецца нам на дапамогу... мы паважаем медыкаў, людзей у белых халатах, але такіх, як наша Ала Мікалаеўна, няма», то, напэўна, так яно і ёсць, бо каму ведаць, як не тым, хто жыве побач з доктарам, сустракаецца з ёй штодня?

— Я проста раблю сваю справу. Вядома ж, у сельскага ўрача днём і ноччу няма спакою. Але ўцягнулася за 26 гадоў і нешта мяняць, нават калі б і хацелася, ужо позна. Кожны чалавек выбірае, якой дарогай яму ісці. Калі ты вырашыў стаць доктарам, то абавязаны ведаць, наколькі гэта цяжкая і адказная прафесія, — выказала сваю пазіцыю Ала Шайтар.

У бальніцы яна загадчыца і ўрач у адной асобе. Ёсць яшчэ чатыры медсястры і неўзабаве колькасць санітарак узрасце да 10 чалавек, а ўсяго ў штаце бальніцы 19 супрацоўнікаў. Фактычна ўсе праблемы, звязаныя з рознымі хваробамі, ляжаць на ўрачу. І тут не толькі суставы, сэрца, але і пераломы, ды і роды даводзілася прымаць. Адна жанчына пачала раджаць дома, затым яе павезлі на самазвале, але не «ўтрымалася» — нарадзіла на ганку. Дзяўчынку, у гонар доктара, назвалі Алай. Быццам бы і дробязь, а прыемна.

У Дзяніскавічах непадалёк ад бальніцы знаходзіцца і дом Шайтараў. У свой час яго пабудавалі, і гэта канчаткова прывязала сям'ю да вёскі. Хоць праблема ёсць. Муж Алы Мікалаеўны працуе галоўным урачом станцыі пераліванія крыві ў Ганцавічах і кожны дзень ездзіць на працу ў райцэнтр. Трыццаць кіламетраў туды і назад — мнагавата, але і выйсця няма. Прадаць дом і перабрацца ў Ганцавічы можна было б, і там работа знайшлася б, але сёння ў вёсцы прадаць жыллё за прыстойную цану немагчыма.

— Вядома ж, радасці мала штодня ехаць за столькі кіламетраў, але тут выбіраць не даводзіцца — так склалася, — разважае загадчыца. — Адпачнём некалі...

У сям'і Шайтараў усе медыкі. Старэйшы сын Аляксандр працуе хірургам. А малодшы Дзмітрый вучыцца ў медыцынскім універсітэце. Гэта сямейная дынастыя ці жаданне ўладкавацца ў жыцці?

— Мы дзяцей не прымушалі, а наадварот, нават адгаворвалі, — растлумачыла Ала Мікалаеўна, — бо прафесія доктара не такая і лёгкая, як здаецца. Урач, які адданы рабоце, не мае спакою. Але сыны самі вырашылі і я скажу, што яны будуць сапраўднымі ўрачамі, задаткі ёсць. Ва ўсякім разе, я так думаю.

Дзяніскавіцкая бальніца сястрынскага догляду жыве сваім жыццём — цікім і аднастайным. Тут дні праходзяць непрыкметна, але вось персанал бальніцы неўзабаве пойдзе ў водпуск і необходна будзе хворых уладкаваць на гэты месяц. Ляжачых адправіць у іншыя бальніцы, а астатніх павінны ўзяць сваякі... І тут зноў клопат, бо ў кожнага свой характар, прэтэнзіі... А нейкую там канфліктную сітуацыю можа «разруліць» толькі адзін чалавек — доктар, якога ў вёсцы ведаюць і паважаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Прамая лінія

ЧАС ПАМАЎЧАЦЬ

Фаніятрычная служба ў нашай краіне досыць маладая. Так што цалкам верагодна, што нехта і не чуў пра яе, і, тым больш, не звяртаўся да такога спецыяліста, як фаніятр. Гэта «прамая лінія» мае на мэце насцярожыць у першую чаргу тых, каму даводзіцца перажываць перагрузкі галасавога апарата. Напрыклад, пры прычыне прафесійных абавязкаў. Сярэднестатыстычны пацыент фаніятра — гэта жанчына ва ўзросце 30—40 гадоў, эмацыянальная і вельмі адказная. Няцяжка пазнаць у гэтым апісанні настаўніц і выкладчыц, асабліва тых, што выкладаюць мову — рускую, беларускую, замежную. А ўвогуле ў групе рызыкі па захворваннях гартані могуць аказацца і мужчыны, і нават дзеці — усе, хто прафесійна спявае, выступае на сцэне, адным словам, шмат «выкарыстоўвае» моўны апарат. Аб тым, як правільна «распарадзіцца» сваімі галасавымі звязкамі, патлумачыла ўрач-фаніятр Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення Вольга РАДЗІВОНАВА.

Фота Марыі Жылінскай.

☎— Добры дзень! Мінск турбуе, завуць мяне Нэлі Уладзіміраўна. Вось ужо амаль 30 гадоў працую ў дзіцячым садку. Вядома ж, шмат размаўляю, і раніцай часам прападае голас, да абеду ён паступова вяртаецца, але можа быць сіплым... Што вы параіце рабіць?

— Вы адносіцеся да катэгорыі прафесіяналаду голасу, вам неабходная фаніятрычная дапамога. Трэба ўстанавіць дакладную прычыну парушэння вашага голасу — з улікам узросту, стажу работы, захворванняў, якія маюць быць... Можаце паказацца фаніятру па месцы жыхарства або непасрэдна ў нашым цэнтры. Парадак звароту вам патлумачыць ЛОР-урач. Пасля агляду спецыяліста вы атрымаеце адпаведнае лячэнне.

— Гэты стан можа быць звязаны з працяглым прастудным захворваннем?

— Прастуднае захворванне можа падштурхнуць да пачатку развіцця праблемы, якая выспявала шмат гадоў.

☎— Глузскі раён. Святлана Аляксандраўна. У мяне пастаянна баліць горла, прызнаюць хранічны фарынгіт і ларынгіт. Прымала шмат лекаў, але лепей не становіцца...

— Хранічныя фарынгіт і ларынгіт бываюць як першаснымі, так і другаснымі, інакш кажучы, вынікам захворванняў іншых органаў і сістэм. Неабходна звярнуцца да ЛОР-урача па месцы жыхарства, ён дапаможа вызначыць прычыну захворвання, неабходны аб'ём даабследавання і прызначыць лячэнне. Часта прычынай хранічнага фарынгіту і ларынгіту з'яўляецца хвароба стрававода — эзафагіт... Гэта можа выявіць і дапамагчы вылечыць гастраэнтэролаг. Бывае, што вышэйпамянёныя праблемы працякаюць на фоне эндакрынных парушэнняў або на фоне хранічнага стрэсу, калі паніжаецца імунітэт, назіраецца нізкая ўстойлівасць да уздзеяння шкодных фактараў. Акрамя таго, з цягам часу могуць акісляцца металічныя зубныя пратэзы ў ротавай поласці, што здольна справакаваць хранічнае запаленне слізістай рота і глоткі.

— Яшчэ раздражняюць пахі — адэкалон, дэзадарант... Калі я іх удыхаю, то пачынаецца раздражненне горла. Адразу хрыпну.

— Трэба пазбягаць такіх фактараў, не правакаваць праблему. Магу параіць паласканні для слізістай цёплай мінеральнай вадой без газаў, лёгкім настоем рамонку, марской соллю або растворам соды з соллю. Тры-чатыры разы на дзень пасля яды. Можна змазваць горла маслянымі растворамі вітамінаў А, Е або закапаць нос ці змазаць горла некалькімі кроплямі ментолавага масла. Некаторым дапамагае рассмоктванне алею... Хранічны фарынгаларынгіт азначае, што слізістая сохне, яна не абароненая. Таму павышаецца яе адчувальнасць і ўзнікае запаленне.

— А яшчэ на мяне вельмі дрэнна ўздзейнічае папяровы пыл.

— Значыць, трэба пракансультавацца і з алерголагам. Магчыма, з цягам часу ў вас з'явілася алергія на пыл. Тым больш, трэба змазваць, паласкаць слізістую глоткі.

— На кожны раздражняльны фактар з'яўляецца раздражнення на твары — ён гарыць.

— Думаю, што ў вас ёсць вегетасасудзістая дыстанія. Усе фактары, якія мы з вамі пералічылі вышэй, толькі ўзмацняюць адзін аднаго.

— А на выркі можа даваць ускладненне?

— Фарынгіт сам па сабе — рэдка. У вашым выпадку неабходна выключыць хранічны танзіліт — захворванне, якое значна часцей можа даваць ускладненні на ўнутраныя органы. Пакажыцеся ЛОР-уражу, каб той даследаваў верхнія дыхальныя шляхі, насаглотку, каляносавыя пазухі. Карыёзныя зубы таксама з'яўляюцца крыніцай хранічнай інфекцыі.

— А ў Мінску можна абследавацца?

— Можна ў нашым цэнтры, тэлефон рэгістратуры: 200 84 50 або 200 85 24. Званіце з 8.00 да 11.00 або з 16.00 да 18.00. Але вам варта ведаць, што для кансультацыі ў нашым цэнтры неабходна мець накіраванне ад ЛОР-урача, часам ад іншага спецыяліста. Пры адсутнасці накіравання вы можаце атрымаць кансультацыю на платнай аснове.

☎— Мінск, Аляксандра. Мая дачка займаецца спевамі, і мне цікава, ці будуць назіравацца істотныя змены ў яе голасе, калі яна ўвойдзе ў пераходны перыяд?

— Дзесьці да 10—11 гадоў істотных адрозненняў у голасе хлопчыкаў і дзяўчынак не назіраецца. Па тэлефоне нават цяжка бывае адрозніць дзявочы голас ад хлапчуковага. З узростам жа дзяўчынку можна адрозніць ад дзяўчыны. Таму што гартань вырастае ў памеры. Вядома ж, не так рэзка і заўважна як у хлопчыкаў. Але часта дзяўчынкі, якія займаюцца спевамі, звяртаюцца да фаніятраў па дапамогу, таму што падчас палавога выспявання, да таго часу, як установіцца менструальны цыкл, маюцца пэўныя цяжкасці ў вакальным голасе. Звужаецца дыяпазон, з'яўляюцца нежаданне спяваць, пачуццё макроты на звязках. Іншымі словамі, у дзяўчынак таксама адбываецца фізіялагічная змена голасу. Проста ў іх гэта не так яскрава выражана, як у хлопчыкаў.

☎— Мінскі раён. Непакоіць Вера Мікалаеўна. Чула ў нейкай тэлеперадачы, што храп — гэта не проста шумавая праблема. Ён яшчэ шкодзіць здароўю. Вы маглі б расказаць падрабязней аб гэтым?

— Па-першае, гэты шумавы феномен чуюць навакольныя, што стварае дыскамфорт. З другога боку, для таго, хто храпе, храп таксама не такі бяскрыўдны. На цяжкіх стадыях гэтага сіндрому могуць назіравацца спантанныя парушэнні, спыненне дыхання ў сне. У некаторых выпадках гэта можа назіравацца даволі часта на працягу ночы. Зразумела, чалавек не высыпаецца, з'яўляюцца псіхічныя, псіхалагічныя праблемы, развіваюцца захворванні, звязаныя з хранічным стрэсам, адсутнасцю належнага адпачынку — напрыклад, сардэчна-сасудзістыя, тая ж гіпертанія, эндакрынныя парушэнні. Акрамя таго, само па сабе спыненне дыхання з'яўляецца небяспечным — важна, каб хто-небудзь у гэты момант быў побач... Некаторыя спрабуюць падшыць да піжамы кішэню для мячыка, каб храпун не спаў на спіне, а толькі на баку. Хтосьці спрабуе паласкаць горла рознымі растворамі. Можна закапаць у нос і глотку ментолавае масла. Гэта крыху прыводзіць у тонус сасуды, мышцы, слізістую.

— А ёсць якія-небудзь лекавыя сродкі для яго лячэння?

— Ангіна можа нашкодзіць голасу, а можа і не нашкодзіць... Важна назірацца далей. Тое, што аднойчы голас прапаў, можа тлумачыцца запаленнем у верхніх дыхальных шляхах, у гартані ў тым ліку. Калі гэта прайшло і не паўтараецца, то можна не хвалявацца Для ангіны, дарэчы, не характэрна знікненне голасу. Пажадана кансультавацца ў не востры перыяд.

— Ад чаго прападае голас?

— Часцей за ўсё, на фоне вялікай галасавой нагрузкі. Па прычыне стомленасці галасавых складак можа назірацца як функцыянальнае, так і арганічнае парушэнне галасавой функцыі. Гэта можа быць вострая галасавая траўма, ацёк, стамленне мышцаў, калі яны аддаляюцца далей працаваць у неабходным рэжыме, голас становіцца больш слабым, нетрывалым, сіплым... Розныя прычыны патрабуюць розных метадаў карэкцыі.

— Голас жа мяняецца на працягу жыцця?

— Так. Гартань — гармоназалежны орган. Таму тут вылучаюць чатыры перыяды — дзіцячы, юнацкі, перыяд сталасці і інвалюцыі. Лічыцца, што пасля 40 гадоў змяняецца гарманальны фон, эластычнасць мышачнай тканкі, пранікальнасць сасудаў, стан нервовай сістэмы, а ўсё гэта разам вельмі ўплывае на якасць голасу. Голас мяняецца і ў жанчын, якім па тых ці іншых прычынах даводзіцца прымаць гарманальныя прэпараты, а таксама можа залежаць ад цыкла — у «крытычныя» дні нават не рэкамендуецца спяваць, шмат размаўляць.

☎— Віцебская вобласць, Рэгіна Міхайлаўна. Скажыце, наколькі добра, з вашага пункту гледжання, выдаляць міндаліны?

— Міндаліны, як вядома, выдаляюцца, калі яны хварэюць — па паказаннях. Пры хранічным дэтэрмінаваным танзіліце. Іншымі словамі, калі міндаліны не выконваюць сваёй функцыі, з'яўляюцца крыніцай інфекцый і хранічных захворванняў іншых органаў, і кансерватыўнае лячэнне не эфектыўнае. Але з іх вараобай і выдаленнем арганізм пазбаўляецца і своеасаблівага ачышчальнага фільтра ў вобласці глоткі. І тады верагоднасць узнікнення хранічных фарынгітаў, ларынгатрахеітаў павялічваецца. Акрамя таго, калі такая праблема ёсць у спевака, вакаліста, то такую працэдуру рэкамендуецца выконваць як мага раней, яшчэ ў працэсе навучання, таму што часам пасля працэдуры мяняецца тэмбр, адчуванні пры спевах.

☎— Званю з Оршы, завуць Аляксандр. Цвярозы я не храпу. Але варта толькі крыху выпіць... Што ў гэты час адбываецца з гартанню?

— Наяўнасць храпу залежыць ад глыбіні пагружэння ў сон, ад таго, наколькі расслабленыя мышцы глоткі, мяккага нёба. Храп як феномен — гэта вібрацыя мышачных структур глоткі і насаглотку. У нецвярозага чалавека ўсе мышцы расслабленыя, у тым ліку і гэтыя. Таму мы і не раім злоўжываць алкаголем.

☎— З Мінска званю. Святлана Сяргееўна. Мой муж абсалютна раўнадушны да салодкага, але жыць не можа без салёнага і вострага. Ці можна неяк паўплываць на гэтыя асаблівасці?

— Усё залежыць ад сілы волі. Варта імкнуцца абмяжоўваць тое, што не вельмі карысна. Не думаю, што такія асаблівасці абумоўлены анатамічнымі асаблівасцямі, належнасцю тых ці іншых рэцэптараў. Хоць схільнасці ў кожнага чалавека могуць быць свае, як і свой абмен рэчываў. Часам гэта можа характарызаваць патрэбу ў тых ці іншых мікраэлементах. Але, як правіла, справа ў харчовых звычках.

☎— Алена Андрэеўна з Буда-Кашалёва. Чым абумоўлены рак гартані? Наколькі эфектыўна лечыцца?

— Рак гартані — досыць распаўсюджанае захворванне сярод мужчын сярэдняга ўзросту, пераважна сярод курцоў, тых, хто злоўжывае алкаголем, адным словам, у гэтым сэнсе важны лад жыцця ў цэлым. Рак гартані ў залежнасці ад аддзела, дзе ён лакалізуецца, а іх — тры, мае свае праяўленні. Калі ў верхнім, то хворага больш непакояць парушэнні глытання, калі сярэдні — парушэнні тэмбру голасу. Цяпер шырока праводзяцца прафагляды, таму такі рак выяўляецца на досыць ранніх этапах. Пры падазрэнні бярэцца біяпсія. Лячэннем займаюцца анколагі. Прымяняецца прамянёвая і хірургічная тэрапія. Лячэнне можа быць досыць эфектыўным.

☎— Барысаў, Галіна. Мая сястра неяк нядобра вымаўляе літару «л». Ці можна пазбавіцца дрэннага вымаўлення ў дарослым узросце?

— Думаю, што можна. Ёсць розныя прычыны дрэннага вымаўлення, напрыклад, пэўныя асаблівасці з боку артыкуляцыйнага апарату, калі скарочана вуздзечка языка, слаба развіта мяккае нёба, што таксама ўздзейнічае на дыкцыю і вымаўленне. Лагапед установіць гэту прычыну, і пачне лячэнне. Для дарослых у нашым цэнтры заняткі будуць платнымі.

— Скажыце, а па якой прычыне дзіця можа позна пачынаць размаўляць? Можа, яно дрэнна чуе?

— Неабходна абследаваць такое дзіця. Не абавязкова могуць быць праблемы са слыхам. Здараецца, у такіх дзяцей проста няма падстаў для таго, каб пачаць размаўляць... Важны і ўзровень псіхічнага развіцця. Неабходна звярнуцца да дэфектолага, сурдапедагога, псіханеўролага, лагапеда. Можна ўзяць накіраванне і прыехаць у наш цэнтр. Гэтымі праблемамі трэба займацца як мага раней. Зараз, дарэчы, ідзе гаворка аб тым, каб пачаць маніторынг нованароджаных на прадмет прыроджанай глухасці. Чым раней распачаць рэабілітацыю, тым лепшы будзе вынік. Нават пачынаць вучыцца карыстанню слыхавым апаратам трэба як мага раней.

— Чула, што бываюць яшчэ такія ўрачы — фанапеды. А яны чым займаюцца?

— Фанапед — гэта педагог, лагапед па адукацыі. Калі фаніятр — урач — паставіў дыягназ, указаў, якія парушэнні ёсць у працэсе голасаўтварэння, то фанапед адкарэктуе манеру маўлення, пастаноўку дыхання, у цэлым маўленчы працэс.

☎— Гродна, патурбавала Галіна Пятроўна. Я — настаўніца, і мяне зацікавіла тэма дадзенай «прамой лініі». Скажыце, калі ласка, а што рабіць, калі па прычыне моўных нагрузак у голасе пачнуць з'яўляцца змены? І чым гэта можа пагражаць у будучым?

— Вельмі важна не дапускаць таго, каб з голасам адбывалісе змены. Наколькі я ведаю, настаўнікі павінны няспынна размаўляць не больш за 3—4 гадзіны ў дзень. Калі гэта норма перавышаецца, то якія б сродкі мы ні прымянялі, нічога ў нас не атрымаецца. Ёсць простае правіла: колькі гартань працавала, столькі яна павінна адпачываць. Калі вы адчуваеце, што гартань «перапрацавала», першнаперш забяспечце ёй галасавы спакой. Можаце дадаць сухую цеплыню на гэтую вобласць... Не любіць наша гартань, калі мы пасля моцнай моўнай нагрузкі рэзка выбягаем на халодную вуліцу. Справа ў тым, што павышаная галасавая нагрузка — гэта спазм мышцаў, парушэнне мікрацыркуляцыі, якія мы павінны аднавіць падчас адпачынку. Што датычыцца далейшых магчымых праблем, то тут варта мець на ўвазе, што ў момант галасавога напружання адбываецца траўма галасавой складкі. Як і з любой траўмай, якая становіцца хранічнай, пазней яна будзе з'яўляцца і пры меншай нагрузцы. Паступова гэта можа прывесці да пашкоджання эпітэлію слізістай галасавых складак. Могуць быць і вузялкі, і хранічныя сасудзістыя парушэнні, і новаўтварэнні — паліпы, фібромы. Або, наадварот, ад пастаяннага траўмавання галасавая звязка ўвогуле атрафіруецца. І тады працэс стане незваротным.

— А як адрозніць такое траўмаванне ад алергіі?

— Гэта павінен зрабіць спецыяліст. Алергію можа выявіць алерголаг.

«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

У РЫБГАС — ЯК НА ЎЛАСНУЮ САЖАЛКУ

Трое непрацуючых грамадзян праніклі на тэрыторыю рыбгаса «Белае» і з дапамогай сетак скралі 72 кілаграмы карпа. Урон быў нанесены на суму 619 тысяч рублёў.

А на тэрыторыі ААТ «Рыбакамбінат Любань» дзяржінспектарамі былі затрыманы два жыхары Слуцка, якія ўчынілі крадзеж рыбы з адной з сажалак гаспадаркі. У парушальнікаў было канфіскавана 106 кілаграмаў карпа і 41 кілаграм таўсталобіка на агульную суму больш чым 990 тысяч рублёў, а таксама пяць сетак агульнай даўжынёй 250 метраў. Адначасова ў іншым месцы на гэтай жа сажалцы за крадзеж рыбы быў затрыманы непрацуючы жыхар Слуцка, у якога канфіскавана 57 кілаграмаў карпа на суму 383 тысячы рублёў і тры сеткі агульнай даўжынёй 150 метраў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже, обращенного в доход государства здания столярного цеха, об. пл. 493,8 кв.м, расположенного по адресу: Воложинский район, д. Гончары. Начальная цена – 73 902 000 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **15 июля 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **14 июля 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже обращенных в доход государства объектов:

№ лота	Объект, общая площадь (кв.м), адрес	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)
1	Площадка для сбора мусора, *94,20 кв.м,* (бетонная стяжка, ограждение – железобетон, металлическое), г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	6 343 000	10 %
2	Теплопункт, *101 кв.м,* г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67, корпус № 11	24 207 000	10 %
3	Ремстройцех и столярная мастерская, *431,8 кв.м,* г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67, корпус № 12	78 168 000	10 %
4	Бассейн оборотного водоснабжения, площадь застройки — *464 кв.м,* (материал — железобетон), г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	79 553 000	10 %
5	Склад металла заготовительной резной, корпус № 10, *626,5 кв.м,* г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	117 440 000	10 %

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.04.2008 г. **Аукцион состоится 08 июля 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321.** Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 07 июля 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

УСЁМАГУТНАЯ МАМАЧКА

Сямейны псіхолаг
Святлана Анішчанкава

«Мне 39 гадоў, свае дзеці падрастаюць, а мае бацькі ўсё думаюць, што я маленькая дзяўчынка, якую трэба вучыць жыць. Адносіны напружаныя, прыходзіш да іх, як на павіннасць, наслухаешся пра сябе рознага — крыўда доўга не праходзіць... Як змяніць сітуацыю? Хочацца спакою і добрых адносінаў».

Таццяна М.,
Мінскі р-н.

Прывычныя фразы з дзяцінства: «...калі не будзеш слухацца, я не куплю табе цацку, не дазволю ісці гуляць, не дам цукерку...» Як часта мы міжволі паўтараем іх нашым дзецям, забыўшы, якую крыўду на сваіх мам і татаў і якое пачуццё несправядлівасці яны выклікалі. Мы абяцалі сабе, што са сваімі дзецьмі так паступаць не будзем і ўсё роўна капіруем сваіх бацькоў. Маленькае любячае сэрца не ў сілах прыняць шантаж, яно доўга даруе сваім родным, але дзіцячы давер з кожным годам страчвае сваю трывалась і ў выніку рассыпаецца на дробныя кавалкі расчаравання. Недавер да блізкіх людзей выклікае лішнюю насцярожанасць, чаканне падвоху за кожным рагом. Сфарміраваны ў такіх умовах чалавек, ужо ў дарослым жыцці, як правіла, апынаецца ў залежным становішчы, і гэту залежнасць ад чаго або каго заўгодна ён прымае як нешта натуральнае. Павага да бацькоў застаецца толькі дзякуючы таму, што яе табе «ўбілі» ў галаву з калыскі. Павагу «ўбілі» — давер знішчылі.

Душэўныя, раўнапраўныя адносіны дарослых дзяцей і іх бацькоў у наш час убачыш не часта. Больш звыклая карціна, калі пастаянна незадаволеная маці абвінавачвае ў чымсьці сваю дарослую дачку. Калі бацька адмахваецца пры пытанні аб сыне, які не апраўдаў яго надзей і не стаў паспяховым (у чыімсьці разуменні) чалавекам. Чаму гэтыя абвінавачанні не перастаюць з гадамі засмучаць і, нягледзячы на «загартоўку», кожны раз выклікаюць адчуванне суму ад страты нечага важнага. Уся справа ў тым, што ў сем'ях, дзе абвінаваўцамі выступаюць бацькі, парушана паўнацэнная пераемнасць пакаленняў, дзе старэйшыя заўсёды застаюцца апорай малодшым, бо валодаюць большым жыццёвым вопытам.

Абвінаваўча-маніпуляцыйная форма ўздзеяння на дзяцей выкрывае несфарміраванасць бацькі як паўнацэннай асобы. Калі ў дзіцяці не бачаць чалавека з яго жаданнямі і магчымасцямі, калі дабіваюцца падпарадкавання шляхам шантажу, то рызыкуюць сапсаваць адносіны са сваім дзіцем у будучыні надоўга. Наступствы такога выхавання праяўляюцца ва ўзаемных прэтэнзіях і папроках часам на працягу ўсяго жыцця, ператвараючыся ў драму для блізкіх па крыві людзей.

Негатыўныя бацькоўскія эмоцыі да дзяцей часта выкліканы асабістай незадаволенасцю бацькоў. З узростам сітуацыя супярэчання і ўнутранага разладу толькі пагаршаецца. Бацькі несвядома ўключаюць ва ўласны эмацыянальны канфлікт сваіх дзяцей. Актыўная пара жыцця прайшла, мары, надзеі і многія жаданні не здзейсніліся. Памылкі не выправіць, час назад не павярнуць: «...Адна надзея на дзяцей...»

Міжволі параўноўваючы сябе са сваімі дзецьмі, заўважаюць нелюбімыя свае рысы ў іх характары, бацькі жорстка наракаюць на праўду, якую дорыць ім прырода. Праўду ад тым, што ты не ідэальны, звычайны і слабы, і дзеці твае таксама звычайныя людзі са звычайнымі магчымасцямі, жаданнямі і хочуць жыць уласным, непаўторным жыццём.

Ускладаючы непасільную ношу нерэалізаваных жаданняў на дзяцей, бацькі асуджаюць сябе на эмацыянальную адзіноту. Яны рызыкуюць бачыць сваіх дарослых сыноў і дачок толькі ў «абавязковыя дні». І чым старэй будуць станавіцца дзеці, тым цяжэй будзе маніпуляваць імі, каб дагадзіць сваім жаданням. Але, як правіла, бацькоў змяніць цяжка і ў сітуацыі, калі адносіны становяцца нясцерпнымі, адзіны правільны спосаб вырашыць праблему — змяніць да яе стаўленне.

Скажыце сабе праўду — вамі маніпулююць вашы бацькі. Перамажыце ў сабе страх быць адрынутымі, калі перастанеце адпавядаць іх чаканням. Каб вызваліцца ад навязлівага пачуцця віны, абмяжуйце сябе ад іх жадання, пераадолейце забарону, якую вам устанавілі бацькі. Набярыцеся сілаў прызнаць, што вашы паводзіны ўдзячнага дзіцяці дапамагаюць бацькам працягваць гуляць у іх любімыя гульні: вы — паслухмяное дзіця, яны — маладыя, таленавітыя, наперадзе ўсё жыццё... Паспрабуйце змяніць вугал гледжання і ўбачыць у маці або бацьку не ўсёмагутнага дэмана, а ўсяго толькі чалавека, які не ўмее па-іншаму жыць і будаваць адносіны. Маладушна хаваючыся за ўспаміны, яны вырашылі застацца ў маладосці, баючыся ісці наперад, і галоўнае — гаварыць сабе праўду: «Я станаўлюся старэйшым, мудрэйшым. Мае дзеці выраслі, сталі самастойнымі і дастойнымі маёй павагі і свайго меркавання».

Пры зносінах з бацькамі настойвайце на захаванні ўласных межаў, таму што яны ствараюць прастору, унутры якой імкнуцца прымусіць вас будаваць сваё жыццё. Прытрымлівайцеся ўласных патрэбнасцяў і прывычайце сябе не азірацца на маму і тату: што яны падумаюць, што скажуць. Толькі тады можна спадзявацца, што іх словы згубяць над вамі ўладу, і вы перастанеце ўздрыгваць, калі яны зноў націснуць на ваша балючае месца.

Вы лёгка адкажаце тату «не» і не адчуеце сябе вінаватым, або, наадварот, скажаце маме «так», шчыра пагаджаючыся з ёй. Калі ў вас гэта атрымаецца, значыць, бацькі страцілі сваю здольнасць прыводзіць вас у адчай. Магчыма, напарадзе ў вас новыя адносіны, у якіх вы нарэшце зможаце пазнаёміцца з рэальнымі людзьмі і ў далейшым мець справу з імі, а не з фантастычна-ўсёмагутнымі мамачкай і татачкам з вашага даўно прайшоўшага дзяцінства.

P.S. Задавайце свае пытанні сямейнаму псіхолагу па тэл. (8017) 287 18 69.

Пішыце на адрас рэдакцыі альбо e-mail: svetlanapsikholog@yandex.ru.

Імпрэза

«З БАЦЬКОЎСКАЙ КРУЖЭЛКІ»

Так бард Алесь Камоцкі назваў цыкл песень, якія былі сапраўднымі хітамі ў савецкі час, але і цяпер іх з задавальненнем спяваюць нашы суграмадзяне ў добрым настроі. А калі не могуць спяваць, то маюць магчымасць паслухаць. Год таму Алесь Камоцкі нагадаў гэтыя песні, падышоўшы да іх выканання аўтарскім шляхам. «Клён стары ў дварэ шыбу мацае лістом, запрашае перайсціся надвячоркам...» І далей. Словы ўгадаюцца лёгка і натуральна, быццам бы так і гучалі. Хоць цяпер песня гучыць па-беларуску. Таксама «Адзінокі гармонік» і шэраг іншых савецкіх хітоў, якія працягваюць заставацца любімымі. Камоцкі, зрабіўшы іх перакладам, тым самым зрабіў гэтыя песні больш нашымі, пры гэтым захаваўшы змест і пачуццёвасць. Праект, які год таму быў прад

Твае правы

ПЕНСІЙНАЯ РАСКЛАДКА ДЛЯ МІГРАНТА

Расія, Украіна, Казахстан, Арменія, Азербайджан, краіны Балтыі, Ізраіль, ЗША, Германія, Новая Зеландыя, Польшча... Як сведчыць статыстыка, летась на пастаяннае месца жыхарства з Беларусі за мяжу выехалі 838 пенсіянераў, а ў сваю чаргу прыехала да нас больш за 2300 чалавек пенсійнага ўзросту. Прычыны міграцыі ў паважным узросце называюцца розныя. А вось галоўнае пытанне, што ўзнікае ў такіх выпадках, звычайна адно: што будзе з пенсіяй? Зрэшты, разабрацца з ім мы паспрабуем пры дапамозе галоўнага спецыяліста ўпраўлення развіцця пенсійнага заканадаўства Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алены Васільеўны ГОМАРАВАЙ.

Краіны СНД

«Пенсійныя» пытанні пры міграцыі паміж большасцю краін СНД рэгулююцца міждзяржаўным пагадненнем ад 13 сакавіка 1992 года. Пагадненне вызначае так званы тэрытарыяльны прынцып — пенсія прызначаецца і выплачваецца на падставе заканадаўства той краіны, куды пераязджае на сталае месца жыхарства чалавек. Прычым варта заўважыць: пры ад'ездзе за межы Беларусі захаваць беларускую пенсію ўжо нельга — за выключэннем выпадкаў, калі віду пенсіі, прызначанага ў нас, няма ў заканадаўстве краіны перасялення.

— Беларускі пенсіянер, які вырашыў змяніць краіну жыхарства, павінен паведаміць аб гэтым у раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і прадставіць пашпарт з дазволам на выезд, — кажа Алена Гомарава. — А ўжо пасля прыбыцця на новае месца неабходна паклапаціцца аб атрыманні грамадзянства ці пасведчання на права жыхарства і звярнуцца ў органы, якія займаюцца прызначэннем і выплатай пенсій на тэрыторыі дзяржавы перасялення. Пры гэтым везці з сабой пенсійныя дакументы не трэба — іх перашлюць нашы службы.

Падобныя ж крокі робяць пенсіянеры з краін былога Саюза, якія выбіраюць месцам пастаяннага жыхарства Беларусь. Праўда, трэба зрабіць адну вельмі істотную заўвагу: тэрытарыяльны прынцып дзейнічае толькі ва ўзаемаадносінах з Украінай, Малдовай, Арменіяй, Казахстанам, Кыргызстанам, Таджыкістанам, Узбекістанам, Туркменістанам. Іншыя стасункі замацаваны міждзяржаўнымі дамовамі з Расіяй, Літвой і Латвіяй. А вось з Эстоніяй, Грузіяй, Азербайджанам і краінамі далёкага замежжа ніякіх дамоў ўвогуле няма.

Эстонія, Грузія, Азербайджан, далёкае замежжа

Пакольні гэтыя краіны не далучыліся да міждзяржаўнай дамовы паміж дзяржавамі СНД ад 13 сакавіка 1992 года і не падпісалі асобных дамоў з Беларуссю, сітуацыя выглядае проста і складана адначасова. Пры выездзе з нашай краіны ў Эстонію, Грузію, Азербайджан ці далёкае замежжа робіцца выплата пенсіі за 6 месяцаў «наперад». А ў дзяржаве прыбыцця ўсё рэгулюецца нацыянальнымі заканадаўствамі, прычым у нацыянальных заканадаўствах выплата пенсій мігрантам прадугледжваецца далёка не заўсёды.

— Гэта насамрэч даволі вострая праблема, аднак, на жаль, яе вырашэнне залежыць не толькі ад Беларусі, — працягвае Алена Гомарава. — Дзеля справядлівасці, варта ўсё ж зазначыць: цяпер пачаліся двухбаковыя кансультацыі па заключэнні двухбаковага пагаднення з Азербайджанам.

Літва

Дагавор аб сацыяльным забеспячэнні з Літвой дзейнічае з 1999 года і мае зусім іншы прынцып — «экспарту» пенсій. Гэта значыць, што ў выпадку змены месца жыхарства ўжо аформленую пенсію працягвае выплачваць тая краіна, дзе пенсія і была прызначана.

— У той жа час адрозніваецца парадак для асобаў, якія пасля ўступлення ў сілу дагавора 1999 года звяртаюцца па пенсію ўпершыню, — адзначае Алена Гомарава. — Разлічыць тут выглядае такім чынам. За «савецкі» (зароблены да 1 студзеня 1992 года) стаж выплаты робіць тая з дзяржаў, на тэрыторыі якой пастаянна пражывае грамадзянін на момант звароту па пенсію. А вось за страхавы стаж пасля 1 студзеня 1992 года пенсію прызначае тая дзяржава, на тэрыторыі якой гэты стаж і быў зароблены. Словам, постсавецкі стаж дзеліцца на прапорцыі.

Латвія

Падзел стажу на прапорцыі (выплата кожнай з дзяржаў пенсіі за работу на сваёй тэрыторыі) вызначаны і ў двухбаковым дагаворы аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння з Латвіяй. Але тут ёсць пэўны нюанс — чалавеку, які звяртаецца па пенсію ўпершыню і мае стаж у Латвіі падчас існавання СССР, гэты стаж «аплаціць» балтыйская краіна.

Тут жа варта падкрэсліць: беларуска-латвійскі дагавор быў падпісаны толькі 29 лютага сёлета і дзейнічаць яшчэ не пачаў. Ён уступіць у сілу пасля ратыфікацыі парламентамі абедзвюх краін і абмену адпаведнымі граматамі. Пры гэтым, мяркуюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, беларускія дэпутаты ратыфікуюць пагадненне да канца гэтага года. Тэрміны ратыфікацыі латвійскім бокам пакуль невядомыя.

Расія

Двухбаковы дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння пачаў дзейнічаць з 29 сакавіка мінулага года. Прычым варта адразу ж падкрэсліць: ён распаўсюджваецца толькі на грамадзян Беларусі і Расіі.

Паводле беларуска-расійскага дагавора, за стаж, зароблены да 13 сакавіка 1992 года, пенсію прызначае і выплачвае краіна, у якой чалавек пастаянна пражывае цяпер. А вось у дачыненні да стажу, зароблена ў выпадку пераезду з Беларусі ў Расію ці наадварот, пасля 13 сакавіка 1992 года дзейнічае прынцып «прапорцый» — кожная з дзяржаў прызначае пенсію за работу на сваёй тэрыторыі.

Аднак у гэтым правіле існуе вельмі значнае выключэнне.

— Дагавор утрымлівае норму, якая вызначае, што па ўласным жаданні чалавек можа выбраць пенсію той дзяржавы, грамадзянінам якой ён з'яўляецца, — зазначае Алена Гомарава. — Але неабходна падкрэсліць, што гэты выбар акажацца канчатковым і не стане пераглядацца ў будучым. Інакш кажучы, магчымасць змяняць некалькі разоў беларускую пенсію на расійскую і наадварот будзе толькі ў адным выпадку — змены грамадзянства.

Апроч таго, дагавор прадугледжвае магчымасць атрыманя ўжо прызначанай расійскай пенсіі пасля пераезду на сталае месца жыхарства ў Беларусь пасля 29 сакавіка 2007 года. Аднак пры ўмове наяўнасці не менш чым 25-гадовага стажу ў мужчыны ці 20-гадовага стажу ў жанчыны, які быў цалкам выпрацаваны на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі ці колішняй РСФСР.

І ў сваю чаргу пры такім жа стажы на тэрыторыі нашай краіны на атрыманне ўжо прызначанай беларускай пенсіі могуць разлічваць грамадзяне, якія выехалі на пастаяннае месца жыхарства ў Расію.

Сяргей ГРЫБ.

Даведка «Звязды»

Як сведчыць статыстыка, летась беларускія пенсіянеры часцей за ўсё на сталае месца жыхарства выязджалі ў Расію (645 чалавек), ва Ўкраіну (140), у Казахстан (23), Ізраіль (6), Літву (5), ЗША (3). У сваю чаргу часцей за ўсё да нас пераязджалі пенсіянеры з тых жа Расіі (1381 чалавек), Украіны (559), Казахстана (189), Узбекістана (48) і Малдовы (40 чалавек).

Дэмаграфічная бяспека

Юбілейнае «заводскае» дзіця

У калектыве гродзенскага ААТ «Белкард» — радасная падзея. Нядаўна нарадзілася 125-е дзіця, чые бацькі атрымалі ад прадпрыемства матэрыяльную дапамогу ў памеры 2 мільёнаў рублёў.

Спецыяліст дагаворнага аддзела Кацярына Белая (адна з маладых мам, якая атрымала 2 мільёны рублёў) з дачкой Соф'яй.

— Калі ў 2006 годзе мы вось такім чынам вырашылі падтрымліваць мацярынства і дзяцінства, то мала хто думаў, што гэта мера будзе эфектыўнай, — расказвае намеснік дырэктара ААТ «Белкард» па ідэалагічнай рабоце і кадрах Юрый Бекіш. — Аднак факт застаецца фактам: колькасць «заводскіх» дзяцей працягвае расці.

У першы год матэрыяльную дапамогу атрымала 21 маладая мама. А з 2007-га яна выплачваецца не толькі ім, але і татам, што працуюць на прадпрыемстве. Калі ж там працуюць абодва бацькі нованароджанага, то па 2 мільёны рублёў атрымлівае кожны з іх. Увогуле за два гады выплачана ўжо больш за чвэрць мільярда рублёў.

І яшчэ. Напярэдадні Дня абароны дзяцей адміністрацыя ААТ «Белкард» сумесна з жаночым саветам прынялі рашэнне аб выплаце матэрыяльнай дапамогі ў памеры 30 тысяч рублёў работнікам прадпрыемства на кожнае дзіця ва ўзросце да 14 гадоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Спорт-тайм

Глеб блізкі да пераходу ў «Барселону»

Беларускі паўабаронца лонданскага «Арсенала» Аляксандр Глеб блізкі да пераходу ў «Барселону», паведаміў прадстаўнік футбаліста Вінчэнца Марабіта. «Здзелка практычна завершана. «Барселона» сачыла за ім некалькі месяцаў. Шкада, што мы не змаглі ўладкаваць футбаліста ў Італію, яму вельмі падабаўся «Інтар», але новы трэнер Жазэ Маўрыньё спыніў свой выбар на іншых гульцах і назваў іншыя імёны ў якасці прыярытэтных трансферных мэтаў», — цытуюць Марабіта іспанскія СМІ. Раней паведамлялася, што ігрок і яго агент Мікалай Шпілеўскі сустрэліся са спартыўным дырэктарам каталонцаў Чыкі Бегірыстайнам у Кайзерслаўтэрне, дзе зборная Беларусі правяла таварыскі матч з камандай Германіі. Футбаліст заявіў, што пакіне англійскі клуб у сувязі з тым, што не змог адаптавацца да жыцця ў Лондане і не выйграў ніякіх трафеяў у складзе «кананіраў».

Гарднеру сказалі «так»

Канадскі спецыяліст Пол Гарднер прызначаны галоўным трэнерам клуба «Дынама» (Мінск), які восенню стартуе ў Кантынентальнай хакейнай лізе.

Кантракт падпісаны на адзін год з магчымасцю працягнення яшчэ на адзін сезон. У нацыянальнай зборнай Беларусі канадзец будзе дапамагаць свайму суайчынніку Глену Хэнлану, які выказаў «глыбокую задаволенасць новым асістэнтам».

Чакаецца, што Гарднер прыбудзе ў Беларусь 22 чэрвеня, да гэтага мае намер прагледзець некалькі кандыдатаў у дынамаўскую каманду. 52-гадовы канадзец раней узначальваў клуб расійскай суперлігі «Лакаматыў» з Яраслаўля, адкуль быў звольнены ў верасні 2007 года.

«Віцебск» перамогу не ўтрымаў

Пасля паўзы, якая была выклікана матчамі футбольнай зборнай напярэдадні Еўра-2008, аднавіўся чэмпіянат краіны ў вышэйшай лізе. Згуляны матчы восьмага тура.

Лідар першынства, «Віцебск», не змог выйграць у Барысаве ў жодзінскіх аўтазаводцаў. Адкрыўшы лік, падапечныя Канаплёва пратрымаліся да 85-й хвіліны, але не змаглі засцерагчы вароты ад пенальці ў выкананні Шаракова.

Страта лідарам двух ачкоў дазволіла праследвальнікам наблізіцца да віцябчан. МТЗ-РІПА ў гасцях абыграў «Граніт-Мікашэвічы» (3:1), а БАТЭ ў Салігорску і па гульні, і па ліку было мацнейшым за «Шахцёр» (2:0). Нечаканасць адбылася ў Магілёве. Мінскае «Дынама» з лікам 1:3 прайграла «Дняпру» і апусцілася на сёмае месца. Чацвёрты матч запар не саступае «Дынама» (Брэст). На гэты раз — перамога ў Гродне і 11-е месца ў табліцы.

На чэмпіянаце свету Беларусь і Расія сыгралі ўнічыю

Унічыю 26:26 завяршыўся 7 чэрвеня ў Мінску першы матч плей-оф кваліфікацыі мужчынскага чэмпіянату свету-2009 па гандболе паміж зборнымі Беларусі і Расіі.

Сапернікі папераменна валодалі перавагай, але адарвацца больш чым на тры мячы ім не ўдалося. Сустрэча ў адказ адбудзецца 14 чэрвеня ў падмаскоўным Чэхаве.

А жаночая зборная выйшла ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы 2008 года. 7 чэрвеня ў Цэле матч у адказ плей-оф кваліфікацыі паміж падапечнымі Канстанціна Шараварава і камандай Славеніі завяршыўся ўнічыю 25:25. Першая сустрэча 1 чэрвеня ў Мінску завяршылася перамогай зборнай Беларусі з лікам 29:25.

Аказваецца, можна абыходзіцца і без таджыкаў

Без каментарыяў

У расійскіх журналістаў выклікалі цікаўнасць, здавалася б, зусім зразумелыя для нас рэчы.

«Звязда» паведамляла ўжо, што амаль увесь мінулы тыдзень у Беларусі знаходзілася дэлегацыя расійскіх журналістаў. Яны ў рамках чарговага прэс-тура грунтоўна знаёміліся з тым, як у нашай краіне вядзецца барацьба з такім вельмі небяспечным відам арганізаванай злачыннасці, як гандаль «жывым таварам».

Дваццаць журналістаў з Расіі таксама цэлы дзень правялі ў Мінскай вобласці, сустрэліся з кіраўніцтвам Капыльскага і Слуцкага раёнаў, наведалі аграгарадок «Цімкавічы», шэраг слуцкіх установ сацыяльнай сферы, сыраробны камбінат, убачылі на свае вочы, як жывуць і працуюць беларусы ў сельскай мясцовасці. Разам з гасцямі ў Мінскай вобласці пабываў і карэспандэнт «Звязды». У расійскіх журналістаў, натуральна, узнікала шмат пытанняў да кіраўнікоў раёнаў. Тое, аб чым пыталіся калегі, — гэта пэўная ўскосная інфармацыя аб сённяшніх дні Расіі, яе праблемах і клопатах.

Вось некаторыя фрагменты гутарак, як гаворыцца, без каментарыяў.

Так, у першага намесніка старшыні Слуцкага райвыканкама Васіля Статкевіча на поўным сур'ёзе пацікавіліся, як у гарадзе мясцовая ўлада абыходзіцца без таджыкаў, хто так чыста прыбірае на вуліцах і плошчах гарадоў? Як мне здалося, гэта нечаканае пытанне застала знянацку Васіля Пятровіча, але ён хутка знайшоўся і сказаў праўду: беларусы, выключна яны сочаць за парадкам. Наступнае пытанне было больш «лёгкім»: чаму ў вёсках Слуцкага раёна яны не бачаць старых, якія пахіліліся, хаціны, што з імі зрабілі?

У старшыні Капыльскага райвыканкама Міхаіла Боды ў час наведвання аграгарадка «Цімкавічы» прама спыталі: ці не баіцца ён таго, што калі-небудзь у раёне з'явіцца знакаміты расійскі алігарх Раман Абрамовіч і скупіць землі тутэйшай гаспадаркі? Міхаіл Тарасавіч даў таксама прамы і адназначны адказ: ён не баіцца, завалодаць Абрамовічу навакольнымі прасцягамі не атрымаецца.

Такія вось цікавыя, на мой погляд, пытанні. Як гаворыць вядомая руская прымаўка: што каму дапякае, той пра тое і гукае.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.
Мінская вобласць.

Ну і ну!

УПАЎ З КАТАМАРАНА...

У нядзелю ў Мінску на рацэ Свіслач па ўласнай неасцярожнасці патануў 48-гадовы сталічны жыхар.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, здарэнне адбылося каля сямі гадзін вечара насупраць аднаго з дамоў па вуліцы Прагрэсіўнай. Мужчына, які прагульваўся па рацэ на катамаране, зваліўся ў ваду і, на жаль, не змог выратавацца.

Ігар ГРЫШЫН.

ПЕНСІЯНЕР-ПАДБУХТОРШЧЫК?..

У Мінску затрыманы 70-гадовы пенсіянер, які, як мяркуецца, атрымаў 20 тысяч долараў ЗША ад намесніка дырэктара прыватнага ўнітарнага прадпрыемства.

Пенсіянер падазраецца ў тым, што атрымаў гэтыя вялікія грошы, падбухторваючы адказную асобу згаданага прадпрыемства да дачы хабару. «Стаўка» аказалася настолькі высокай таму, што размова ішла аб вырашэнні пытання па выдзяленні зямельнага ўчастка пад будаўніцтва кафэ і арганізацыю прыдарожнага сэрвісу ў Маладзечанскім раёне.

Ігар ГРЫШЫН.

ЗНАЙШЛІ Ў КАНАЛЕ

У канале каля Бярозаўскай ДРЭС знайшлі цела тапельца. Невядома, ці проста паслізнуўся і ўпаў 40-гадовы жыхар Кобрына, ці захацеў пакупацца ў недазволеным месцы. Вядома толькі, што чалавек быў не зусім цвярозы. Гэта і паспрыяла трагедыі.

Яна СВЕТАВА.

СРОДКІ АХОВЫ РАСЛІН СКРАЛІ... АГРАНОМЫ?

У Баранавіцкім і Лунінецкім раёнах затрыманы галоўныя аграномы двух сельгаспрадпрыемстваў, якія падазраюцца ў крадзяжы ядахімікатаў. Паводле інфармацыі следства, аграном з Баранавіцкага раёна ўкраў 145 літраў вадкасці, якой апрацоўваюць расліны. А ў яго лунінецкага калегі пры вобыску знайшлі больш за тону ядахімікатаў. Вядзецца следства.

Яна СВЕТАВА.

ЗАБІЛА МАЛАНКАЙ

7 чэрвеня надвячоркам у Хоцімску была моцная навальніца. У вёсцы Елавец непадалёк ад райцэнтра тры рабочыя пасвілі кароў і перад самым загонам на ферму ўдарыла маланка. На месцы загінуў 32-гадовы рабочы СВК «Ліпаўка». «Хуткая дапамога» прыбыла літаральна праз дзесятак хвілін, але ўрачы ўжо не маглі нічога зрабіць.

Алена КАЗЛОВА.

Вакол Еўра

За кожную перамогу Расія атрымае 500 тысяч еўра

У суботу матчамі ў групе А распачаўся чэмпіянат Еўропы па футболе. Зборная Швейцарыі саступіла чэхам (0:1), а каманда Партугаліі аказалася мацнейшай за зборную Турцыі (2:0). З такім жа лікам скончыліся ў нядзелю матчы ў групе В. Зборная Харватыі перамагла Аўстрыю (1:0), а немцы ўзялі верх над палякамі (2:0). Такім чынам, у першыя два дні чэмпіянату паражэнні пацярпелі дзве каманды-гаспадыні турніру (Швейцарыя і Аўстрыя). Учора ўвечары прайшлі матчы ў групе С. Румынія сустракалася з Францыяй, а зборная Італіі згуляла супраць каманды Галандыі.

Сёння ў барацьбу ўступіць зборная нашых усходніх суседзяў. За кожную перамогу, дарэчы, на Еўра-2008 каманда Расіі атрымае 500 тысяч еўра, а за нічыю — 250. На групавым этапе зборная Расіі сыграе з камандамі Грэцыі, Іспаніі і Швецыі. Яшчэ да старту расійская дружына панесла страты. Павел Пагрэбняк пакінуў размяшчэнне каманды па прычыне траўмы калена і адбыў на тэрміновую аперацыю ў Мюнхен. У той жа час галоўны трэнер зборнай Галандыі Марко ван Бастэн паведаміў, што нападаючы каманды Робін ван Персі прапускае матч з італьянцамі з-за траўмы сцягна.

Патрыятызм і антыпатрыятызм па-аўстрыйску

Зборную Аўстрыі сталі называць самай слабай камандай чэмпіянату Еўропы задоўга да пачатку турніру. Прычым гэта меркаванне, гледзячы па ўсім, падзялялі многія жыхары краіны. Самыя актыўныя арганізавалі нават кампанію па зборы подпісаў у падтрымку адхілення аўстрыйскай зборнай ад Еўра-2008. Справа скончылася тым, што суд аштрафаваў галоўнага актывіста Міхаэля Крыса на паўтары тысячы еўра. Правасуддзе палічыла, што сын былога іграка зборнай Аўстрыі Вернера Крыса нанёс урон рэпутацыі дзяржавы, размясціўшы яе герб на сайце, дзе збіраліся віртуальныя подпісы.

А прыклад футбольнага патрыятызму аўстрыйцам падала каталіцкая царква. За некалькі гадзін да матча Аўстрыя — Харватыя ў Вене адбылася «футбольная меса», падчас якой служыцель культу, у прыватнасці, спытаў паству: «Ці палюбіў бы Ісус футбол і ці стаў бы ён гуляць у гэту гульню?». У працяг тэмы нядрэнна было б высветліць, за якую зборную выступаў бы Хрыстос і на якой пазіцыі ён гуляў бы.

Затрымана каля сотні балельшчыкаў

На другі дзень чэмпіянату Еўропы паліцыя затрымала каля 100 балельшчыкаў, якія выкрыквалі нацысцкія лозунгі падчас матча паміж зборнымі Германіі і Польшчы. Паліцыя пакуль не мае звестак аб стычках паміж фанатамі, аднак як паведамляе агенцтва Austria Press, некалькі балельшчыкаў нямецкай і польскай дружын учынілі бойку пасля таго, як Германія адкрыла лік у гульні.

На слыху «Завалілі» адразу пяць дзікоў

Рэйдавай групай дзяржінспектараў у шэсць раніцы побач з будынкам помпавай станцыі паблізу вёскі Тарасаўка Веткаўскага раёна былі знойдзены пяць туш дарослых дзікоў са слядамі агнястрэльных раненняў.

У гэтым жа месцы была арганізавана засада і праз некалькі гадзін затрыманы двое непрацуючых грамадзян. Яны ўначы, выкарыстаўшы матацыкл «Днепр» без дзяржнумара і незарэгістраванае аднаствольнае паляўнічае ружжо, незаконна здабылі пяць дзікоў агульнай вагой 485 кілаграмаў. Зброя, матацыкл і тушы жывёл канфіскаваны. Прыродным рэсурсам нанесены ўрон у асабліва буйным памеры — на суму 10 500 000 рублёў (300 базавых велічынь). Цяпер браканьерам давядзецца адказваць перад законам.

Браканьераў асудзілі на год

Суд Пружанскага раёна вынес прыгавор тром браканьерам і прызначыў ім пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на адзін год.

Гэтыя трое грамадзян яшчэ ў пачатку студзеня на тэрыторыі заказніка «Ружанская пушча» незаконна здабылі еўрапейскую казулю і лісу. Урон прыродным рэсурсам браканьеры нанеслі ў асабліва буйным памеры — на суму 7 875 000 рублёў (225 базавых велічынь).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ВЕКАВАЯ ЗАДАЧА

Яна перад вамі на дыяграме:



БЕЛЫЯ: f6, g7, h2, дамка d6 (4). ЧОРНЫЯ: f8, h4, h6 (3). Замкнуць простую чорных.

Як паведаміў нам гросмайстар СССР Леанід Вітошкін (Гомель), яна належыць Георгію Чэховічу і ўпершыню была апублікавана ў часопісе «Огонек» (Пецярбург) сто гадоў таму. Задача ўразіла не толькі новым спалучэннем фіналаў, але і дзівоснай эканоміяй матэрыялу. Дагэтуль ніхто не здолеў стварыць на 64-клетачнай дошцы нічога падобнага (!). Тады аўтару было толькі 17 гадоў. У далейшым Георгій Уладзіміравіч стаў прыкметным вучоным і ў 1943 годзе атрымаў Дзяржаўную прэмію за ўдасканаленне артылерыі на Балтыйскім флоце.

Твор Г. Чэховіча з'яўляецца заданнем № 3 бліцконкурсу-38.

Пераможцаў чакаюць сюрпрызы ад нашага бескарыслівага чытача Анатоля ПЯРХАЛЬСКАГА (Глыбокае) — яго зборнікі звяздоўскай рубрыкі «Шашкі» №№ 3-4 за 2005—2006 гады. Свае адказы накіроўвайце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

Л. Вітошкін нагадаў і эцюд В. Кульчыцкага, які таксама са стогадовым узростам:



БЕЛЫЯ: c5, d4, дамкі a7, f8 (4). ЧОРНЫЯ: c7, g3, дамка d2 (3). Па-за конкурсам пашукайце перамогу за белых. Таксама будзем рады вашым разгадкам.

Эцюд надрукаваны ў тым жа часопісе. Застаецца дадаць: у тыя далёкія часы ў ім шашачную рубрыку вёў наш зямляк Уладзімір Занеўскі.

ПЕРШЫНСТВО БЕЛАРУСІ

Яно адбылося па шашках-64 сярод мужчын (вышэйшая ліга). Званне чэмпіёна краіны прысуджана мінскаму студэнту, міжнароднаму майстру Ігару Міхальчанку, а віцэ-чэмпіёна — майстру ФМЖД Яўгену Кандрачэнку (Гомель). Трэці прызёр — сталічны міжнародны гросмайстар Аркадзь Плакхін. Мінулагодні чэмпіён майстар ФМЖД Мікалай Кадзеснікаў сёлета заняў чацвёртае месца. Далей фінальная васьмёрка мацнейшых ігракоў рэспублікі выглядае так: 5. майстар Сяргей Садоўскі (Гродна), 6. майстар Дзмітрый Масайла (Светлагорск), 7. кандыдат у майстры спорту Сяргей Місюта (Кобрын) і 8. майстар Васіль Навумік (Ваўкавыск).

РАШАЕМ — І НЕ ТОЛЬКІ

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый.

БЛІЦ-38/1 (М. Стэфановіч): 1. ab2 2. cb4 3. cd6 4. e:g3 5. de5 6. dc7 7. gf2 8. h:f2x.

ПА-ЗА КОНКУРСАМ (М. Стэфановіч): № 5. 1. ef6 2. bc7 3. ab8 4. fe7 5. b:a7x.

БЛІЦ-38/2 (Д. Камчыцкі): 1. dc7 d:b6 A 2. ef2 3. ed8 4. d:a1 5. a:h4x. A 1 ... d:f6 2. ef2 3. cb8 4. b:h6 5. h:h4x.

ПА-ЗА КОНКУРСАМ (Д. Камчыцкі): № 5. 1. cb8 2. b:a3 3. ae7 4. h:a7x.

АМАТАРАМ СТАКЛЕТАК (Л. Вітошкін): № 3. 33 (47 А) 23, 15x. А (49) 43, 15x.

Папярэднія заданні выканалі: Л. Вітошкін («Пагода ў доме»-4/9-10), І. Астроўскі (Мінск), Р. Сідарчук (Брэст), П. Шклудаў (Наваполацк), Л. Вітошкін («Пагода ў доме»-4/11), П. Акуліч, У. Бандарык, І. Коўчан, Г. Найдовіч, А. Мікуліч (Мінскі раён), В. Голас (Любань), А. Яўсеяў (Бялынічы), В. Жукоўскі (г. Барань Аршанскага раёна), Я. Казлоў, Анжэліка Кашкан, А. Кіслы, Марыя Лічко, Д. Мамедаў, А. і А. Яраховічы (Уздзенскі раён), Аляксандра Камінская, А. Рогач (Вілейка), Д. Камчыцкі (Магілёў), Ц. Каркенаў, А. Рамашок, Д. Семянюк, В. Сіўругін, А. Янчук (Камянец), І. Козел (п/а Махнавічы Мазырскага раёна), В. Краўчук, С. Нячаеў (Баранавічы), А. Перавознікаў, У. Сапяжынскі (Рагачоў), І. Працук (Паставы), У. Сямашка (Брэст), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), М. Трухан (п/а Пагост Першы Салігорскага раёна), В. Ціханенка (Гомель), І. Астроўскі, Л. Вітошкін, А. Пярхальскі, Р. Сідарчук, П. Шклудаў («Пагода ў доме»-4/12), бліц-37/3-6), І. Мацкевіч (Жодзіна), У. Бандарык, В. Голас, У. Сапяжынскі (38/1) і інш. Сярод іх майстар Пётр Шклудаў заўважыў, што бліц-37/4 (У. Бандарык) — копія праблемы М. Таропава (часопіс «Шашкі» (Рыга) за 1976 год № 4, дыяграма 2473). Ён жа даслаў два маленькія эцюды:

№ 1. БЕЛЫЯ: c5, дамкі a7, c7 (3). ЧОРНЫЯ: дамкі f2, h8 (2). 1. ce5 f:b6 2. a:d4x. 1 ... h:b6 2. a:g1x.

№ 2. БЕЛЫЯ: d4, e5, дамка b8 (3). ЧОРНЫЯ: дамкі a1, g3 (2). 1. ed6 g:c7 2. b:e5 ab2 3. eh8x. 1 ... a:c7 2. b:h2x.

«Святая прастата! Пачынаючым. Супадзенне не знайшоў», — піша П. Шклудаў.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе да **2 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчыкі могуць выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, 7 тэлевізараў «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 ліпеня 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» да **12 ліпеня**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі да **20 верасня 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2008 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. Пасля **20 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў сённяшнім нумары. Удачы ў гульні!

Тэрмін правядзення гульні — з 30.04.08 па 10.07.08.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1036 ад 25.04.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

8 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2008 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў_____ (аддзяленне сувязі)

_____ **на III кв. або 2-е паўг. 2008 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Кошт | падпіскі _____ руб. | Колькасць камплектаў

перадрасоўкі _____ руб.

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

Канадскі дзённік

Пералёт на другі кантынент для журналіста — падзея заўсёды хвалюючая і доўгачаканая. Трансатлантычная «перабазіроўка» з Мінска ў Канаду — тым больш. Як-ніяк, а ў беларусаў з канадцамі ёсць нямала агульнага. Напрыклад, па частцы блакітных азёраў. Больш за палову насельніцтва Канады жыве ў даволі добрых кліматычных умовах — паабапал пабярэжжа Вялікіх азёраў і ў даліне ракі Святога Лаўрэнція. У Канадзе шануюць бабра і лася. Беларусь — не выключэнне. Праўда, там водзяцца магутныя чорныя мядзведзі грызлі, пры выглядзе якіх можна адразу стаць заікай. Мы потым даведаліся, што гэтаму монстру ў канадскай сталіцы Атаве ўстаноўлены помнік.

Наш шлях ляжаў, здавалася б, у нязведаныя прасторы канадскай Арктыкі і адначасова ў гіганцкія мегаполісы сусветнага маштабу — Таронта, Манрэаль, Атаву, а таксама ў гарады меншай значнасці — Квебек, Галіфакс. Хоць на гэты раз яны наўрад ці саступалі монстрам у сваёй значнасці, бо менавіта сюды былі скіраваны мільёны поглядаў з усіх куткоў планеты. Тут праходзіў 72-і чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. Лядовыя паядынкі адбываліся на фоне 100-годдзя ўтварэння Міжнароднай федэрацыі хакея (IIHF) і 400-годдзя горада Квебек. Менавіта тут гуляла ўсе свае матчы беларуская дружына.

ТАРОНТА

Міжнародны аэрапорт Таронта, куды з 3-гадзінным спазненнем прызямліўся борт з Франкфурта-на Майне... Крыху больш чым чвэрць сутак на «Боінгу-777» з улікам позняга прылёту — далёка не самы лепшы варыянт для падтрымкі добрага настрою. Хутчэй бы на стыкавы рэйс у Квебек: уладкавацца з пражываннем ды адпачыць. Аднак гэтым планам ужо напачатку больш чым двухтыднёвага ваяжу не суджана было збыцца. Апошні «першамайскі» самалёт з Таронта адправіўся ў бок французскай правінцыі больш як гадзіну таму. Няўжо прыйдзецца начаваць у аэрапорце?! З гэтымі думкамі беларуская дэлегацыя накіравалася да стойкі пагранічнага кантролю, дзе іх чакала не зусім прыемная працэдура праверкі пашпарта. Як тут не ўспомніць рэвалюцыйная класіка Уладзіміра Маякоўскага і яго «Стихи о Советском паспорте». Памятаеце, «...глядят, как в афишу коза...». Прыкладна так жа «падсмажаны» індус, які выконваў ролю вартавога мяжы, узіраўся ў блакітную «пашпарціну» кожнага з беларускіх грамадзян і напрыканцы беспардонна перакрэсліваў канадскую візу. Спрачацца было справай дарэмнай, бо свой жэст па «псаванні» візы ён адпаліраваў дасканала і гэта быццам бы ўваходзіла ў яго прамыя абавязкі. Зрэшты, такія, на наш погляд, неадэкватныя паводзіны іншаземцаў у дачыненні да шчырых славян як бы сталі нормай. Такім чынам некаторыя выхадцы з азіяцкіх і афрыканскіх краін «кампенсуюць» сваю пакрыўджанасць на жыццё...

Між тым чаканне развязкі ў аэрапорце Таронта зацягвалася. Дзесятак беларусаў у кампаніі з балельшчыкамі з Латвіі, якія таксама збіліся з графіка вылету ў Галіфакс, гадалі наконт сваёй бліжэйшай перспектывы... У рэшце рэшт далёка за поўнач ужо наступных сутак авіякампанія Air Canada «раскалолася» на начлег для еўрапейскіх «валацуг» — нас рассялілі ў двухмесныя нумары аэрапортаўскага гатэля ў прыгарадзе Таронта. Ужо раніцай на дзвярах я ўбачыў кошт пражывання — 259 канадскіх долараў. Менавіта столькі мы маглі б заплаціць за начлег. Яшчэ ў якасці кампенсацыі за нязручнасці былі выдадзены квіткі-талоны на сняданак і абед. Праўда, з нашымі апетытамі гэтых паперак намінальным коштам 25 долараў хапіла на адзін ранішні заход на шведскі стол па-канадску. Дарэчы, у гэтым быў глыбокі сэнс, бо абедаць тут мы не збіраліся: літаральна за 200 кіламетраў ад Таронта знаходзіцца Ніягарскі водаспад. З улікам таго, што вылет ў Квебек нам быў гарантаваны на вячэрні рэйс, не ўпускаць жа такую ўнікальную магчымасць за плату ў 200 долараў ЗША з кожнага наведаць ўнікальны куток, дзе скідвае свае воды водаспад з канадскага і амерыканскага бакоў, а па дарозе больш дасканала азнаёміцца з Таронта.

На аглядной пляцоўцы вежы «Сі-Эн Тауэр» са шкляной «падлогай» могуць і ногі падкасіцца: да зямлі некалькі соцень метраў.

Праз паўтары гадзіны мы ўжо на платным аўтабане з рускамоўным вадзіцелем і экскурсаводам. Слухаем гіда Ірыну, якая ўжо даўно пакінула межы Санкт-Пецярбурга і салаўём расказвае пра канадскі мегаполіс.

Таронта — гэта цэнтр фінансавага, камерцыйнага і культурнага жыцця краіны. Горад займае 4-е месца па памеры сярод самых буйных гарадоў Паўночнай Амерыкі. Дынамічны вобраз жыцця падкрэсліваецца гарадскім пейзажам — вялікай канцэнтрацыяй хмарачосаў у дзелавой частцы горада.

Для цяперашняга пакалення гараджан Таронта — зручны для жыцця горад з чыстымі і адносна спакойнымі вуліцамі. Тут велізарны выбар магазінаў і забаўляльных устаноў.

На вуліцах сённяшняга Таронта ўспамінаецца, што першым еўрапейцам, які пабываў на тэрыторыі мегаполіса, быў француз Эцьен Бруле. Ён прыйшоў сюды ў 1615 годзе па старажытнай сцяжынцы — яе праклалі індзейцы ад возера Гурон. Пазней па ёй праходзілі англійскія і галандскія гандляры мехам з Нью-Йорка. Дзіўна, але канадцы таксама, як і нашы продкі, ваявалі ў 1812 годзе. Праўда, не супраць Напалеона з яго французскімі войскамі, а з амерыканцамі. Тады прэзідэнтам Злучаных Штатаў быў Томас Джэферсан, выява якога цяпер красуецца на 2-доларавай купюры.

Дык вось Джэферсану, паводле яго слоў, для зававання Канады, як расійскаму генералу Грачову для пакарэння Чачні, «дастаткова было аднаго ваеннага паходу». Але ж канадцы супраціўляліся амерыканцам, у хакеі адбываецца наадварот, з усіх сілаў. Больш за тое: яны атрымалі перамогу на вышынях Квінстона над ракой Ніягара. Хоць войскі ЗША і захапілі, а потым спалілі Йорк (будучы Таронта), але ж брытанскі ваенны флот у рэшце рэшт атрымаў вырашальную перамогу і тым самым зацвердзіў незалежнае становішча Канады ад яе ўплывовага суседа.

Бурнае развіццё Таронта, як і ўся краіна ў цэлым, атрымаў з прыходам у сярэдзіне XIX стагоддзя эмігрантаў з Еўропы.

Безумоўна, што візітная картка Таронта — **вежа «Сі-Эн Тауэр».** Яна выканана з рыфлёнага бетону, узвышаецца на 553 метры і выдатна ўпісваецца ва ўрбаністычны гарадскі пейзаж, як, дарэчы, і крыты стадыён Скайдоум, які знаходзіцца па суседстве. На гэтай арэне рэгулярна збіраюцца 53 тысячы футбольных фанатаў. Між тым вежа «Сі-эн Тауэр» усё яшчэ з'яўляецца самай высокай пабудовай у свеце, якая стаіць без апоры. Аглядная пляцоўка Скайпод і шпіль вежы, які напамінае мінарэт, настолькі высокія, што прарэзваюць дождж-выя воблакі. Вежа, якую пасажыры самалётаў, што прызямляюцца ў міжнародным аэрапорце Таронта, могуць бачыць як на далоні, была пабудавана ў 1976 годзе і як частка праекта па перабудове горада.

Каля залы хакейнай славы.

Сярод мноства іншых славутасцяў мегаполіса можна адзначыць Залу хакейнай славы, якая размешчана ў старадаўняй пабудове пад дахам Банка Манрэаля.

Пэўна, што яшчэ са школьных урокаў мы засвоілі тэму не толькі пра халоднае цячэнне Лабрадор, што на поўначы Канады, але і пра пяць Вялікіх азёраў Канады на чале з возерам Антарыо, якое дало назву аднайменнай правінцыі. Дык вось са шматлікіх вежаў дзелавога цэнтра Таронта адкрываецца від на возера Антарыо, якое нагадвае акіян. Хоць яно і здаецца велізарным, але займае рэдкаспашнае месца сярод усіх пяці Вялікіх азёраў — Верхняга, Гурона, Эры і Мічыгана. Усе разам яны з'яўляюцца найбуйнейшым прыродным рэзервуарам у свеце. Яны нясуць свае воды ў раку Святога Лаўрэнція. У басейне гэтых азёраў пражывае каля паловы насельніцтва Канады і пятая частка жыхароў ЗША. Не дзіўна, што тут сканцэнтраваны гандаль, прамысловасць, камунікацыя і турызм.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
Канада.

(Працяг будзе).

Першародная прыгажосць

Як мы выглядалі тысячы гадоў таму

На Зямлі захаваліся месцы, у якіх спыніўся час. Людзі жывуць там так, як жылі ў каменным веку. Яны палююць, ловяць рыбу, рыхтуюць ежу на вогнішчы, здзяйсняюць рэлігійныя абрады. Ім няма справы да выбараў прэзідэнтаў, падзенняў самалётаў і курсаў акцый. Іх задача — выжыць у гэтым велізарным свеце і не страціць пры гэтым сваіх традыцый.

Дзеці племені гуая і даследчык.

Старая з племені каяпа.

Юнак з племені маяруна.

Паляўнічы з племені ава.

Пара з племені караючы.

Дзеці з племені ашаніка.

Бацька і сын з племені янамамі.

Прадстаўнікі племені ўаарані.

Прадстаўнікі племені янамамі.

Фота lenta.ru.

Светам кіруюць леўшуны?

Па меркаванні супрацоўнікаў аўстрыйскага Нацыянальнага ўніверсітэта, людзі, якія валодаюць левай рукой больш дасканала, могуць апрацоўваць вялікія аб'ёмы інфармацыі хутчэй у параўнанні з праўшунамі.

Навукоўцы высветлілі, што сярод амаатараў камп'ютарных гульняў леўшуны гуляюць лепш за тых, хто гуляе правай, бо хутчэй аналізуюць сітуацыю і рэагуюць на яе больш адэкватна. Такія людзі добра сябе выяўляць у працы вадзіцелямі, пілотамі, і прадстаўнікамі іншых прафесій падобнага кшталту.

Выпускнікі ВНУ, у якіх больш развітая левая рука, зарабляюць на 13—21 працэнт больш, чым іх праварукія аднакашнікі. Аднак, гэтая тэндэнцыя выяўляецца толькі ў дачыненні да мужчын.

Леўшуны часцей, чым праўшуны, становяцца высакакласнымі спецыялістамі (53% супраць 38%). Леўшуноў непрапарцыйна шмат сярод мастакоў, музыкантаў і некаторых катэгорый спартсменаў. У 2004 годзе Ўніверсітэт святога Лаўрына апублікаваў работу, у якой даказвалася, што ўзровень IQ у леўшуноў прыкметна вышэйшы, чым у праўшуноў.

Да ліку знакамітых леўшуноў прылічваюць Аляксандра Македонскага, Мікеланджэла, Бенджаміна Франкліна, Рональда Рэйгана, Джорджа Буша-старэйшага і Біла Клінтана, Фідэля Кастра, Марка Твэна, Джымі Хендрыкса, Пола Макартні, Курта Кабейна, Чарлі Чапліна, Мэрылін Манро, Ісаака Ньютона і Альберта Эйнштэйна, а таксама Біла Гейтса.

Дарэчы, у Старажытным Рыме леўшуна звалі «зло» (sinister), старажытныя германцы называлі іх «няўмекамі», а сярэднявечныя служкі царквы разглядалі леварукасць як дакладную прыкмету схільнасці да вядзьмарства і нярэдка з-за гэтага спальвалі леўшуноў у часы інквізіцыі. На Русі леўшунам забаранялі даваць сведчанні ў судзе — лічылася, што леўшуном быў сам д'ябал.

Паводле даных статыстыкі, колькасць леўшуноў на зямным шары складае ад 2 да 8 працэнтаў, 90—91 працэнт праўшуноў, а астатнія — амбідэкстры, гэта значыць тыя, хто аднолькава валодае аберуч. Леўшуноў больш сярод мужчын, чым сярод жанчын, леўшуны часцей пакутуюць ад пэўных захворванняў, напрыклад, шызафрэніі, і часцей, чым праўшуны, становяцца алкаголікамі. Прычыны падзелу чалавецтва на леўшуноў і праўшуноў дакладна невядомыя.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Расцвітай Чарнобылю

Местное самоуправление · Свая справа · Жыхандоля · Чырвоная змена · Краіна здароўя · Купі лепшае! Тавары. Паслугі. Цэны

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	9200 рублёў на месяц 27600 рублёў на квартал 55200 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8700 рублёў на месяц 26100 рублёў на квартал 52200 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	14700 рублёў на месяц 44100 рублёў на квартал 88200 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	13400 рублёў на месяц 40200 рублёў на квартал 80400 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	7700 рублёў на месяц 23100 рублёў на квартал 46200 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7230 рублёў на месяц 21690 рублёў на квартал 43380 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	10330 рублёў на месяц 30990 рублёў на квартал 61980 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	9760 рублёў на месяц 29280 рублёў на квартал 58560 рублёў на паўгоддзе

POST factum

ДУМКІ МОЖНА БУДЗЕ ПРАЧЫТАЦЬ...

Эксперыменты, праведзеныя ва Ўніверсітэце Карнегі-Мелон, прадэманстравалі, што ў недалёкай будучыні з'явіцца магчымасць літаральна «счытваць» думкі іншага чалавека.

Сутнасць методыкі заключаецца ў наступным. Мозг чалавека правяраюць з дапамогай метаду магнітна-рэзанансная тамаграфіі. Раней у тым жа даследчым цэнтры было даказана, што калі чалавек задумвае розныя словы, то «ўключаюцца» розныя ўчасткі яго мозга — што і адбываецца на тамаграме. На падставе гэтага была распрацавана камп'ютарная мадэль, якая прадэманстравала, што прааналізаваўшы даныя, атрыманыя з тамаграмы, можна вызначыць, якое слова задумаў чалавек у той ці іншы момант.

Як высветлілася, дакладнасць зробленых такім чынам вызначэнняў вельмі высокая. Аўтары даследавання выказалі меркаванне, што, задумваючыся аб простых словах, узгадваючы, напрыклад, яблык, чалавек неўсвядомлена ўспамінае і сітуацыі, у час якіх ён сутыкаўся з яблыкамі — купляў ці бачыў чалавека, які грыз гэту садавіну. Гэта, у сваю чаргу, строга вызначаным чынам актывізуе розныя зоны галаўнога мозга.

ПРЫКМЕТЫ ПРЭЗІДЭНТАЎ

Некаторыя прэзідэнты Злучаных Штатаў былі вядомыя сваімі схільнасцямі да розных забабонаў. На якасць іх работы гэтыя абставіны, мяркуючы па ўсім, не асабліва паўплывалі.



Прэзідэнт **Аўраам Лінкальн** вельмі сур'ёзна ставіўся да прарочых сноў. У часы яго кіравання ў ЗША ішла грамадзянская вайна. Перад пачаткам аднаго з пасяджэнняў сваёй адміністрацыі Лінкальн заявіў, што чакае тэлеграму ад аднаго з генералаў арміі Поўначы, бо толькі што бачыў адпаведны сон. Неўзабаве прыйшла і тэлеграма. Быў, прынамсі, яшчэ адзін сон прэзідэнта, які зафіксаваны ў дзённіках двух яго сяброў. Лінкальну прыснілася, што ён ідзе па калідорах Белага дома, у выніку ён аказваецца ў зале, дзе сабраўся натоўп і стаіць ганаровая варта — ля труны, у якой ляжыць нейкі чалавек. Лінкальн расказваў сваім сябрам, што ў сне ён спытаў салдата, хто ляжыць у труне і атрымаў адказ: «Прэзідэнт. Яго застрэлілі». Неўзабаве, сапраўды, прэзідэнт Лінкальн будзе застрэлены ў тэатры.

Прэзідэнт **МакКінлі** меў іншую асаблівасць: ён пастаянна насіў у пятліцы сюртука чырвоную гваздзіку, якая, як ён быў перакананы, прыносіла шчасце. Калі МакКінлі хацеў падзяліцца шчасцем з кімнебудзь, ён даставаў гэтую гваздзіку і дарыў яе чалавеку. Вядома такая гісторыя. Аднойчы прэзідэнт прымаў у Белым доме двух хлопчыкаў. Аднаму з іх ён падарыў сваю гваздзіку. Каб не расстроіўся другі, МакКінлі ўзяў чырвоную гваздзіку з вазы ў кабінеце, уткнуў яе ў пятліцу, каб «набралася» шчасця, і ўручыў наведвальніку. У 1901 годзе прэзідэнт наведаў горад Буфала (штат Нью-Йорк), каб узяць удзел у адкрыцці Панамерыканскай выставы. МакКінлі разам са світай ішоў скрозь натоўп. Абменьваючыся з навакольнымі ўсмешкамі, фразамі, поціскамі рук, сваю знакамітую гваздзіку ён падарыў нейкай дзяўчыне. А праз некалькі хвілін да прэзідэнта наблізіўся малады чалавек, выхапіў рэвальвер і расстраляў МакКінлі.

Франклін Рузвельт праславіўся сваёй бояззю лічбы 13. Ён ніколі не наведваў мерапрыемстваў, якія праводзіліся на 13-м паверсе будынкаў, і, калі да яго на прыём ці на абед прыходзіла 13 чалавек, тэрмінова выклікаў каго-небудзь з супрацоўнікаў, каб колькасць людзей у кабінеце была іншая. Ён ніколі не накіроўваўся ў паездку па краіне ці з візітам за мяжу 13-га чысла. Цікава, што Рузвельт меў усе шанцы пайсці з жыцця 13-га — ён памёр за некалькі хвілін да наступлення 13 красавіка 1945 года. Аналагічную фобію, дарэчы, меў і адзін з папярэднікаў Ф. Рузвельта, прэзідэнт Герберт Гувер.



Прэзідэнт **Рональд Рэйган** пастаянна насіў у кішэнях «шчаслівыя» манеткі; стукаў па дрэве, каб чаго-небудзь не сурочыць; а калі прасыпаў соль — то перакідваў жменьку цераз левае плячо. Акрамя таго, усё жыццё Рэйган карыстаўся гараскопамі, якія публікавалі газеты, і нават рабочы графік прэзідэнта складаўся ў адпаведнасці з прагнозамі астролага, якога знайшла жонка прэзідэнта Нэнсі Рэйган. Яна таксама падбірала і даты падпісання важных міжнародных дагавораў.

Дарэчы, прэзідэнт і яго жонка лічылі, што Рэйган ледзь не стаў ахвярай «пракляцця Тэкумсе», яго яшчэ называюць «пракляццем нулявога года». Такім чынам спрабуюць растлумачыць дзіўную заканамернасць: у перыяд з 1840 па 1960 год кожны прэзідэнт, які выйграваў выбары ў год, што заканчваецца на лічбу 0, паміраў на сваёй пасадзе або быў застрэлены. Пракляцце (калі лічыць яго рэальнасцю) забіла чацвярых прэзідэнтаў ЗША, у тым ліку МакКінлі і Кенэдзі. Згодна з паданнем, пракляцце на амерыканскіх прэзідэнтаў наклаў легендарны правадыр індзейцаў Тэкумсе, калі яго войска было разбіта генералам Харысанам. Першай ахвярай стаў менавіта Харысан, які быў абраны прэзідэнтам у 1840 годзе, але праз месяц пасля інаўгурацыі, у студзені 1841 года, нечакана памёр. Р. Рэйган быў абраны на пасаду прэзідэнта ЗША ў 1980 годзе і, значыць, яго таксама чакаў незайздросны лёс. Смерці яму ўдалося ўсё ж пазбегнуць, аднак у 1981 годзе ён пражыў спробу замаху, калі быў цяжка паранены.

КЕНІЙСКАГА ШКОЛЬНІКА АДПРАВІЛІ... У ДОМ САСТАРЭЛЫХ

Самы стары кенійскі школьнік, 88-гадовы Кімані Нганга Маруге, вымушаны быў пакінуць парту і адправіцца ў дом састарэлых, перадае Бі-бі-сі.

З 2004 года Маруге лічыцца ў Кнізе рэкордаў Гінэса як самы стары вучань у свеце. Школьную форму стары надзеў пасля таго, як кенійскі ўрад увёў палітыку бясплатнай адукацыі ў краіне. Паводле слоў Джэйн Абінчу, дырэктара пачатковай школы ў горадзе Элдарэт, у якой вучыўся састарэлы кенієц, дзядуля быў руплівым вучнем і ніколі не прапускаў заняткаў. Тым не менш пасля прэзідэнцкіх выбараў, якія адбыліся ў снежні мінулага года і якія выклікалі грамадскія хваляванні ў краіне, быў спалены дом Маруге, і Чырвоны Крыж пастанавіў, што старому патрэбен догляд спецыялістаў у доме для састарэлых.

Дырэктар жа школы лічыць, што рашэнне Чырвонага Крыжа было непрадуманым. «Ён — чалавек, вядомы ва ўсім свеце. Яму вельмі падабалася вучыцца, і я сумняваюся, што ён згодзен перапыніць сваю вучобу», — кажа Джэйн.

На боку Маруге і мясцовая асацыяцыя бацькоў і настаўнікаў. Яе прэзідэнт, пачуўшы аб інцыдэнце, зрабіў званок у міністэрства адукацыі Кеніі, паведаміўшы, што дзякуючы старому ў апошнія гады колькасць ахвотнікаў вучыцца ў яго школе вельмі ўзрасла. Так, па прыкладзе пенсіянера, двое яго дзяцей вырашылі таксама наведваць вучэбную ўстанову, каб пасля атрымаць дыпломы ветэрынараў.

АКЦЫЯ НУДЫСТАЎ ПРАВАЛІЛАСЯ З-ЗА ХАЛОДНАГА НАДВОР'Я

Парыжскія веласіпедысты, якія планавалі ў мінулую суботу праехаць голымі па вуліцах горада ў знак пратэсту супраць аўтамабілістаў, у выніку вымушаны былі правесці акцыю апранутымі, перадае РІА «Навіны».

Каля двухсот веласіпедыстаў сабраліся ў садзе Рэй, аднак з-за халоднага надвор'я і паліцэйскага ачаплення распрануцца пабаяліся. Гэта рызыкнулі зрабіць толькі тры чалавекі, якія былі аператыўна затрыманы. У паліцыі ім растлумачылі, што Крымінальны кодэкс забараняе «публічнае агаленне ў месцах, дзе яно даступна вачам грамадскасці».

Праз паўгадзіны пасля пачатку акцыі апранутыя веланудысты ў суправаджэнні паліцыі прайшлі да Люксембургскага саду, дзе маніфестацыя мірна скончылася. Між тым у Мадрыдзе, Барселоне і Сарагосе некалькім сотням веласіпедыстаў распрануцца ўсё ж атрымалася. У суботу яны праехалі па вуліцах, каб падтрымаць экалагічны транспарт і спыніць засілле аўтамабіляў, адзначае агенцтва France Presse. Удзельнікі руху веланудыстаў сцвярджаюць, што «адчуваюць сябе голымі» ў гарадскім аўтамабільным патоку.

Кансультацыя натарыуса

ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ, СКЛАДАЮЧЫ ЗАВЯШЧАННЕ?

Па дамоўленасці з першай Мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторай «Звязда» распачынае новы праект — рубрыку, у якой мы будзем кансультаваць нашых чытачоў адносна ажыццяўлення тых ці іншых натарыяльных дзеянняў. Калі ў чытачоў будуць узнікаць нейкія ўласныя пытанні па гэтай тэме, спецыялісты таксама будуць даваць на іх адказы на старонках нашай газеты.

А распачаць мы вырашылі з пытанняў, звязаных з завяшчаннем. Як яго правільна скласці? Што і каму можна завяшчаць? Ці можна адмяніць уласнае завяшчанне і як гэта робіцца? Хто павінен засведчыць завяшчанне? На гэтыя і іншыя пытанні сёння адкажа намеснік загадчыка першай Мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторы Галіна ІВАННІКАВА.

Толькі пісьмовая форма і засведчанне дакумента

Першае, што трэба памятаць, — завяшчанне, незалежна ад таго, у якіх абставінах яно здзяйсняецца, якой маёмасці датычыцца, павінна быць складзена ў пісьмовай форме і засведчана **натарыусам**.

Засведчыць завяшчанне маюць права таксама іншыя службовыя асобы, якія ажыццяўляюць натарыяльныя дзеянні: **упаўнаважныя службовыя асобы** мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, **дыпламатычныя агенты** дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь і **консульскія службовыя асобы** консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь.

Акрамя таго, да натарыяльна засведчаных завяшчанняў прыраўноўваюцца наступныя завяшчанні:

— грамадзян, якія знаходзяцца на лячэнні ў бальніцах, шпіталях, іншых стацыянарных лячэбных установах ці якія пражываюць у дамах для састарэлых і інвалідаў, засведчаныя **галоўнымі ўрачамі**, іх намеснікамі па медыцынскай частцы ці **дзяжурнымі ўрачамі** гэтых бальніц, шпіталяў і іншых лячэбных устаноў, а таксама **начальнікамі** шпіталяў, **дырэктарамі** ці галоўнымі ўрачамі дамоў для састарэлых і інвалідаў;

— грамадзян, што знаходзяцца падчас плавання на суднах, якія ходзяць пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь, засведчаныя **капітанамі** гэтых суднаў;

— грамадзян, якія знаходзяцца ў разведачных, арктычных ці іншых падобных экспедыцыях, засведчаных **начальнікамі** гэтых **экспедыцый**;

— ваеннаслужачых у пунктах дыслакацыі вайсковых часцей, дзе няма натарыусаў, а таксама завяшчанні працуючых у гэтых часцях цывільных асобаў, членаў іх сем'яў і членаў сем'яў ваеннаслужачых, засведчаных **камандзірамі** гэтых часцей;

— асобаў, якія знаходзяцца ва ўстановах, што выконваюць пакаранне ў выглядзе арышту, абмежавання волі, пазбаўлення волі, пажыццёвага заключэння, ці месцах утрымання пад вартай, засведчаных **начальнікамі** адпаведных устаноў, што выконваюць пакаранне, ці **кіраўнікамі адміністрацый** месцаў утрымання пад вартай.

У дачыненні да грашовых сродкаў па ўкладах і рахунках у банку сілу натарыяльна засведчанага завяшчання мае завяшчальнае распараджэнне, засведчанае **служачым** гэтага **банка**.

Незахаванне правілаў адносна пісьмовай формы завяшчання і яго засведчання ўпаўнаважанымі на тое законам асобамі цягне несапраўднасць завяшчання.

Або ўласнаручна, або са слоў пры сведках — натарыусам

Пры складанні дакумента натарыяльна засведчанае завяшчанне можа быць або напісана завяшчальнікам (уласнаручна), або запісана натарыусам са слоў завяшчальніка **ў прысутнасці сведкі** (могуць быць выкарыстаны агульнапрынятыя тэхнічныя сродкі: камп'ютар, друкавальная машынка).

Калі завяшчанне са слоў завяшчальніка запісвае натарыус, дык яно да яго падпісання павінна быць цалкам прачытана завяшчальнікам у прысутнасці натарыуса і сведкі. Калі завяшчальнік з-за фізічных недахопаў, хваробы ці непісьменнасці не ў стане асабіста прачытаць завяшчанне, яго тэкс агучваецца для яго сведкам у прысутнасці натарыуса. Калі ж завяшчальнік па вышэй указаных прычынах не можа таксама падпісаць завяшчанне, яно па яго просьбе можа быць падпісана іншым грамадзянінам з абавязковым указаннем у завяшчанні прычын, з-за якіх завяшчальнік не мог падпісаць завяшчанне ўласнаручна.

Акрамя таго, па жаданні завяшчальніка натарыус можа засведчыць закрытае завяшчанне, г.зн. завяшчанне засведчваецца без азнаямлення з яго зместам. Абавязковым патрабаваннем да такога завяшчання з'яўляецца яго ўласнаручнае напісанне і падпісанне завяшчальнікам. Закрытае завяшчанне перадаецца натарыусу ў запячатаным канверце ў прысутнасці **двух сведак**, якія ставяць на канверце свае подпісы.

Асабліва варта звярнуць увагу грамадзян на тое, што ў выпадках, калі пры складанні, падпісанні ці засведчанні завяшчання павінны прысутнічаць сведкі, не могуць быць такімі сведкамі, а таксама не могуць падпісваць завяшчанне замест завяшчальніка наступныя асобы:

1. натарыус ці іншая асоба, якая сведчыць завяшчанне;

2. асоба, на карысць якой складзена завяшчанне ці зроблена завяшчальная адмова, муж (жонка) такой асобы, яе дзеці, бацькі, унукі і праўнукі, а таксама іншыя спадчыннікі паводле завяшчання і паводле закона;

3. грамадзяне, якія не маюць поўнай дзеяздольнасці;

4. непісьменныя;

5. асобы, што маюць судзімасць за дачу лжывых паказанняў;

6. грамадзяне з такімі фізічнымі недахопамі, якія не дазваляюць ім у поўнай меры ўсвядоміць сутнасць таго, што адбываецца;

7. асобы, якія не валодаюць у дастатковай ступені мовай, за выключэннем выпадкаў, калі натарыусам прымаецца закрытае завяшчанне.

Завяшчанне (акрамя закрытага) складаецца ў двух аднолькавых экзэмплярах, адзін з якіх застаецца завяшчальніку, другі — захоўваецца у справах натарыяльнай канторы.

Завяшчаць можна і будучую маёмасць. Але толькі асабіста

Завяшчальнік мае права ў любы час адмяніць зробленае ім завяшчанне ў цэлым або змяніць яго шляхам адмены, змянення ці дапаўнення асобных завяшчальных распараджэнняў, што ўтрымліваюцца ў ім, зрабіўшы новае завяшчанне. Завяшчанне можна адмяніць і не робячы новае завяшчанне. У гэтым выпадку зніжаюцца **ўсе** экзэмпляры завяшчання, уключаючы і той, які захоўваецца ў натарыуса.

Адначасова неабходна памятаць, што завяшчальнік вольны ў выбары асобаў, якім пяройдзе маёмасць пасля яго смерці. Пры гэтым ён можа скласці завяшчанне на карысць асобаў, якія як уваходзяць у кола спадчыннікаў па закону, так і не ўваходзяць у яго.

Прадметам завяшчання могуць быць рэчы, іншая маёмасць, у тым ліку маёмасныя правы і абавязкі. Завяшчальнік можа нават скласці завяшчанне ў дачыненні да маёмасці, якую ён можа набыць у будучым. Аднак такая маёмасць будзе з'яўляцца прадметам спадчыннасці толькі ў тым выпадку, калі да моманту адкрыцця спадчыны яна будзе належаць спадчынніку на праве ўласнасці.

Завяшчанне павінна быць зроблена асабіста. Складанне завяшчання праз прадстаўніка (па даверанасці) не дапускаецца. Завяшчанне можа ўтрымліваць распараджэнне толькі адной асобы. Складанне завяшчання некалькімі асобамі забараняецца.

Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.

Інфарм-укол

Што такое фітнэс?

Фітнэс — гэта не асобны від спорту, а сукупнасць мерапрыемстваў, перш-наперш, гаворка ідзе пра фізічныя нагрузкі, неабходныя для падтрымкі добрага функцыянальнага стану арганізма. Той, хто толькі далучыўся да фітнэсу, павінен рабіць гэта паводле некаторых правілаў.

1. **Размінка**. Яна павінна займаць не менш за 10 хвілін і складацца з агульных практыкаванняў, якія разагрэюць мышцы, і практыкаванняў на расцягванне. У асноўным варта памятаць, што больш карысна выканаць два розныя практыкаванні за меншы час, чым працягны час рабіць адно і тое ж.

2. **Нагрузкі**. Нельга імкліва нарошчваць нагрузкі, паколькі гэта можа істотна падарваць здароўе. Для таго, каб арганізм «уцягнуўся» ў новы від дзейнасці, патрабуецца шмат часу.

3. **Рэгулярнасць**. Заняткі павінны быць досыць частымі, а не ад выпадку да выпадку. Для ўстанаўлення правільных суадносінаў паміж нагрузкамі і ежай, якая паступае ў арганізм на працягу дня, рэкамендуецца наступны падыход: на працягу 7—10 дзён за кошт спецыяльных нагрузак аэробнага характару пры частаце пульсу 120—140 удараў у хвіліну чалавек павінен «спальваць» адзін свой сутачны рацыён. Такім чынам, для дзяўчыны, якая важыць 50 кг і ўжывае 1,5 тысячы калорый у дзень, і для мужчыны, які важыць 100 кг і атрымлівае 3 тысячы калорый, нагрузка будзе рознай і па часе, і па інтэнсіўнасці.

4. **Шкодныя звычкі**. Фізічныя нагрузкі не сумяшчальныя ні з курэннем, ні з ужываннем алкаголю. Ні ў якім разе нельга займацца фітнэсам на наступны дзень пасля злоўжывання алкаголем! Гэта можа справакаваць гіпертанічны крыз.

5. **Самаконтроль**. Калі пасля заняткаў вы захоўваеце добры апетыт, лёгка засынаеце і прачынаецеся, у вас спакойны і якасны сон, добры настрой і самаадчуванне, значыць нагрузкі пайшлі на карысць. У адваротным выпадку неабходна перагледзець нагрузкі.

6. **Рацыён**. У першую чаргу неабходна адмовіцца ад позніх прыёмаў ежы, есці трэба за 3—4 гадзіны да сну. Абавязкова трэба адмовіцца ад простых вуглеводаў — цукерак, глазураваных сыркоў і г.д. Гэта — нездаровае харчаванне. Рэкамендуецца ўстрымацца ад ежы на працягу 2 гадзін пасля заняткаў. Ні ў якім разе нельга адмаўляцца ад ежы ці пераходзіць на вегетарыянскую дыету. Арганізму патрэбны бялок — мяса птушкі і рыба.

Што такое метабалічны сіндром?

Метабалічны сіндром — гэта сукупнасць некалькіх фактараў, звязаных з абменам рэчываў у арганізме. Паводле міжнародных рэкамендацый, урач мае права паставіць такі дыягназ, калі ў пацыента ёсць па меншай меры, тры наступныя сімптомы:

- аб'ём таліі звыш 88 см у жанчын ці 102 см у мужчын
- артэрыяльны ціск звыш 130/85 мм рт слупка
- цукар крыві нашча звыш 6,1 ммоль/л
- павышэнне ўзроўню трыгліцэрыдаў крыві звыш 1,7 ммоль/л
- зніжэнне ўзроўню ліпапратэідаў высокай шчыльнасці звыш 1 ммоль/л у мужчын і звыш 1,3 ммоль/л у жанчын.

Інфаркт міякарда, інсульт — гэта канчатковы этап развіцця парушэння метабалізму. Пачатковыя этапы развіцця атэрасклерозу на фоне парушэння абмену рэчываў адбываюцца за некалькі дзесяткаў гадоў да канчатковых кропак.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

Кінакрокі

Не баіцца чорнага ката

Той, хто прыйдзе на прэм'еру новай беларускай камедыі «На спіне ў чорнага ката». Яна будзе ўрачыста прадстаўлена гледачу 11 чэрвеня ў Доме кіно, але першымі ўсё-такі яе пабачылі жыхары Гомельшчыны, як найбольш зацікаўленыя — у Петрыкаўскім раёне праходзілі здымкі, якія вельмі цікавілі людзей. Цяпер цікавіць тое, што атрымалася.

Іван Паўлаў, які выступіў рэжысёрам гэтага фільма, не баіцца адказваць перад айчыннымі гледачамі — ён ужо вядомы па стужцы «Свежына з салютам», а таксама па сумесных працах з Маргарытай Касымавай. Але яго новая кінастужка спачатку прайшла тэст на фестывальнай публіцы — карціна дэманстравалася ў рамках украінскага фестывалю «Залаты Брыг».

Вынік — дзве намінацыі і дыплом «За захаванне нацыянальных традыцый у кіно».

Аўтарам сцэнарыя фільма «На спіне ў чорнага ката» стаў Ігар Тароцька.

На экране можна будзе пазнаць знакамітых артыстаў беларускіх тэатраў, якія здымаліся ў фільме — народная артыстка краіны Вольга Клебановіч, Аляксандр Дзянісаў, Вера Кавалерава, Алеся Пухавая, Аляксандр Яфрэмаў. Праўда, галоўнага героя дзеда Лёху іграў заслужаны артыст Расіі Міхаіл Жыгалаў, а ролю дзеда Сані выконваў народны артыст Расіі Валерый Прохараў, якога, на жаль, мы не ўбачым на прадстаўленні творчай групы — яго ўжо няма сярод жывых.

Увагуле на прэм'еру будзе цяжка прыехаць тым удзельнікам творчай групы, якія ўжо працуюць над іншай стужкай пад назвай «Цень самурая».

Выканаўцам эпізадычнай ролі стаў нават Філіп Кіркараў — цікава, як з'яўленне на экране расійскай мега-поп-зоркі сустрэне беларуская публіка? Зрэшты, каму-каму, а яму ніякі чорны кот дакладна не можа перашкодзіць...

Ларыса ЦІМОШЫК.

ФОНД ПРАЦЯГВАЕ ДАПАМАГАЦЬ КОЛІШНІМ АХВЯРАМ НАЦЫЗМУ

14 чэрвеня спаўняецца 15 гадоў Беларускаму рэспубліканскаму фонду «Узаемаразуменне і прымірэнне». Менавіта ў гэты дзень у 1993 годзе была прынятая пастанова Савета Міністраў аб заснаванні фонду. Якім быў мінулы тэрмін, спыталі мы ў старшыні праўлення Валянціна Герасімава (на здымку).

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Калі азірнуцца назад, мы — супрацоўнікі фонду, — можам смела сказаць, што 15 гадоў, якія прайшлі, былі гадамі напружанай інтэлектуальнай працы, выпрабавання на трывалась, вытрымку, духоўную і фізічную вынослівасць.

Пачынаць працу давялося, вобразна кажучы, з «нуля», не маючы ніякай нарматыўна-прававой базы. Але, улічваючы вопыт працы польскага і французскага фондаў, пры пастаяннай дапамозе і падтрымцы Савета Міністраў, міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, замежных спраў, архіваў, КДБ, аблвыканкамаў, гарадскіх і раённых органаў выканаўчай улады, сумесна з калектывамі ААТ «Пріорбанк» і 133 філіяламі ААТ ААБ «Беларусбанк» фонд якасна і ў тэрмін выканаў пастаўленыя задачы па выплаце фінансавай дапамогі з транша 1993 года.

Правільным і разумным з'явілася і тое, што германскія дзяржава і эканоміка ўзялі на сябе абавязацельства выказаць прызнанне пакутаў ахвяраў нацызму ў новай матэрыяльнай форме. Таму заснаванне ў 2000 годзе германскага фонду «Памяць, адказнасць і будучыня» мела надзвычай высокае маральнае і палітычнае значэнне.

Увагу сусветнай грамадскасці прыцягнула заява колішняга федэральнага прэзідэнта Германіі Йоханаса Рау ад 17 снежня 1999 года, у якім ён не проста выказаў сваю палёгку і ўдзячнасць у сувязі з тым, што нарэшце пасля заканчэння Другой сусветнай вайны былі прыняты агульныя намаганні па выплаце кампенсацый ахвярам нацызму. Ад імя нямецкага народа ён папрасіў прабачэння. Гэта было важным для ўсёй сусветнай супольнасці, але асабліва — для ахвяраў нацызму.

Пачынаючы з 2000 года, для фонду распачаўся новы этап дзейнасці. Калі па траншу 1993 года фонд выплаціў дапамогу 147 336 чалавекам (сярэдні памер выплат склаў у Рэспубліцы Беларусь 1204 нямецкія маркі, у Эстоніі — 1140 марак), дык па траншу 2000 года кампенсацыйныя выплаты атрымалі 128 332 чалавекі (сярэдні памер выплат у Рэспубліцы Беларусь склаў 2 696 еўра, у Эстоніі — 2 278 еўра). Наш фонд адным з першых завяршыў выплаты. Усе паказчыкі, што прагназаваліся, пацвердзіліся.

Супрацоўнікамі фонду была створана ўнікальная база даных, якая налічвае больш за 175 тысяч колішніх вязняў нацызму, у тым ліку амаль 10 тысяч — якія пражываюць у Эстоніі. Вялікая праца была зроблена з Аўстрыйскім і Швейцарскім фондамі, з асобамі цыганскай нацыянальнасці, якія хаваліся на акупаванай тэрыторыі ад нацыстаў, з добрачынными арганізацыямі імя Максіміліяна Колбе, Клаймс Канферэнц, Евангелісцкай царквой і іншымі. На працягу ўсяго гэтага часу дзейнасць фонду была адкрытай і празрыстай, яна атрымала ўдзячнасць, узняла аўтарытэт фонду.

...Мінчанка Лідзія Аляксандраўна Буйневіч (дзявочае прозвішча Лаская) нарадзілася ў Віцебску ў 1935 годзе. Узрост дазваляў шмат чаго запомніць, таму, прыгадваючы тыя далёкія падзеі, голас маёй суразмоўцы заўважна дрыжэў...

Па траншу 1993 года фонд выплаціў дапамогу 147 336 чалавекам (сярэдні памер выплат склаў у Рэспубліцы Беларусь 1204 нямецкія маркі, у Эстоніі — 1140 марак), а па траншу 2000 года кампенсацыйныя выплаты атрымалі 128 332 чалавекі (сярэдні памер выплат у Рэспубліцы Беларусь склаў 2 696 еўра, у Эстоніі — 2 278 еўра).

— Мой бацька быў чыгуначнікам, яго не мабілізавалі, ён займаўся эвакуацыяй. Калі немцы занялі горад, усё навокал гарэла, мы з маці вельмі баяліся, што бацька не знойдзецца... Потым немцы прымусілі бацьку вярнуцца на чыгунку — ім былі патрэбны спецыялісты. Жылі мы ў бараку на шмат сем'яў. Калі мне было 8 гадоў, усю нашу сям'ю выгналі напачатку ў Германію, потым — у Аўстрыю. Я памятаю, як бацькоў кожную раніцу выганялі з лагера на нейкія работы, здаецца, земляныя, а мы, дзеці, кожны раз кідаліся да іх, бо думалі, што бачым бацькоў у апошні раз... Мне было 10 гадоў, калі нас вызвалілі. Пазней, калі давялося збіраць патрэбныя дакументы, я была вельмі здзіўленая, калі з Віцебскага архіва даслалі даныя пра нашай сям'і. Пры вяртанні людзей апытвалі супрацоўнікі НКУС. Як потым мне гаварылі бацькі, людзі палохаліся гэтых допытаў. Мужчынам майго ўзросту потым прыйшлося вельмі няпроста ў жыцці з-за таго, што іх некалі выганялі...

Генадзю Сямёнавічу Зубаву я патэлефанаваў літаральна на наступны дзень, як ён адсвяткаваў сваё 68-годдзе. Ён дагэтуль працуе, жартуе, што «пакуль не гоняць». У яго лёсе, як мне здалося, было і ёсць шмат выпадковасцяў (або не?), якія можна назваць своеасаблівымі гістарычнымі і асабістымі парадоксамі.

Ён нарадзіўся ў 1940 годзе ў вёсцы Кашалёва (вялікая сям'я жыла ў іншай вёсцы — Зарэчча) Буда-Кашалёўскага раёна. А цяпер ён, кіраўнік праекта ў праектай арганізацыі, ездзіць у камандзіроўкі з Мінска ў... Буда-Кашалёўскі раён: укараняе энергазберагальныя тэхналогіі (як цеплатэхнік-інжынер) у кацельнях, школах, дзіцячых садках. Калі атрымліваецца, наведвае малую Радзіму, хоць там ужо нікога з родных і не засталося...

Тры гады Генадзь Сямёнавіч адпрацаваў некалі ў Германіі — у тамтэйшай Групе савецкіх войскаў. Кажа, што было нейкае адчуванне, што ўсё навокал даволі знаёмае, нешта нагадвае. Хоць калісьці быў выгнаны не ў Германію, а ў Аўстрыю. Але домікі навокал былі такімі падобнымі...

— Адносна нядаўна давялося быць у Славакіі. Ад яе да Вены — усяго нічога. Было жаданне махнуць туды, але не было візы — ужо былі іншыя часы, — кажа суразмоўца.

Генадзь Сямёнавіч быў першым дзіцем у сям'і. Яго маці закончыла Гомельскае медвучылішча, бацька — настаўніцкі тэхнікум. Пасля размеркавання сустрэліся, праз нейкі час узялі шлюб. Бацьку з пачаткам вайны забралі на фронт. У першы ж год пад Калініным ён быў паранены, да самай Перамогі правёў час у шматлікіх шпіталях. А яго жонку з сынам выгналі ў Аўстрыю ў 1943 годзе.

— Хадзілі па вёсках, бралі, хто трапляўся пад руку. Трапіла маці са мной... Здаецца, гэта была ўскраіна самой Вены, чысценькія дворыкі навокал, баракі для вязняў, нейкая друкарня, дзе працавала маці — яе выкарыстоўвалі і як медыка. Галадуха, самі месцічы ўжо жылі эканомна. А яшчэ холад, які дагэтуль праследуе мяне. Што яшчэ магла запомніць дзіцячая памяць?..

І Лідзія Аляксандраўна і Генадзь Сямёнавіч, як і многія іншыя колішнія вязні нацызму, удзячныя Беларускаму рэспубліканскаму фонду «Узаемаразуменне і прымірэнне» за тую дапамогу, якую той ім аказвае і цяпер.

— Я імкнуся быць ненавязлівай, але ў канцы красавіка хвароба так «прыціснула», што я мусіла звярнуцца па дапамогу да Валянціна Ахаўлевіча Герасімава. Ён паставіўся да майго звароту вельмі добразычліва і адразу прадаставіў пуцёўку ў шпіталь, — кажа Лідзія Аляксандраўна. — Пры фондзе цудоўная аптэка. Вы ж ведаеце, што ў нас няма льготаў, таму яна для нас вельмі патрэбная. Там і акуляры па заказах бясплатна выбраляюць, і ўрач адпаведны працуе.

Да слова, маю суразмоўцу можна без перабольшання назваць добраахвотным памочнікам фонду на грамадскіх пачатках. У сваім Заводскім раёне сталіцы, пасля выхаду на пенсію, яна ўшчыльную занялася справамі мясцовых колішніх вязняў — яшчэ калі людзі афармлялі дакументы на атрыманне першай кампенсацыі ў выглядзе марак.

Генадзь Сямёнавіч таксама адразу прыгадаў, што атрымліваў ад фонду пояс ад радыкуліту, прыстасаванне для масажу, апарат для вымярэння ціску, лекі. Бо яны, як і многія іншыя колішнія вязні, ахвяры нацызму, трапілі пад дзеянне шэрагу гуманітарных праектаў, якія фонд ажыццяўляе сумесна з нямецкім бокам. На сёння такіх праектаў 12.

Пяць з іх звязаны са шпіталямі для інвалідаў вайны і шпіталем Міністэрства абароны — па медыцынскім абследаванні і лячэнні колішніх ахвяраў нацызму. У шпіталі ў п. Юрцава Віцебскай вобласці ўжо такім чынам прайшлі лячэнне 398 чалавек, у Гомелі — 588, у Магілёве — 1693, у Бараўлянах — 4197, у шпіталі Мінабароны ў Мінску — 582 чалавекі. Дзякуючы праекту «Індывідуальнае сацыяльнае і медыцынскае абслугоўванне колішніх ахвяраў нацызму ў рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы» прайшлі рэабілітацыю 233 чалавекі. Акуляры па яшчэ адным праекце атрымалі больш за 10 тысяч чалавек, медыкаменты па іншым — 14 715 чалавек. Дзякуючы праекту «Аздараўленчая рэабілітацыя колішніх ахвяраў нацызму, якія пражываюць у Эстоніі», прайшлі рэабілітацыю 1633 чалавекі. Адрасную медыцынскую дапамогу атрымалі таксама 749 колішніх савецкіх ваеннапалонных, 972 анкалагічныя хворыя, 1593 чалавекі, што пражываюць на радыеактыўнай, забруджанай пасля Чарнобыльскай катастрофы тэрыторыі (усе — ахвяры нацызму).

Назапашаныя банкаўскія працэнты таксама аддаваліся на патрэбы пацярпелым ад пажараў і паводак, дапамогу колішнім вязням, якія пражываюць у зонах забруджвання радыенуклідамі (амаль 19 тысяч чалавек) пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, дзецям — сіротам Вялікай Айчыннай вайны (больш за 5 тысяч чалавек) і гэтак далей.

— Валянцін Якаўлевіч, вы і вашы калегі, супрацоўнікі фонду задаволены вынікамі працы?

— Гады працы былі няпростымі, але задавальненне ад зробленага ёсць. Гэта радуе і нас, і навакольных: фонд ведаюць, яму вераць, на яго спадзяюцца. Карыстаючыся выпадкам, ад імя Апякунскага савета і праўлення фонду шчыра віншую ўсіх, хто дапамагаў фонду, хто ўнёс свой уклад у міласэрную справу аказання дапамогі пацярпелым ад нацызму з 15-годдзем Беларускага рэспубліканскага фонду «Узаемаразуменне і прымірэнне». Зычу ўсім добрыні, шчасця, здароўя, новых поспехаў у імя квітнеючай роднай Беларусі!

Сяргей РАСОЛЬКА.

Памяць

Рамантызм па-сучаснаму

Помнік мастаку Валенцію Ваньковічу з'явіцца непадалёк ад Дома-музея Ваньковічаў

Род Ваньковічаў даў шмат вядомых асобаў, але больш шануюць у Беларусі менавіта мастака, які пісаў Міцкевіча, паехаў пакараць Парыж і пахаваны там. Нам засталася памяць пра яго — будынак дома, які належаў знаному роду, а цяпер у ім месціцца філіял Нацыянальнага мастацкага музея.

Цяпер імкнуцца вярнуць дому былую рамантычнасць, узводзячы флігель, які некалі быў побач з домам. Пра гэта сведчаць былыя фотаздымкі, мастацкія творы, дакументы. Таксама побач з'явіцца аранжарэя. Рамантызм — рэч прыемная, дазволіць уявіць асаблівасці эпохі, у якую жыў Валенцій Ваньковіч. Але рамантызм сёння трэба і ўмець стварыць — ужо надта ў не рамантычны час мы жывём, у іншых дамах — з бетону і іншых цяжкіх матэрыялаў, да якіх прызвычаіліся. Ці будзе адчувацца ў новапабудаваным флігелі былая лёгкасць канструкцый, якая дазваляе адчуць рамантычную прыгажосць? Паглядзець можна будзе ўвосень.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Спорт-тайм

Косця Цзю пакідае рынг

Расіянін Канстанцін Цзю, былы абсалютны чэмпіён свету па боксе ў першай паўсярэдняй вазе, аб'явіў аб жаданні завяршыць сваю кар'еру. Нагадаем, што апошні яго бой адбыўся тры гады таму. У Манчэстары Цзю прайграў тэхнічным накаўтам брытанцу Рыкі Хатану. Спартсмен паведаміў, што пасля таго, як пакінуў рынг, ён хоча заняцца развіццём сваіх акадэмій бокса. «Праз некалькі месяцаў мне ўжо 39 гадоў, — заўважыў ён, — а гэта ўжо крытычны ўзрост для спартсмена. Фізічна я адчуваю сябе выдатна, але трэба разумець, што боксу я ўжо аддаў 30 гадоў свайго жыцця».

КІРМАШ

штотыднёвы рэкламны выпуск №16 (584)

аддзел рэкламы 287-17-79

Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

■ Дом 6х15 з гаспадарчымі прыбудовамі (можна на знос), выдатны будматэрыял. Капыльскі р-н.
Тэл.: 8 (01561) 97 3 16, 8 0293 21 62 34.

■ Індыкатар-сігналізатар узроўню радыяцыі. Паведамляе святлом, гукам. Кішэнны.
Тэл.: 8 029 935 75 15.

■ ВАЗ-2107, 1985 г.в., 1,4 б, сіні, у добрым стане, 900 у.а.
Тэл.: 8 017 70 5 15 59, 8 029 272 92 45.

■ Брус абразны, цэгла, батарэі, адлівы, вокны, кухня «Вясна», газ. пліта, кіслародны балон.
Тэл. 8 01717 34 653.

■ Рухавік Д-37 да трактара Т-40 у рабочым стане.
Тэл. 8 029 772 73 37.

■ Аўташыны «Матадор» 4 шт., у Мінску.
Тэл. 8 029 873 47 07.

■ Опель-Зафіра (7 месцаў), 1999 г.в., дыз. паліва 2.0. Серабрысты металік.
Тэл. 8 029 772 73 37.

■ Зруб 6х4 новы, чысты вугал, крыты шыферам, усе матэрыялы. Шумілінскі р-н, самавываз.
Тэл. 8 029 818 45 11.

■ Карова, узрост — 10 гадоў, малочная.
Тэл.: 8 017 508 74 36, 8 029 875 11 28.

■ Дом (3 пакоі 53 м2), лазня, сад з агародам — 0,25 га. 1 км ад возера ў Пастаўскім р-не.
Тэл.: 8 021 55 55 379, 8 029 137 07 75.

■ Пакой, г. Мінск.
Тэл.: 8 029 760 37 98.

■ Плуг, баронкі, бульбазбівалка, акучнік, культыватар.
Тэл. 8 017 72 392 94.

■ Камбайн СК-5 «Ніва».
Тэл. 8 0159 13 25 59.

■ Колы гумавыя, памерам 220 см, крыху выкарыстоўваліся, матацыкл «Усход», 1992 г.в., у добрым стане, з дакументамі, танна. Воз на гумавых колах, добры, новы, цана — па дамоўленасці.
Тэл. 8 01633 4 53 59 (Ляхавіцкі р-н).

КУПЛЮ

■ Любой мадэлі «Фольксваген» альбо «Аўдзі» з 1987 па 1999 г.в., можна з дэфектамі. Разгледжу любыя варыянты.
Тэл.: 8 029 145 11 97, 8 029 771 51 78.

■ Дом пад дачу па Слуцкім ці Брэсцкім напрамку, не далей за 50 км ад Мінска. Разгледжу любыя варыянты.
Тэл.: 8 017 295 65 98, 8 029 706 04 01.

■ Дом 30—60 км ад Мінска, можна стары ці на хутары, або ўчастак.
Тэл. 8 029 357 64 51.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:

220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287 17 79.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



2	5							4
7			2				5	
	3		9					
	9				5	1	2	6
1	7	4	8				9	
					3		7	
	1				9			5
3							1	2

СУДОКУ. У квадраце з 9 на 9 клетак трэба размясціць лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным гарызантальным радку, кожным вертыкальным слупку, а таксама ў кожным малым квадраціку 3 на 3 клеткі, абмежаваным тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўторaў.

6 670 903 752 021 072 936 960 — такую колькасць варыянтаў галаваломак судоку налічылі спецыялісты. Гэта адказ на пытанне некаторых чытачоў, ці хопіць іх «на наш век», ці не пойдуць паўторы. Такія апасенні беспадстаўныя. 22-значны лік таму — гарантыя.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (7 чэрвеня). Па гарызанталі: «Дыскабол». Олаф. Стог. Сад. Гаць. Рым. Азія. Якар. Лік. Муза. Крапіва. Гай. Рота. Амур. Смак. Кактус. Акула. Пралік. Трал. Венера. Дока. Яма. Статар. Грак. Гарлач. Нота. Столь. «Мысліцель». **Па вертыкалі:** «Русалачка». Марс. Віраж. Ака. Куля. Ліга. Мангал. Аліва. Кава. Дрот. Кайра. Горн. Лось. Кенар. Лом. «Смага». Араты. Док. Час. Спас. Ярмо. Расада. Разлом. Лот. Туніка. Тэарэма. Дар. Карамель.



Віншуем дарагую, любую **Яніну Ігнацьеўну Дуда** з в. Дарагавіца Капыльскага раёна з 80-годдзем.

Жадаем мець вясёлы выгляд,
Не ведаць, дзе і што баліць,
Не хвалявацца без прычыны
І ў Бога лепшага прасіць.
Хай смехам і шчасцем поўніцца дом,
За клопат, за ласку наш нізкі паклон.

Дзеці, унукі, праўнукі.

Усміхнёмся!

Субота, у камп'ютарнай фірме працоўны дзень. Тэлефонны званок.

— Фірма «N», добрай раніцы.

Жаночы голас, шэптам:

— Алё.

— Так, я вас слухаю.

— Я ўчора ў вас камп'ютар купляла.

— І?

— Ён зламаўся, вы можаце адрамантаваць?

— Кажыце гучней, я вас не чую.

— Гучней не магу, муж пачуе — заб'е...

☺

— Мая нявеста — дурніца набітая. За тры дні да вяселля выпадкова пакінуў у яе тэлефон з незапароленай запіснай кніжкай, у якой нумары шматлікіх знаёмых дзяўчат, а яна не тое што скандалу — шуму нават не падняла!

— А ты колькі зарабляеш?

— Пяцьдзесят тысяч долараў у месяц.

— Не, яна ў цябе далёка не дурніца.

Дзіўна... чым больш правяраем, тым большы нахіл...



На конкурс апавяданняў

Генадзь Мішчук, пажарнік з вёскі Вотчына Маларыцкага раёна, калісьці прэміяльна дэбютаваў на нашым конкурсе. То былі сціплыя, хоць і сакавітыя замалёўкі-абразкі з вясковага жыцця. І сёння, прадстаўляючы яго зноў чытачам, я з прыемнасцю адзначаю, як ён набірае голас і прафесійнасць.

Віктар КАЗЬКО.

Пасля перавалу лягчэй не стала. Унізе, на раўніне, стаяла нясцерпная спёка, што выбівала з часу маршавую калону. Кіпела вада ў радыятарах перагрэтых рухавікоў баявых машын, знясіленыя людзі пакутавалі ад здзічэлага сонца і неўтаймаванай смагі. Сядзець на гарачай брані было невыносна. Яшчэ цяжэй даводзілася экіпажам.

«Не спі — замерзнеш! — капітан Зорын, камандзір роты, што сядзеў на месцы стралка-аператара галоўнай машыны, каторы раз раскуторхваў «маладога» механіка-вадзіцеля Мікалая Зарубу. Той, знясілены стомай, спёкай і смагай, засынаў за рычагамі. Манатонны гул рухавіка, няспешны рух калоны і аднастайны пустыны пейзаж, дзе воку няма за што зачапіцца, міжволі закалыхвалі яго. Векі закрываліся самі сабой, і баявая машына, страціўшы кантроль, імкнулася збочыць. У такія моманты пільны капітан Зорын адразу выпісваў «пендаля» «байцу гаршочнага перыяду». Мікалай схамянуўся, мацней сціскаў рычагі, але праз нейкі час зноў «адключаўся».

Мінула два месяцы, як пасля скарочанай «вучэбкі» Мікалай Заруба трапіў служыць у Афганістан. Гэта прызначэнне не было для яго нечаканасцю, бо з першых дзён службы ў вучэбным падраздзяленні ўсе без выключэння ведалі, куды іх рыхтуюць. Нягледзячы на ўсе намаганні, дасканала авалодаць ваеннай прафесіяй за тры месяцы вучобы было немагчыма. «Навык ёсць, а вопыт прыйдзе, «на крайняк» дапаможа салдацкая ўдача. Словам, шанц выжыць у вас ёсць», — падвёў рысу курсанцкаму навучанню прапаршчык Вакуленка.

Перад самай адпраўкай вясёлы хлопец — душа чацвёртай роты Валодзька Рыжоў — невядома дзе раздабыў дзве пляшкі гарэлкі. І нягледзячы на строгі кантроль камандзіраў і начальнікаў, ухітрыўся-такі па сталовай лыжцы «горкай» прыгасіць кожнага баявога таварыша. «Не дзеля п'янкі, — гаварыў Валодзька, частуючы сяброў, — баявое прычасце — каб помнілі адзін аднаго і жывымі-здаровымі вярнуліся дамоў».

На вайне як на вайне. Праз месяц, ідучы ў складзе пешага разведузвода на свой першы баявы выхад, Мікалай Заруба зразумеў, што такое салдацкая ўдача, пра якую талкаваў прапаршчык Вакуленка. Калі на досвітку разведчыкі выйшлі на сярэдзіну кукурузнага поля, што ўпрытык падыходзіла да кішлака, два прыстрэленыя да пазіцыі кулямёты скасілі палову хлопцаў. Юрка Зелянцоў — «дзядуля ВДВ», які ішоў у пары з Міколам, быў паранены ў пяту. Ён спачатку паваліўся на зямлю ў маладую кукурузную раллю, а потым ад нясцерпнага болю ўскочыў на калені і атрымаў чаргу ў грудзі. Юрка ўпаў побач з Мікалаем і болей не варухнуўся, падаспелая на «брані» рота капітана Зорына ўратавала Зарубу і яго ўцалелых таварышаў.

Колька чымсьці кінуўся ў вочы капітану Зорыну, бо праз пару дзён той забраў яго да сябе на месца звольненага ў запас вадзіцеля-механіка камандзірскай БМД. За рычагамі баявой машыны дэсанта Мікалай акрыяў.

Апоўдні спёка ўзмацнілася. Рэзерв вады быў амаль вычарпаны, а да базы — шлях не блізкі. Заначаваць на маршы, на некантраляванай тэрыторыі — смерці варта. Гэта разумелі ўсе, і Мікалай Заруба — не выключэнне. Ён трымаўся з апошніх сіл на «зорынскіх пендалях».

Шмат забраў учарашні штурм перавалу, калі большую частку дня машыны ўпарта лезлі ўгару, ціснучыся адна да адной, рызыкуючы зваліцца з кручы. Да таго ж адчуванне патрэбны не толькі навык, але і вопыт. Яго яўна не хапала. І капітан Зорын сам сеў за кіроўцу.

Ветрык, урываючыся ў расчынены люк, жаданай прахалоды не нёс. Салёны пот ручаём сцякаў з-пад шлемафона і выядаў вочы. Раз-пораз Мікалай выціраў твар салдацкім ручніком, які, бы губка, прагна ўсмоктваў вільгаць, а праз хвіліну зноў быў сухі і траскучы, як корч ад назапашанай солі. На радыёстанцыі старшы калоны маёр Сцяпанаў у чарговы раз падганяў адсталых і стрымліваў пярэдніх. Ад яго голасу Мікалай уздрыгваў, як ад штуршка капітана Зорына. Ды, бадай, не толькі ён. Калона імгненна рэагавала на загады маёра Сцяпанава. Ды стома брала сваё. У нейкі момант Мікалаю стала зусім невыносна, і ён падумаў, што страчвае прытомнасць. Перад вачыма паплылі руковыя кругі, стала млява, і на імгненне Мікалай зноў згубіў кантроль над баявой машынай. Тая пачала забіраць улева, але капітан Зорын быў на месцы. Ад яго штуршка міжволі прыйшлося ачуняць. Амаль падсвядома, адным рухам Мікалай выправіў машыну. Зорын, задраўшы шлемафон, нешта крычаў яму ў самае вуха, але з-за натужнага гулу рухавіка Мікалай пачуў толькі апошняе: «Яшчэ раз зеванеш — далей пойдзеш пешшу».

Неўзабаве шэрая павалока, якая ўвесь гэты час засцілала Мікалаю вочы, канчаткова рассеялася, і яго ясны позірк уважліва сачыў за дарогай і наваколлем, наколькі гэта дазваляла вузкае вадзіцельскае акенца. Часам ад асляпляльнага бляску сонца і расплаўленага ад яго промняў гарызонту Мікалай напружваў зрок, каб нічога не засталося незаўважаным. Але тое фантастычнае відовішча, што раптоўна выплыла аднекуль і закрыла ўвесь агляд, прымусіла яго засумнявацца ў рэальнасці таго, што адбываецца. Напарадзе была вада, якая іскрылася і пералівалася пад сонечнымі промнямі. Кожнай клетачкай змучанага цела Мікалай адчуў яе прахалоду.

— Камандзір, вада! Возера, пацаны!..

Засмаглыя вусны і язык не далі змогі крыкнуць на ўсю моц па ўнутранай сувязі аб тым, што ён толькі што ўбачыў. Але і таго было дастаткова, каб капітан Зорын пачуў яго. Ротны чамусьці толькі зараз угледзеў тое, чым Мікалай Заруба любаваўся ўжо з дзесятак секундаў. Прыціснуўшы рукой ларынгафоны, капітан Зорын без асаблівай мітусні і радасці звярнуўся да маёра Сцяпанава, запрасіўшы дазволу на нечарговы прыпынак. Зорын гаварыў спакойна, і Мікалай упершыню за доўгі марш пакрыўдзіўся на свайго камандзіра, якога, відаць, не турбавала ні смага, ні спёка. У эфіры нешта затрашчала, і маёр Сцяпанаў даў «добро» на запыт Зорына.

Калона, ахутаная клубамі дыму і пылу, спынілася, выцягнуўшыся на добрую пару соцень метраў. Люстраная гладзь возера шалёна вабіла да сябе праз пякельнае морыва паветра. Мікалаю захацелася рвануць да яе па гарачым пяску пустыні. Бы адчуваючы яго настрой, капітан Зорын прымусіў Мікалая суняцца:

— Стрывай, хлопча. Без фанатызму. Гэта міраж. Чуў пра такое? — і суровым позіркам ротны агледзеў увесь экіпаж. — Уся гэта экзотыка вельмі падманлівая, таму будзьце пільнымі. — І пайшоў аглядаць машыну.

— Папілі вадзіцы, — разгубленa прамармытаў нехта з экіпажа, выказаўшы агульны настрой.

Крыштальнае возера так кліва іскрылася сярэбным бляскам хваляў, што не хацелася верыць у здзеклівасць прыроднай з'явы. Недзе ў падсвядомасці жыла апошняя надзея наталіць смагу. Капітан Зорын, пакуль яго падначаленыя зачаравана глядзелі на міраж, вялізным шпрыцам, якім звычайна запампоўваюць змазку ў вузлы і агрэгаты машыны, набраў вады з закіпелага радыятара. Кіпень з іржой, пахам «салярыы» і масла ён асцярожна наліваў у невялічкі корак салдацкай біклажкі, па чарзе працягваючы яго кожнаму члену экіпажа. Корак зрабіў тры кругі... Тых тры глыткі вады, якую і вадой назваць цяжка, былі зараз даражэйшыя за любое багацце на свеце. «Баявое прычасце», — пра сябе зазначыў Мікалай, калі ў трэці раз надышла чарга змачыць вусны.

Гарачы подых пустыні крануў тропаткое палатно міражу, і возера, якое так нечакана з'явілася на гарызонце, пачало знікаць. Жаданне наталіць смагу зноў занялo ўсе думкі вайскоўцаў, а тры глыткі кіпеню толькі ўзмацнілі яго. Капітан Зорын заставаўся па-ранейшаму спакойным і ўпэўненым. Корпаючыся са шпрыцам, які ўпарта не хацеў умяшчацца ў скрынку са слясарным інструментам, ён ненарокам (а, хутчэй, наўмысна) моцна бразнуў жалезным вечкам, ад чаго хлопцы скамянеліся і нарэшце адарваліся ад відовішчнай прыроднай з'явы. У гэты самы момант прагучала каманда «Па машынах!», што жывым рэхам панеслася ў канец калоны.

Стомленыя рухавікі зноў натужна запрацавалі, а экіпажы і пяхота занялі свае месцы згодна з баявым разлікам. Батальён, сабраўшы рэшту сілаў, накіраваўся насустрач знікаючаму возеру.

Да цемры яшчэ заставаўся час...

Маларыцкі раён.

Чытайце ў наступным нумары

Нехта губляе, а нехта знаходзіць...

Часцей за ўсё людзі расстаюцца з каштоўнымі рэчамі ў месцах з хуткай дынамікай: на вакзалах, у грамадскім транспарце і таксі. На жаль, адзінага агульнагарадскога стала знаходак у Мінску няма. Куды звяртацца ў выпадку, калі вы нешта згубілі? І наколькі рэальна вярнуць страчаную рэч? На гэтыя пытанні знайшла адказы карэспандэнт газеты "Звязда".

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.38	21.40	17.02
Віцебск —	4.20	21.38	17.18
Магілёў —	4.28	21.31	17.03
Гомель —	4.34	21.18	16.44
Гродна —	4.55	21.54	16.59
Брэст —	5.05	21.45	16.40

Месяц

Першая квадра.

Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Васіля, Ігната, Іраклія, Мікіты.*

К. *Дзіяны, Малгажаты, Маргарыты, Ануфрыя, Багуміла, Генрыха, Эдгара.*

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

10 чэрвеня

988 год — 1020 гадоў таму ў Тураве пачаў княжанне Святаполк Яраполчыч, прыёмны сын вялікага князя Уладзіміра Святаславіча. Умацаваўшыся ў Тураве, Святаполк стаў рыхтаваць змову супраць Уладзіміра, аднак яна была выкрыта — у выніку сам князь і яго жонка (дачка польскага караля Баляслава I Храбрага) апынуліся ў кіеўскай турме. Пагроза вайны з Баляславам прымусіла Уладзіміра выпусціць арыштантаў, аднак у Тураў іх не пусцілі. Пасля смерці вялікага князя Уладзіміра ў 1015 годзе Святаполк заняў кіеўскі трон. Як сцвярджаецца ў «Аповесці мінулых часоў», рукамі наёмных забойцаў новы князь тут жа пазбавіўся ад сваіх канкурэнтаў на ўладу, сыноў Уладзіміра Барыса, Глеба і Святаслава, за што атрымаў прозвішча Акаянны. У 1015 годзе наўгародскі князь Яраслаў Мудры выступіў супраць Кіева і ў Бітве каля Любеча разбіў Святаполка, які вымушаны быў уцякаць да свайго цесця ў Польшчу, дзе праз некалькі гадоў і памёр.

1943 год — выйшла пастанова ЦК КП (б) Б «Аб разбурэнні чыгуначных камунікацый праціўніка шляхам «рэйкавай вайны». Партызанскія падрыўнікі адначасова ўзарвалі сотні кіламетраў чыгуначных пуцей, мастоў, пусцілі пад адхон дзесяткі эшалонаў ворага з жывой сілай і тэхнікай, якія рухаліся на ўсходні фронт.

Цытата дня:

«Добры чалавек не бывае настолькі добрым, а дрэнны — настолькі дрэнным, якімі яны лічацца».

Сэмюэл Кольрыдж (1772—1834), англійскі паэт.

Организация сдает в аренду

ТОРГОВО-ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ

в г. Молодечно (центр), 2-этажное, 1400 кв. м, охрана, стоянка, коммуникации по цене 3 евро кв. м.

Тел. 8 029 364 76 37. УНН 600414766

Выпрабавана на сабе

Абаронца ад сонца і... старонніх позіркаў

Як мы ўсе зараз, пасля не вельмі ласкавага апошняга месяца вясны, радуемся сонейку і доўгачаканай цеплыні! Але... Чалавек, як кажуць, істота недасканаленая. Асабліва калі вокны яго кватэры выходзяць на сонечны бок. У гэтым выпадку такія жаданыя на вуліцы сонечныя промні могуць ператварыць жыллё да некалькі гадзін у сапраўднае пекла і зрабіць жыццё яго насельнікаў невыносным. Мала таго, што робіцца спякотна, дык ад іх могуць выгараць шпалеры і мэбля, пакутаваць некаторыя хатнія расліны. Сонца слепіць, перашкаджае глядзець тэлевізар, працаваць за камп'ютарам. Праветрыванне і звычайныя занавескі на вокнах не заўсёды дапамагаюць выратаваць сітуацыю. Выйсце ў гэтым выпадку — жалюзі. Тым больш што яны могуць вельмі ўдала спалучацца са шторамі, якія ўжо ў вас ёсць, а, значыць, ваша кватэра не будзе нагадваць офіснае памяшканне (гэтыя стэрэатыпы для некаторых актуальныя і цяпер, хоць сучасныя матэрыялы ўжо даўно дазваляюць вырашаць практычна любыя задачы ў афармленні інтэр'еру на належным узроўні).

З ЧАГО БУДЗЕМ ВЫБІРАЦЬ?

Чым так не дагадзілі шторы, спытае нехта. Яны ствараюць у доме ўтульнасць, з'яўляюцца адным з элементаў інтэр'еру. Але менавіта жалюзі дазваляюць больш эфектыўна рэгуляваць светлавыя патокі — паваротам у той ці іншы бок ламеляў. Яны дапамагаюць схавацца ад сонечных промняў, не парушаючы вентыляцыю памяшкання, наадварот, дапамагаюць рэгуляваць паветраныя і цеплавыя патокі.

А ламелі, якія мы згадалі вышэй, гэта такія палоскі-рэйкі (з металу, пластыку, драўніны, тканіны), з якіх уласна і складаюцца жалюзі. Па іх размяшчэнні і вызначаецца тып вырабу. Яны могуць быць з розных матэрыялаў, мець тое ці іншае каляровае рашэнне, але ў цэлым усё гэта дазваляе гаварыць пра агульную функцыянальнасць жалюзі. А вось пра адрозненні і адметнасці мы сёння і пагаворым асобна. Такім чынам, што нам сёння прапаноўвае рынак?

У залежнасці ад размяшчэння ламеляў жалюзі падзяляюцца на дзве вялікія групы: гарызантальныя і вертыкальныя. Першыя падкрэсліваюць шырыню акна, другія — яго вышыню (гэтую акалічнасць таксама часта трэба браць да ўвагі).

ПА «ГАРЫЗОНТУ»...

Гарызантальныя жалюзі прынята лічыць класічнымі. Дарэчы, менавіта ад гэтага тыпу і пайшла ў свой час пагалоска, што іх можна выкарыстоўваць толькі ў нейкіх офісных памяшканнях. Самы распаўсюджаны варыянт — з алюмінію. Можна мець некалькі дзесяткаў колераў, самі ж ламелі вырабляюцца звычайна шырынёй 16 ці 25 міліметраў. Лічыцца, што для шырокіх вокнаў больш падыходзіць другі варыянт, для вузкіх — першы. Хоць, зразумела, усё гэта даволі суб'ектыўна. Больш важным, як здаецца, з'яўляецца памер па шырыні саміх жалюзі, які звычайна супадае са створкамі акна: чым яны вузейшыя (створкі), тым адпаведна больш нераўнамерна пры карыстанні могуць размяшчацца ламелі жалюзі на іх. Алюміній — самы танны матэрыял, асабліва меншай шырыні і непафарбаваны ў колер.

Жалюзі з драўніны лічацца больш экалагічнымі, але яны і больш дарагія. Непажадана вешаць іх у памяшканнях або з высокай вільготнасцю, або на вельмі сонечных участках, бо гэта аднолькава шкодна для іх.

Пластык па экалагічнасці, безумоўна, прайграе, праўда, даглядаць яго лягчэй, чым дрэва (прынамсі, не баіцца вады), але можа выгараць на сонцы.

...ЦІ ПА «ВЕРТЫКАЛІ»?

Гэты тып жалюзі, як правіла, выкарыстоўваецца з выкарыстаннем розных відаў тканіны. За кошт гэтага вертыкальныя «абаронцы» жытла ад сонца і старонніх поглядаў не толькі выконваюць сваю прамую функцыю, але і з'яўляюцца (ці замяняюць уласна традыцыйныя шторы) элементам інтэр'еру. Тканіна апрацоўваецца спецыяльнымі рэчывамі, якія абараняюць яе ад пылу, вільгаці. Многія, дарэчы, апошнім часам пачалі выкарыстоўваць такі тып жалюзі нават на балконах.

Кіраванне простае — ламелі паварочваюцца вертыкальна вакол восі, адкрываюцца ж ссоўваннем складзеных палосак або ад краю да краю, або ад цэнтра да краёў. Лічыцца, што менавіта такі механізм патрабуе меншых намаганняў, адпаведна, самі вертыкальныя жалюзі служаць больш, чым гарызантальныя, ды і карыстацца імі больш зручна.

А ШТО Ў РУЛОНЕ?

Рулонныя жалюзі або рольшторы з'явіліся ў нас крыху пазней, але зараз яны не менш распаўсюджаныя, чым папярэднія тыпы. Праўда, таннымі іх не назавеш, асабліва калі пры вырабе выкарыстоўваецца дарагая тканіна.

Як ужо зразумела з назвы, гэта — згорнутыя ў рулон шторы, якія (пры класічным кіраванні з дапамогай ланцужка) «паўзуць» уверх уніз на спецыяльных накіроўваючых, што замацаваны па баках акна вертыкальна. Як правіла, выкарыстоўваюцца не столькі па прамым прызначэнні, колькі як элемент інтэр'еру, дэкору. На гэта «працуе» і нанясенне на тканіну адмысловых малюнкаў, і сама фактура тканіны.

Займаюць мала месца, іх можна выкарыстаць там, дзе па розных прычынах павесіць гарызантальныя ці вертыкальныя жалюзі не атрымаецца. Не пажадана выкарыстоўваць у памяшканнях кшталту кухні — давядзецца часта адмываць ад пылу і тлушчу, а дарагія тканіны (дарэчы, можа выкарыстоўвацца і матэрыял кшталту бамбуку, ратангу і інш.) гэтага не любяць.

ВЫБРАЛІ? ЗАКАЗВАЕМ...

Самы просты варыянт — набраць нумар з рэкламнай аб'явы. Калі вы ведаеце, чаго хочаце — калі ласка. Але мы парайлі б пад'ехаць на некалькі фірмаў, на будаўнічы рынак, бо цалкам зманціраваныя на ўзоры акна жалюзі даюць большае ўяўленне, чым малавыразныя кавалачкі ламеляў у руках абмершчыкаў (апошнія, як правіла, выязджаюць бясплатна). У ідэале, калі гаварыць пра пластыкавыя вокны, жалюзі лепш заказваць на той жа фірме, якая ўстанаўлівала вам і ПВХ, профілі (з драўлянымі рамамі значна радзей — іх не так баяцца пашкодзіць).

Не выключана, што перад вамі будуць «сыпаць» назвамі краінвытворцаў, маўляў, жалюзі з Ізраіля, Чэхіі або Латвіі. Насамрэч, яны могуць быць польскімі, або ламелі расійскімі, механізм шведскім і г.д. Усё залежыць ад добрасумленнасці фірмы і... вашага жадання: бярыце, што падабаецца па тыпу, колеры, механізме кіравання (хоць да сапраўднага спецыяліста часам варта і прыслухацца). Сярэдні тэрмін выканання заказу — каля двух тыдняў. Сам мантаж жалюзі на адно акно займае хвілін 15—20. Шуму і пылу амаль няма, калі на вокнах вісяць шторы, здымаць іх не заўсёды патрэбна.

Пра цэны сказаць нешта цяжка, бо ў залежнасці ад памеру выбранага тыпу жалюзі і інш. яны вылічваюцца па спецыяльнай методыцы на кожнае канкрэтнае акно (ды і цэны ў розных фірмаў могуць некалькі адрознівацца).

ХТО КАГО ДАГЛЯДАЕ?

Зразумела, аконныя «абаронцы» — нас. Але час ад часу і мы павінны ахвяраваць часам для навядзення чысціні і парадку. Працей за ўсё даглядаць алюмініевыя жалюзі: можна пыласосам, у «цяжкіх» выпадках яны не баяцца мокрай анучкі з мыйным сродкам. Таксама можна пыласосіць і праціраць пластык. Дрэва патрабуе толькі сухой чысткі. Найбольшых намаганняў патрабуюць жалюзі з тканіны: кожную палоску з вертыкальных трэба зняць, акруціць і пакласці на час у ваду з мыйным сродкам (роль-шторы, зразумела, кладуць усім рулонам, калі матэрыял-тканіна дазваляе гэта рабіць). Потым прапаласкаць і яшчэ крыху вільготнымі павесіць назад.

У гарызантальных жалюзі за сезон пад уздзеяннем сонечных промняў можа крыху «пацягнуцца» лёска, на якую нанізаны ламелі. Зняўшы накрыўкі мацавання жалюзі яе трэба крыху нацягнуць. Дарэчы, гарантыя на жалюзі звычайна складае год. У добрай фірмы не павінна быць і праблем з паслягарантыйным абслугоўваннем.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 32.856 Індэкс 63850. Зак. № 3046. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12